

# 1920-1940



# МІНСК
## НЕЗНАЁМЫ
## 1920-1940

# UNFAMILIAR MINSK 1920-1940

AUTHOR-COMPILER
ILYA KURKOV

Minsk "Uradjay" 2002

# МІНСК
## незнаёмы
# 1920-1940

АЎТАР-УКЛАДАЛЬНІК
ІЛЬЯ КУРКОЎ

Мінск "Ураджай" 2002

*Рэдакцыйны савет:*
*Я. В. МАЛАШЭВІЧ (старшыня), В. Д. ЗАЙЦАЎ, У. А. ГЕРАСІМОВІЧ,*
*А. М. ХІЛЬКЕВІЧ, Ю. А. ПАЎЛЮКЕВІЧ*

Аўтар уступнага артыкула і подпісаў пад ілюстрацыямі *І. М. КУРКОЎ*
Укладальнік *І. М. КУРКОЎ*
Мастак *Ю. А. ТАРЭЕЎ*

**ISBN 985-04-0535-X**

© Укладанне і тэкст Куркоў І. М., 2002
© Мастацкае афармленне Тарэеў Ю. А., 2002
© Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Ураджай"», 2002

# НАТАТКІ ПРА БЫЛУЮ РЭЧАІСНАСЦЬ

Не аднойчы мянялася аблічча Мінска за яго амаль тысячагадовую гісторыю, але, напэўна, найбольш моцна — за апошнія шэсць дзесяцігоддзяў. У гэты час ушчэнт разбураная і паўстаўшая з попелу сталіца Беларусі шмат у чым страціла свой гістарычны твар. Што ж рабіць тым, хто сёння прагне акунуцца ў былое? Патрэбен добры праваднік кожнаму, хто жадае няспешна прайсціся па вузкіх вуліцах старога горада, «каб адшукаць сляды даўно мінулых дзён», забыцца на час пра ўсе клопаты, удыхнуць непаўторны водар іншых эпох.

Было б вельмі добра, каб гід быў гісторыкам, архітэктарам, лінгвістам, этнографам, культуролагам, літаратарам, мастаком, філосафам, а таксама нядрэнным прамоўцам. А як інакш стварыць эфект прысутнасці ў мінулым? Зрэшты, для тых, хто не мае намеру забірацца ў глыбіню стагоддзяў вельмі далёка, выхад ёсць больш просты — фатаграфія.

Мінск дарэвалюцыйны знаёмы даволі добра сучаснаму «назіральніку». Апублікавана шмат паштовак з краявідамі вуліц, нават назвы іх гучаць як нешта звычнае: «Прайду па Губернатарскай, звярну на Магазінную...» Здавалася б, справа простая: узяць здымак, трохі фантазіі — і вось ужо бачыш цераз фотааб'ектыў, як адчыняюцца дзверы мінулага. Але праз некалькі крокаў разумееш, што лёгкай прагулкі не атрымліваецца. Паступова збіваецца фокус, карцінка робіцца ўсё менш выразнай, а на падыходзе да 1920-х гадоў амаль зусім зліваецца ў белую пляму.

Сапраўды, зніклі рысорныя экіпажы, дамы ў крыналінах, гарадавыя, шыкоўны грандатэль «Еўропа», няма больш і празрыстых аблокаў, што стараннем фотамайстроў плылі амаль на кожнай мінскай паштоўцы.

Як ні дзіўна, сёння у грамадскай свядомасці няма адпаведных яркіх стэрэатыпаў наступнай эпохі —станаўлення савецкага Мінска. Засталося са школы нешта агульнае: «НЭП», «пяцігодка», «індустрыялізацыя», хтосьці прыгадае, магчыма, «жыллёвы крызіс». Але ў якім асяроддзі ўсё гэта адбывалася, якія дэкарацыі будаваліся для новай сацыяльнай драмы?

Адказ можна знайсці на фотаздымках 1920—30-х гадоў. На жаль, тады мясцовым аматарам святлапісу вельмі не шанцавала. Па ўспамінах гарадскога старажыла, вядомага ўрача і краязнаўцы В. І. Каляды, фатаграфаваць будынкі, вуліцы, асабліва ў цэнтры, было небяспечна. Уся справа ў асаблівым статусе беларускай сталіцы, выключным нават па маштабах СССР.

Вось радкі з часопіса «Чырвоная Беларусь» за 1932 год:

«Менск стаіць на краі новага свету. Там, за Тучынкай, за тры дзесяткі кіламетраў ад гораду пачынаецца капіталістычная Эўропа. Менск стаіць на рубяжы двух светаў, двух сыстэм. І яго бурны рост з'яўляецца грозным папярэджаннем імперыялістычным клікам і іх обэршэльмам, яркім і светлым прыкладам для людзей працы. Менск расце, каб быць яшчэ больш надзейным і непарушным фарпостам рэвалюцыі».

Зразумела, што кожны аб'ект у такіх абставінах лічыўся «стратэгічным». Як вынік, здымкаў міжваеннага Мінска 1920—40-х гадоў захавалася няшмат. А шкада, паколькі гэтыя два дзесяцігоддзі — унікальная старонка гарадской гісторыі. За параўнальна кароткі тэрмін у старыя «губернскія мехі» да краёў паспелі ўліць новае «сталічнае віно». Мінск набыў новы твар.

Вуліцы, распланаваныя яшчэ ў пачатку XIX стагоддзя, нечакана рабіліся важнымі транспартнымі артэрыямі, усё далей і далей адсоўвалася гарадская мяжа... Але галоўнае — людзі. Натоўп на тратуарах таксама мяняўся — з'явіліся новыя персанажы: студэнты, прамысловыя рабочыя, пагранічнікі, наогул, шмат вайскоўцаў. Дагэтуль канцэртны зал Дома афіцэраў — адзін з лепшых у Мінску. Вось яна — сувязь часоў, прывітанне з былога.

Прыклад далёка не апошні, але усе сцяжынкі ў мінулае нам не абегчы. Урэшце, тэму «Мінск міжваенны» асвятліць досыць грунтоўна немагчыма не толькі ў адной, а і ў дзесятку

прадмоў. Таму што пісаць пра гэта — тое ж, што пісаць «пра жыццё наогул». За дваццаць гадоў колькі соцень тысяч лёсаў перакрыжаваліся ў горадзе! А яшчэ культурнае жыццё, палітычнае, навука, рэлігія, народная асвета, медыцына, прамысловасць, будаўніцтва, гандаль, спорт, транспарт, камунікацыі сувязі, дзейнасць вайскоўцаў, органаў унутраных спраў... Усе цікавыя тэмы нават пералічыць цяжка, і кожная варта самастойнага сур'ёзнага даследавання. Якое выйсце?

Па першае, трэба вызначыць мэту гэтай кнігі: аднавіць, узняць з небыцця па магчымасці суцэльны візуальны вобраз Мінска 1920—30-х гадоў — горада, які большасць з сённяшніх мінчан ніколі не бачылі. Здымкі гавораць самі за сябе. Дадаць да іх застаецца нататкі, у якіх мінулае, як і на старых фатаграфіях, іграе сваю першапачатковую ролю — адзінага і непаўторнага жыцця. З дапамогай архіўных дакументаў і газетных выразак можна паспрабаваць дасягнуць «стэрэаэфекту» на некаторых здымках, перадаць непаўторны каларыт эпохі, вызначыць малавядомыя факты.

Вернемся, напрыклад, да Дома Чырвонай Арміі, які быў пабудаваны ў 1936 годзе. Першы ў Беларусі басейн, абсталяваны па еўрапейскіх стандартах, знаходзіўся менавіта ў ім. А пачалася яго гісторыя з былой гасцініцы «Парыж», што стаяла насупраць, цераз сквер. У гэты будынак Дом Чырвонай Арміі засяліўся яшчэ ў верасні 1924 года.

Уладкоўваліся і іншыя культурныя ўстановы. Так, на месяц раней, у жніўні 24-га, прэзідыум Мінакрыспалкома пастанавіў перадаць памяшканне былога Інтымнага тэатра па Нова-Маскоўскай вуліцы для размяшчэння ў ім клуба транспартных і камунальных служачых.

Часы былі цікавыя. Набіраў абароты НЭП, каб захлынуцца праз некалькі год. У скверы каля гарадскога тэатра (сёння Купалаўскі тэатр) штодзень збіралася самая разнашэрсная публіка. Ці, калі быць дакладным, — «на скверы». Менавіта так казалі ў Мінску, таму, відаць, што ўсе дарогі туды ішлі ўгору.

Аднойчы, а дакладней, увечары 11 жніўня 1922 года, па цяністых дарожках каля фантана праходжваўся рослы дужы хлопец — вочы з хітрынкай па баках глядзяць уважліва. Вось усміхнуўся нечаму, адшукаў вольнае месца на лаўцы, сеў і застрачыў у блакнот хутка. Пісаў ён наступнае:

НА МЕНСКІМ «СКВЕРЫ»

*Хто гуляў на Менскім скверы,*
*Ці мо блізка хаця йшоў,*
*Той без ліку і без меры*
*Мог там бачыць гультаёў, —*

*Труцца усе, як рыба у нераст,*
*Аб чужых і аб сваіх...*
*Давялося нек і мне раз*
*Досьць нагледзецца на іх.*

*Там усеўся я пад дрэвам*
*(Не ахвотнік вандраваць)*
*І направа, і налева*
*Стаў па «скверы» разглядаць.*

*Вось пад руку на буксіры*
*Нэпман нэпманку вядзе,*
*Пра гешэфты нэпман шчыра,*
*Пра чырвонцы ёй гудзе.*

*...Вось дзяцей сабралась куча,*
*Крык паднялі, як гракі.*
*Вабяць хлопцаў вось, ідучы,*
*Ужо «начныя матылькі».*

*Пасядзеў я з поўгадзіны,*
*Але болей-то не мог:*

*Грак нацэліўся з асіны*
*Мне на шапку, каб ён здох!*

*З той пары (кажу я верна,*
*Ты, чытач, хоць вер не вер),*
*Аж вантробы з мяне верне,*
*Як уздумаю пра «сквер».*

Прозвішча вясёлага хлопца было — Атраховіч. У хуткім часе верш з'явіўся ў газеце «Савецкая Беларусь», дзе аўтара больш ведалі як Кандрата Крапіву — падаючага надзеі маладога сатырыка.

Мінчане могуць ганарыцца — будучы народны пісьменнік і акадэмік адточваў пяро на матэрыяле іх горада. Дарэчы, праз два дні наш назіральнік апынуўся з тым жа блакнотам на трэку (каля сучаснага стадыёна ў парку імя Горкага). У выніку новая публікацыя.

ШТО Я БАЧЫЎ НА «ТРЭКУ»

*Раскажу вам прастарэку,*
*Як я ўчора быў на «трэку»,*
*Нават грошы заплаціў —*
*Так бы НЭП і не пусціў.*

*Давялося мне там бачыць,*
*У мяшках як людзі скачуць...*
*Нейкі хлопчык, як смарчок,*
*Перыў палкаю гаршчок.*

*Завязалі яму вочы —*
*Стала цёмна, як уночы —*
*Пакруцілі разоў пяць,*
*Потым стаў ён пападаць...*

*Больш нічога я не бачыў,*
*Дык сягоння чуць не плачу:*
*Ну, за што, каб хто спытаў,*
*Я «лімон» дарэмна даў?..*

Роўна восемдзесят гадоў мінула, а ці змянілася што прынцыпова ў забаўляльнай індустрыі? Лупяць у боўлінг, скачуць на «тарзанцы» — сутнасць тая ж. Ці дачакаемся новага Крапіву?

А вось гісторыя яшчэ адных класічных вершаў — сапраўдная трагедыя. Звычайна напярэдадні рэлігійных святаў (Пасха, Каляды) камсамольцы рабілі «антысвяты». Такі карнавал арганізавалі ўвесну 1923 года члены КСМ Мінскага чыгуначнага дэпо. Наперадзе шэсця крочыў сакратар камсамольскай ячэйкі дэпо Мікола Гладкі, быў апрануты ў расу, на галаве парык — ільняная кудзель, замест свечкі ў руцэ — смаляны факел. Нечакана кудзель загарэлася. Выратаваць не паспелі, камсамолец сканаў у бальніцы. Па ўсёй Беларусі хутка распаўсюдзіліся чуткі аб тым, як «Бог пакараў антыхрыста».

У адказ меры былі прыняты сапраўды надзвычайныя. Рэдактар мінскай газеты для моладзі «Красная смена» накіраваўся ў Маскву да паэта Уладзіміра Маякоўскага. Той, відаць, прасякнуўся тэмай. 12 красавіка новы верш Маякоўскага «Не для нас поповские праздники» быў упершыню апублікаваны ў Мінску — у «Красной смене»:

*... Что толку справлять рождество?*
*Ёлка —*
*дурням только.*
*Поставят елкин ствол*
*И топочут вокруг польки.*

*... Чем кадилами вить кольца,*
*богов небывших чествуя,*
*мы*
*в рождестве комсомольца*
*повели безбожные шествия.*

Потым пралетарскі паэт № 1 двойчы выступаў у Мінску (1925, 1927 гг.). Залы былі перапоўнены.

Увогуле, на адсутнасць эфектных відовішчаў скардзіцца мінчанам было нельга. У 1923 годзе па ўсёй Беларусі праводзілася акцыя «Чырвоны самалёт» — збіраліся ахвяраванні на будаўніцтва савецкага паветранага флоту. Мэта была важнай, таму і рэклама айчыннай авіяцыі праводзілася маштабна.

Упершыню палёты на аэраплане большасць гараджан убачыла яшчэ ў 1911 годзе. 24 і 25 мая дэманстраваў сваё майстэрства над Камароўкай легендарны авіятар С. І. Утачкін.

Прайшо дванаццаць гадоў. У святочныя дні ў небе над трэкам кожны раз робяцца жудасныя рэчы! Механічная птушка куляецца цераз сябе, нібы ў цырку, уваходзіць у піке, потым выраўноўваецца... Гонар бачыцца на тварах — у мінчан з'явіўся «свой Утачкін», так ласкава велічалі героя грамадзянскай вайны, чырвонага камандзіра, пілота-аса В. М. Зярнова. Пры ўсіх здольнасцях гэты чалавек, нібы просты выкладчык, чытаў публічныя лекцыі па гісторыі авіяцыі ў клубе імя К. Маркса (былы Дваранскі сход, сёння прыкладна на гэтым месцы Інтэрнэт-клуб па вул. Энгельса). Мясцовая газета неяк прагаварылася, што «В. Зярноў скончыў вышэйшую школу пілатажу ў Англіі, у Оксфардзе». Гэта яшчэ больш узняла рамантычны арэол лектара, прадстаўніцы прыгожага полу загадзя займалі лепшыя месцы, з вялікай увагай сачылі за кожным рухам дакладчыка, старанна канспектавалі ў сшыткі.

Здавалася б, здзівіць гараджан ужо немагчыма, але здолелі! 20 ліпеня 1923 года стала вядома аб палётах над трэкам эскадрыллі з 25 самалётаў, якую вёў сам Сямён Корф — камандуючы паветраным флотам Заходняга фронту.

І, нарэшце, апагей! У сераду 25 ліпеня 1923 года ў Мінску адбыўся Дзень авіяцыі. Самалёт «Савецкая Беларусь», пабудаваны на ахвяраванні працоўных рэспублікі, быў перададзены Чырвонай Арміі. У прамовах асабліва падкрэслівалася, што гэта першы самалёт у свеце, які мае на крылах надпісы на беларускай мове.

Адзначым, што ў паступовы працэс станаўлення беларускай сталіцы ўсё больш актыўна ўцягваліся ўскраіны. Недахопы крытыкавала прэса.

З газеты «Савецкая Беларусь» ад 14 красавіка 1923 года: «...Самая мнагалюдная ўскраіна Менску — Серабранка — да гэтых часоў амаль што зусім не прасунулася наперад у культурна-палітычным напрамку. Ужо больш за год існуе Серабранскі раённы клуб, але толькі існуе, бо той працы, якую ён павінен весці, ён не вядзе. Вядзецца праца выключна тэатральная, дый то не мясцовымі сіламі, а дзякуючы Другой беларускай трупе. Ні дыспутаў, ні лекцыяў клуб не мог наладзіць. І гібее ў цемры раён, шчыльна заселены выключна пралетарскім элементам».

16 чэрвеня 1923 года ў Серабранскім клубе адбыўся бенефіс кіраўніка трупы Уладзіслава Галубка — была пастаўлена яго п'еса, драма ў пяці актах «Блуд». Сюжэт пераносіў гледача ў пачатак XIX стагоддзя: пан-прыгнятальнік гвалтуе сваіх прыгонных сялянак. Процістаіць пану селянін-паўстанец, рэвалюцыянер-самародак, які ў выніку карае нелюдзя-эксплуататара за ўсе злачынствы.

З рэцэнзіі бачна, што «...народу было ў тры разы больш, чым змяшчае будынак клуба, і шмат жадаючых пабачыць п'есу змушаны былі вяртацца назад. Галубка віталі артысты трупы і студэнты Сельскагаспадарчага інстытута. Ад серабранскага жыхарства былі паднесены кветкі».

З 1926 года калектыву У. Галубка была афіцыйна нададзена назва «Беларускі дзяржаўны вандроўны тэатр». Адна з шматлікіх заслуг яго ў тым, што на пачатку 1920-х менавіта гэтыя акцёры ўпершыню пачалі размаўляць з серабранскімі і ляхаўскімі рабочымі па-беларуску.

З вандровак, дарэчы, пачала творчы шлях першая заслужаная артыстка БССР, ураджэнка Мінска Ірма Яўнзем. У галодным 1921-м яна, як і шмат гараджан, хадзіла па навакольных вёсках, спрабавала мяняць рэчы на ежу. Але хутка выпускніца кансерваторыі пачула адну народную песню, другую, пачала запісваць ноты, словы, потым яшчэ, яшчэ... Хобі ператварылася ў сур'ёзную прафесію — артыстка адна рабіла працу цэлай установы: знаходзіла народныя песні, запісвала, апрацоўвала, выконвала, рыхтавала да публікацыі. Першая з савецкіх артыстаў, у 1926 годзе, яна зрабіла персанальны замежны гастрольны тур. У яе выкананні беларускую песню ўпершыню пачулі члены сям'і імператара Японіі. У 1924—40-х гадах шмат разоў пела зорка нашай краіны І.П.Яўнзем на самых розных пляцоўках роднага Мінска, ад Дома Чырвонай Арміі да рабочых клубаў.

Шмат вуліц і завулкаў горада захоўвалі да самага чэрвеня 1941-га памяць аб сваіх знакамітых жыхарах, як, напрыклад, Нова-Каломенскі завулак (у раёне сучаснай вул. Свярдлова), дзе прайшло дзяцінства Ірмы Яўнзем. Пасля вызвалення Мінска тут на месцы ўтульных дамоў, драўляных тратуараў, кветнікоў засталася ўшчэнт выпаленая пустка.

Некаторым вуліцам больш пашанцавала. Напрыклад, ціхая Правіянцкая (зараз вул. Захарава) да вайны была больш падобная на вясковую. Цікавы факт: у 1920-я гады тут, удалечыні ад мітуслівага цэнтра, жылі Янка Купала, Змітрок Бядуля, Ларыса Александроўская, кампазітар Ісаак Любан (хто зараз не памятае яго шырока вядомую песню на словы Адама Русака «Бывайце здаровы, жывіце багата»), камандзір 39-га кавалерыйскага палка, у далейшым славуты палкаводзец Георгій Жукаў. Кожную нядзелю сяляне навакольных вёсак везлі па Правіянцкай на Троіцкі кірмаш (зараз на яго месцы Тэатр оперы і балета) вяршкі, масла, сала, садавіну, гародніну і шмат іншага. Каля ўласных дамоў абоз сустракалі гаспадыні, і вуліца на час пераўтваралася ў імправізаваны кірмаш. Увосень сяляне прывозілі дровы.

Цяжка развітвацца са старымі звычкамі. У кастрычніку 1935 года «Звязда» паведаміла, што ў сувязі з разгортваннем будаўніцтва новага тэатра Мінскі гарсавет пачаў перанос Троіцкага рынка з плошчы Парыжскай Камуны на Юбілейную плошчу і на былы Конскі рынак на Чырвонай вуліцы.

Захаваліся ўспаміны пра галоўны кірмаш Мінска 1920—30-х гадоў карэннай жыхаркі Старажоўскай вуліцы Валянціны Бугаенка: «Перад базарнымі днямі на заезны двор з'язджаліся сяляне з вёсак, што размяшчаліся ўздоўж Старавіленскага, Даўгінаўскага і Смаргонскага трактаў. Яны выпрагалі коней, пілі чай, гулялі ў карты, клаліся спаць, каб пад раніцу ехаць на Троіцкі — трэба было заняць лепшыя месцы, тады добра прадаш тавар. Таму ў гэтыя дні ўжо з трох гадзін ночы ўся Старажоўка грукатала коламі сялянскіх падвод. Караван ішоў бясконцым патокам амаль да поўдня.

Трохі пазней на Траецкую гару спяшаліся мінчане — за мукой, крупой, бульбай, дровамі, саломай... за льнянымі тканінамі — «кужэльнымі» і «зрэбнымі». А цукар, соль, селядзец, запалкі, розную галантарэю, газу, мыла куплялі ў магазінах: «У Кантаровіча», насупраць піўзавода, і «У Грынберга», насупраць Старажоўскіх могілак».

Далей — успаміны пра гэтыя вядомыя могілкі. Сёння іх ужо няма (гл. фота ў кнізе). «...У нашым двары было шмат дзяцей, мы паспявалі ўсюды. Шмат часу праводзілі на могілках — збівалі з дрэў каштаны. А вартаўнік — Крыкун, як мы яго называлі, ганяў нас. Праз могілкі мы хадзілі на рэчку купацца. Спыняліся каля самых прыгожых, тых, што з фатаграфіямі, помнікаў. Чыталі надпісы. А ўвесну збіралі незабудкі на нізкім беразе сажалкі, якая знаходзілася ў паўночным кутку могілак. Пра яе існавала легенда. Перад нашэсцем напалеонаўскіх войскаў святары з храма Св. Марыі Магдаліны схавалі царкоўныя каштоўнасці тут, каб не захапілі французы. Таму нашы хлопцы, калі лавілі карасей кашолкамі, спадзяваліся падняць са дна скарб».

А якія скарбы шукалі дарослыя мінчане? Цікава, што з прыходам савецкай улады «прыватнаўласніцкія інстынкты» жыхароў горада зусім не паменшыліся. Гэта было адной з прычын пашырэння гарадскіх межаў. Вось як выказаўся па набалеламу пытанню 5 чэрвеня 1923 года загадчык зямельнага аддзела гарсавета:

«Зямельнае пытанне ў Менскай гарадской гаспадарцы перад рэвалюцыяй мела меншае значэнне, чым цяпер. У 1912 годзе даходу ад розных падаткаў і збораў было 228 679 руб., а у 1922 — 138 915 руб.; даходу ж ад гарадской зямлі было ў 1912 годзе — 17 281 руб. (12%), а у 1922 — 58 629 руб. (43%).

Пры ранейшай эканамічнай палітыцы прыкмячалася вялікая цяга да зямлі. Кожны грамадзянін стараўся атрымаць і апрацаваць хоць невялікі кавалак зямлі. Можна было думаць, што НЭП паложыць гэтаму канец, што ў звязку з рашэннем пытання аб харчах будзе менш ахвотнікаў на зямлю.

Аднак выйшла інакш. Розныя прамысловыя гародныя гаспадаркі, рабочыя таварыствы, рабочыя і іншыя грамадзяне звяртаюцца з просьбамі да зямельнага аддзела аб адводзе ім зямлі. Гэтых заяў так шмат, што зямельны аддзел не можа іх усе здаволіць, і з-за няхваткі зямлі былі выпадкі засявання часткі акраінных вуліц.

Зямля патрэбна гораду яшчэ пад аэрадром, лагеры, стрэльбішча, пашу. Па падліку 1922 года, у Менску маецца 3000 галоў рагатай жывёлы, 1500 коней і 2000 коз. Такім чынам зразумела, што пытанне аб пашырэнні межаў гораду было насьпеўным і, развязаўшы яго, ЦВК Беларусі пайшоў насустрач вымогам жыцця»..

Своеасаблівым каментарыем да апошняй лічбы з'яўляецца «крык душы» з газеты «Савецкая Беларусь» ад 16 снежня 1922 года: «Гіне хараство прыроды! Адна з вуліц Менску (Шырокая) высаджана дрэвамі — каштанамі, якія даюць хараство вуліцы ўлетку. І вось чамусь гэтыя дрэвы асуджаны сёлета, відаць, на зьнішчэньне. Козы мясцовых жыхароў, ходзячы ўвосень і зімой самапасам, аб'ядаюць кару, і гэткім чынам прыгажосць прыроды гіне. Варта, каб камхоз звярнуў на гэта належную ўвагу».

Ці не першая гэта з мінскіх публікацый на экалагічную тэму?

Наогул, хатняя жывёла з'яўлялася важным фактарам у жыцці сталіцы. Засталіся ў гісторыі застэнаграфаваныя словы намесніка Старшыні Саўнаркома БССР У. Р. Ванеева, які, дарэчы, займаў перад тым пасаду старшыні Мінскага гарвыканкама. У 1940 годзе на спецыяльнай нарадзе (назіраліся часовыя цяжкасці з продажам хлеба) ён паведаміў: «В Минске 12.048 голов свиней. Рогатого скота мы имеет 1135 голов. Овец, лошадей — тысячи две с половиной. Вообще, все это животные, они все хотят кушать. Что для них можно купить в Минске кроме хлеба? Ничего. Отсюда и понятно, что идет и мамаша, и папаша, и дочка, и сын — и все берут хлеб».

Шмат праблем даводзілася вырашаць гарадскому кіраўніцтву ў разглядаемы перыяд, а часцей за ўсё, напэўна, — жыллёвае пытанне.

Ужо 22 студзеня 1918 года пры Мінскім Савеце рабочых і салдацкіх дэпутатаў быў створан жыллёвы аддзел. Пад яго кіраўніцтвам у горадзе праводзілася нацыяналізацыя дамоў, якія належылі «прадстаўнікам пануючых класаў», царкве, уладальнікам прыватных гасцініц. Але і дробным уласнікам жылося не салодка. Саўнарком БССР 25 сакавіка 1922 года забараніў домаўласнікам разбіраць без дазволу ўлады дамы, якія прыйшлі ў непрыгоднасць. Гаржыладдзел меў законныя падставы для канфіскацыі ва ўласнікаў прыватных дамоў да 30% жыллёвай плошчы, каб размеркаваць яе па ардэрах. На працягу 1923 года ў Мінску было выдадзена 2600 ардэроў, з іх 75% — членам прафсаюзаў.

Крызіс паглыбляўся тым, што ў Мінску, як у сталіцы, бесперапынна ўзрастала колькасць усялякіх устаноў. Як бачна з даведкі, накіраванай акруговым выканкамам у ЦВК БССР, тут на 1 лістапада 1924 года было занята будынкаў: культурна-асветніцкімі ўстановамі — 79, клубамі і тэатрамі — 42, лекавымі ўстановамі — 21, прадпрыемствамі — 89, а наогул, разам з вайсковымі ўстановамі, было занята 33% усёй камунальнай жыллёвай плошчы. Часта не было нават куды засяліць адказных працаўнікоў, што вылучаліся ў Мінск на кіруючыя пасады. «Вялікія людзі» па некалькі месяцаў мыкаліся па выпадковых камуналках.

Дарэчы, для іх сітуацыя значна палепшылася ў студзені 1925 года, калі пасля працяглага рамонту нарэшце пачала функцыянаваць Цэнтральная гасцініца камгаса — знакамітая былая «Еўропа». Гэты шасьціпавярховы цуд камфартабельнасці паступова ператварыўся ў звычайны інтэрнат. Пастаяльцы «акопваліся» і не выязджалі па некалькі год.

У 20-я гады шырока праходзіла кампанія па муніцыпалізацыі прыватных будынкаў, галоўным чынам шматкватэрных. Лёс былых уласнікаў нікога не цікавіў. Здараліся і памылкі, калі ў эксплуататары залічвалі не тых. Вось тыповы прыклад: дом па вул. Інтэрнацыянальнай належыў сям'і дантыста Валкоміча, які памёр у 1921 годзе ад тыфу пры выкананні службовых абавязкаў. Засталіся ўдава і чацьвёра малых дзяцей. Той, хто пазбавіў іх уласнасці, нават не прытрымліваўся неабходных па закону фармальнасцей. Усё адбылося нечакана, «па хадайніцтву акруговага іспалкома». Жанчына пайшла шукаць праўду, але, што адметна, прасіла ні аб вяртанні дома, а толькі аб дазволе застацца ў сваёй невялічкай кватэрцы. Але і гэта было нялёгка.

Таму і захоўваецца дадзеная «кватэрная справа» ў адным з найбольш каштоўных фондаў Нацыянальнага архіва РБ, што ёй асабіста займаліся ў 1926 годзе знакамітыя дзяржаўныя дзеячы — Старшыня СНК БССР Я. А. Адамовіч і нарком унутраных спраў БССР А. І. Хацкевіч. Заяву Раісы Валкоміч упрыгожваюць іх рознакаляровыя аўтографы. Сумесная дзейнасць двух міністраў мела станоўчы вынік: жыллё сям'і пакінулі.

Горшы лёс напаткаў М. Ф. Глухоўскага, якому належыў дом № 1 па вуліцы К. Маркса. У хадайніцтве было адмоўлена. Гэты будынак можна пабачыць на фота сярэдзіны 1920-х, зробленым з вуліцы Свярдлоўскай, ён першы злева.

Дадзеная практыка не спынілася і ў 1930-я гады. Вельмі цікавае паведамленне бачым у «Звяздзе» ад 26 жніўня 1936 года: «36 прыватных домаўладанняў муніцыпалізаваў гарадскі савет за безгаспадарчасць іх утрымання». Універсальная фармулёўка! Хто і калі распрацоўваў дакладныя крытэрыі «безгаспадарчасці»?

А зараз — лічбы. Асноўная стаўка кватэрнай платы для Мінка ў 1929 годзе ўстанаўлівалася ў 37 кап. за 1 м$^2$ жылой плошчы ў месяц. Для рабочых і служачых з зарплатай ніжэй 100 руб. у месяц устанаўліваўся пэўны працэнт скідкі з такім разлікам, што плата для асоб, якія зараблялі не вышэй 20 руб. у месяц, складала 5,5 кап. за 1 м$^2$, а пры зарплаце звыш 125 руб. у месяц устанаўлівалася адпаведная надбаўка да асноўнай кватэрнай платы. Зарплата сярэдняга рабочага складала прыкладна 50 руб. у месяц — ён плаціў 18 кап. за 1 м$^2$. Плата за камунальныя паслугі спаганялася звыш кватэрнай платы ў памеры фактычнага кошту гэтых паслуг.

Жыллёвае пытанне ўскладняў дынамічны рост колькасці насельніцтва. Так, у 1897 годзе ў Мінску пражывала 97 тыс. чалавек, а па выніках перапісу 1922 года — 102 375. У 1935 годзе— каля 200 тыс. чалавек, а ў чэрвені 1941 года ўжо каля 300 тыс. У значнай ступені гэты рост адбываўся за кошт росту колькасці пралетарыяту. Напрыклад, калі ў пачатку 1928 года ў горадзе не было і 5 тыс. прамысловых рабочых, то к 1933 году іх налічвалася 20 736.

З 1925 года жыллёвыя кааператывы пачалі ўзвядзенне рабочых пасёлкаў у раёне Ляхаўкі, вакзала, плошчы Парыжскай Камуны — тыповыя 2—4-х кватэрныя драўляныя дамы. Кватэры каштавалі ад 3 да 4 тыс. рублёў. Месячны ўзнос пайшчыка складаў 10—12 руб. З пачатку 30-х гадоў шырока пачалі будавацца 16-кватэрныя дамы з двума пад'ездамі. У асноўным так быў забудаваны Грушаўскі пасёлак. Плошчы катастрафічна не хапала, таму часта ў трохпакаёвых кватэрах жылі дзве сям'і. Але гэта яшчэ лічылася нядрэнным. Значную частку жыллёвага фонду Мінска ў даваенны час складалі так званыя баракі — лёгкія драўляныя будынкі, прызначаныя для часовага жылля.

Нельга не адзначыць намаганняў гарадскіх улад па падтрымцы індывідуальнага будаўніцтва — выдаваліся пазыкі тэрмінам да 10 гадоў. На ўскраінах узнікалі новыя вуліцы. Напрыклад, за летні перыяд 1938 года ўласныя дамы пабудавалі каля 200 мінчан — выраслі шэсць вуліц у раёне Козырава (р-н сучаснай вуліцы Вільямса). Для гэтых шчаслівуцаў, напэўна, адзінай праблемай заставалася транспартная.

А вось жыхары цэнтральнай часткі Мінка з пачатку 1920-х гадоў па сапраўднаму пакутвалі ад антысанітарыі. Улады атрымлівалі шматлікія скаргі. Нарэшце, у студзені 1927 года Старшыня Саўнаркома БССР Я. А. Адамовіч звярнуўся ў Саўнарком СССР з просьбай дазволіць расходаваць адзін мільён рублёў на будаўніцтва ў Мінску каналізацыі. Кіраўнік БССР пісаў, што ў часы вайны і рэвалюцыі санітарны стан горада вельмі пагоршыўся —

калодзежы, убіраючыя нечыстоты, не рамантаваліся, і ўвесь бруд сцякаў у раку Свіслач. Ён таксама падкрэсліў, што па найбольш шчыльна заселеных кварталах цэнтра праходзіць рака Няміга, больш падобная на канаву, якая штогод увесну і ўвосень затапляе шмат кватэр, складоў, магазінаў. Гэта ўскладняла пабудову каналізацыі.

А вось «праблему Нямігі» пачалі вырашаць раней. Значны гістарычны факт: 17 ліпеня 1926 года Мінакркамгас заключыў з акцыянерным таварыствам «Водаканал» дагавор на выпаўненне работ па змяшчэнню Нямігі ў жалезабетонны калектар. Згодна з §§ 48 і 51 пагаднення, падрадчык меў паўнамоцтвы спыняць усякі рух (конны і пешы) на месцы работ, а таксама ў самы кароткі тэрмін адсяляць жыхароў з дамоў, якім пагражаў абвал. Узяўшыся за справу сур'ёзна, у хуткім часе падводзілі вынікі — да 28 лістапада калектар быў укладзены поўнасцю на ўчастку ад вуліцы Рэспубліканскай да Свіслачы. Выканалі асноўную частку работ, а ў наступным годзе газета «Рабочий» радасна абвясціла: «Немига укрощена!»

Зараз да той радасці прымешваецца лёгкі сум. Ніхто ўжо потым не бачыў, як адлюстроўваецца сонца ў водах ракі, дзякуючы якой стала вядома пра існаванне ў старажытнасці самога Мінска.

15 мая 1930 года ўступіла ў эксплуатацыю гарадская каналізацыя. У 1931—1932 гадах ішлі інтэнсіўныя работы па рэканструкцыі водаправода. 12 ліпеня 1933 года пачала дзейнічаць новая воданапорная станцыя ў Навінках, якая забяспечвала вадой значную частку Мінска. Водаправод быў праведзены і на ўскраіны — Барысаўскі тракт, вуліцы Дзяржынскага, Розы Люксембург. Яго даўжыня на 1 студзеня 1937 года складала 65 км. Але на пасяджэннях кіраўніцтва горада адзначаліся і недахопы. У пачатку таго ж года з усіх жылых будынкаў (9883) было абсталявана водаправодам толькі 12,9%, а каналізацыяй — 5,5%. Дадзеная практыка была вызначана як шкодніцкая — быў зняты з пасады кіраўнік «Мінводаканалбуда». У віну яму ставілася, напрыклад, невыкананне плана забеспячэння аднапавярховых драўляных будынкаў (якіх было ў Мінску 87% ад агульнай колькасці дамоў) водазаборнымі калонкамі.

Сёння, калі ў кватэрах Мінска пачалі шырока выкарыстоўвацца лічыльнікі вады, цікава паглядзець, як аплачвалі гэту паслугу раней. Згодна з пастановай Мінгарсавета ад 8 снежня 1934 года за карыстанне вадой з калодзежаў, помп, калонак устанаўлівалася наступная плата ў месяц:

1) для працоўнага насельніцтва — 30 кап. з чалавека;

2) для былых чырвоных партызан, былых чырвонагвардзейцаў і пенсіянераў — 20 кап.;

3) для непрацоўнага насельніцтва — 1 руб.;

4) для дзяржаўных, грамадскіх устаноў і прадпрыемстваў, якія знаходзяцца на дзяржаўным і мясцовым бюджэце — 25 кап.;

5) для кааператыўных устаноў і прадпрыемстваў, якія знаходзяцца на гаспадарчым разліку, — 50 кап.;

6) для камерцыйных устаноў — 1 руб. 50 кап.

Палітыка савецкай улады у адносінах да камерцыйных структур была зразумелай. Калі ў 1928 годзе прыватны сектар у агульным рознічным тавараабароце Мінска складаў 29,4%, у 1929 годзе — 22,7%, то ўжо ў 1930-м на долю прыватніка прыпадала ўсяго 3%. Дыктаваў моду ў дзяржаўным гандлі Мінскі ГУМ, які ўпершыню адчыніў дзверы для пакупнікоў 28 мая 1934 года. Першы будынак ГУМа змяшчаўся праз адзін квартал ад сучаснага — на рагу вуліц Савецкай і Камсамольскай. Яго філіялы: дзіцячы — на рагу вуліц Ленінскай і Савецкай, тэкстыльных вырабаў — на плошчы Свабоды, 35.

1 чэрвеня 1935 года на рагу вуліц Ленінскай і К. Маркса ў доме Белкамунбанка (гл. фотаздымак) пачаў дзейнічаць узорны гастранамічны магазін Мінхарчгандлю з аддзеламі: булачным, малочным, кандытарскім, рыбным. Тут быў таксама вялікі выбар він і тытунёвых вырабаў. Пры магазіне было адчынена кафэ, якое працавала з 9 гадзін раніцы да 2 гадзін ночы. Позні я наведвальнікі адчувалі сябе даволі камфортна, бо Ленінская вуліца была на той момант адзінай у горадзе, асветленай дзвюма лініямі электрычных лямпачак.

На Савецкай вуліцы такія ж лініі былі пракладзены ўвосень 1935 года. А напрыканцы 1939-га Мінск асвятляўся ўжо 1581 электрычнай кропкай.

Адначасова з асвятленнем цэнтра гарадскія ўлады праводзілі «барацьбу з цемрай і забітасцю ўскраін». Вынікі былі адчувальныя. У 1930-я гады адным з найбуйнейшых спажыўцоў электраэнергіі зрабілася Ляхаўка. Гэта вялікае прадмесце ў XIX — пачатку XX ст. падзялялася на Верхнюю Ляхаўку — трохвугольнік паміж сучаснымі вуліцамі Свярдлова, Ульянаўскай і берагам Свіслачы і Ніжнюю Ляхаўку — вялікі раён, які ўключаў тэрыторыю на ўсход і паўночны ўсход ад сучаснай вуліцы Кастрычніцкай, далей за Свіслаччу — вуліца Лодачная, а таксама на поўдзень ад чыгуначнага моста ўздоўж ракі па цячэнню. З пачатку 1920-х Ляхаўка паступова рабілася буйным прамысловым раёнам.

У 1922 годзе на Ніжняй Ляхаўцы на месцы старых майстэрань, заснаваных яшчэ ў 1912 годзе, быў нанава пабудаваны чыгуналіцейны і машынабудаўнічы завод «Энергія» (з лютага 1931 года — імя Варашылава). У 1930-я гады тут выраблялiся славутыя такарныя станкі «ДІП-300» (абрэвіятуру расшыфроўвалі звычайна як «дагнаць і перагнаць»). У 1921—1922 гадах на Ляхаўцы таксама пачалі дзейнічаць дражджавы завод «Чырвоная зорка», узноўлены пасля разбурэння ў час грамадзянскай вайны гарэлачны завод. Шляхам аб'яднання чатырох дробных заводзікаў быў створаны знакаміты гарбарны завод «Бальшавік». Цяжкі пах, што ішоў адсюль, быў «візітнай карткай» усёй Ляхаўкі, але нельга забывацца пра тое, што менавіта на мінскім «Бальшавіку» ўпершыню ў Савецкім Саюзе, у 1938 годзе пачалі вырабляць высакаякасны хром са свіных шкур. Дарэчы, у тыя часы дзейнічаў закон, згодна з якім забаранялася абпальваць свіныя тушы. Шкуры належала здаваць у загатоўчыя канторы.

4 верасня 1927 года газета «Рабочий» з гонарам паведаміла, што Мінскі фармацэўтычны завод выпусціў першыя партыі нафталіну, глаўберавай солі і зялёнага мыла. Было вызначана, што вырабы завода на 30—40% таней за прывазныя.

З 1928 па 1930 год пабудаваны два цагельныя заводы, якія, аднак, былі недастаткова механізаваны, і колькасць цэглы не забяспечвала патрэб Мінска. У 1934 годзе быў пабудаваны клінкерны завод (выпускаў спецыяльную цэглу для брукавання вуліц).

У студзені 1930 года ў горадзе з'явілася адзіная ў БССР па абсталяванню Цэнтральная малочная з агульнай прадукцыйнасцю — 6 тыс. літраў малака ў гадзіну. Тут упершыню ў рэспубліцы пачалі вырабляць ацыдафілінавыя напіткі (у сакавіку 1936 года).

2 мая 1931 года адбылося ўрачыстае адкрыццё цукерачнай фабрыкі «Камунарка». Тут працавала амаль тысяча чалавек, значная частка з якіх былі жыхарамі новага рабочага пасёлка «Камінтэрн». Да пачатку 1940-х гадоў раён пасёлка захоўваў яшчэ і дарэвалюцыйную назву — урочышча «Тры карчмы» (якія сапраўды знаходзіліся тут спрадвеку — з левага боку былога шляху на Магілёў). Сёння адсюль пачынаецца Партызанскі праспект.

Новая фабрыка зрабіла жыццё мінчан, можна сказаць, больш салодкім. Яе тагачасныя вырабы з настальгіяй згадваюць дзеці 1930-х — зараз ужо сівыя бабулі і дзядулі. Але не толькі вырабы. У пачатку 1939 года ў карамельным цэху «Камунаркі» быў устаноўлены механічны напаўняльнік — апарат, які замяніў начынку цукерак уручную. Гэта ўспрымалася як «прарыў на кандытарскім фронце». Па сведчанню старажылаў, у Мінску тады распаўсюдзіўся вядомы і сёння жарт — калі нехта пачынаў выказвацца занадта «навукова», яму казалі: «Так, усё добра, але спачатку растлумач, якім чынам павідла трапляе ў самую сярэдзіну цукеркі?»

А ўвогуле, індустрыяльнае будаўніцтва — справа сур'ёзная. Па афіцыйных звестках у Мінску аб'ём прамысловай прадукцыі ў 1932 годзе перавысіў узровень 1928 года больш чым у 6 разоў. У 1932 годзе горад даў амаль чацвёртую частку (23,6%) усёй прамысловай прадукцыі Беларусі. У ім тады налічвалася 13 прадпрыемстваў з колькасцю рабочых ад 500 да 1000 і вышэй, 19 — ад 200 да 500, 24 — ад 100 да 200 і каля 90 дробных прадпрыемстваў.

У апошніх таксама меліся свае дасягненні. Так, 18 красавіка 1935 года ў клубе імя Сталіна (рог Інтэрнацыянальнай і Камсамольскай вуліц) адбылася 1-я Усебеларуская выстава дзіцячых цацак. Тут дэманстравалася звыш 150 экспанатаў айчыннай вытворчасці.

У снежні 1935 года быў рэарганізаваны Мінскі хлебакамбінат. З яго складу вылучаны прадпрыемствы: Мінскі хлебазавод (раён Нямігі), 1-я механічная пякарня (Старажоўка, 53), 2-я механічная пякарня (Хлебная, 6), Упраўленне саматужных пякаран (Няміга, 8). 7 лістапада 1940 года на Слясарнай вуліцы ўступіў у строй найбуйнейшы ў БССР хлебазавод-аўтамат.

У жніўні 1940 года пачаў выпрабляць прадукцыю Мінскі радыёзавод (сённяшні «Гарызонт»). У серыйны выпуск пайшлі мадэлі прыёмнікаў: пяціламповы «Піянер», шасціламповы «КІМ», дзевяціламповы «Маршал».

Буйны прамысловы рост сталіцы ў пачатку 1930-х быў бы немагчымы без папярэдняга вырашэння транспартнай праблемы.

Як дабіраліся мінчане да месца прызначэння? На студзень 1922 года ў горадзе было зарэгістравана каля 150 легкавых возчыкаў і 120 ламавых. Розныя ўстановы мелі каля 300 уласных выездаў. У 1923 годзе конная чыгунка мела працяг 5 вёрст і ў сярэднім за дзень перавозіла каля 2800 чалавек. У 1925 годзе Мінск атрымаў 5 аўтобусаў маркі «Форд» і 10 маркі «Фіат», але толькі са студзеня 1926 года ўсталяваўся рэгулярны рух адзінаццаці машын. Ён пачынаўся даволі позна — з 8 гадзін раніцы. У снежні 1927 года горад набыў аўстрыйскія аўтобусы. Са студзеня 1928 года пачаўся рух па новых маршрутах: пл. Свабоды — Ляхаўка, пл. Свабоды — Серабранка — Козырава. Праезд каштаваў дарагавата — адна станцыя (каля 1,5 км) — 10 кап. І ўсё ж, па даным Аўтамабільнага ўпраўлення Мінакркамгаса, за 1926—1927 гады аўтобусы перавезлі 774 тыс. чалавек. Кожны з новых аўтобусаў «Штэйер» абслугоўваў за дзень больш як 700 пасажыраў.

Традыцыйная конка за той жа час перавезла 1 млн. 670 тыс. чалавек, але гэта было яе апошняе буйное дасягненне. За дзесяцігоддзі добрасумленнай працы рэйкі і вагончыкі ўшчэнт знасіліся. Са студзеня 1928 года спыніўся рух конкі па цэнтральных вуліцах, але цікава, што некаторая частка тых старых рэек захавалася дагэтуль. Якім чынам, дзе? Пасля дэмантажу іх выкарыстоўвалі для ўмацавання фундамента Дома ўрада, што пачаў будавацца.

Як бачна з архіўных дакументаў, рашэнне аб пабудове трамвая не было лёгкім і бясспрэчным. Напрыклад, тав. Камінскі — прадстаўнік у Беларусі Наркамата шляхоў зносін СССР, начальнік Упраўлення Беларускай акругі мясцовага транспарту — быў катэгарычна супраць увядзення трамвайнага руху. Адзін з яго аргументаў зараз гучыць як прадбачанне: «У выпадку ўзнікнення ваенных дзеянняў Мінск рызыкуе адразу ж застацца без трамвая ў выніку вельмі магчымага пашкоджання электрычнай станцыі. Аўтобусы ж можна перакінуць у любое месца, у тым ліку выкарыстоўваць у ваенных мэтах».

Іншыя мясцовыя кіраўнікі былі, напэўна, большымі аптымістамі, бо ўжо к лету 1928 года Саўнаркам БССР зацвердзіў смету на пабудову трамвая ў памеры 2 млн. 650 тыс. руб.

Неўзабаве з верасня 1928 года пачалася ўкладка першых трамвайных рэек — на Савецкай вуліцы каля электрастанцыі і на новым жалезабетонным мосце праз Свіслач. Велізарныя земляныя работы спатрэбіліся там, дзе сёння праспект Ф. Скарыны спускаецца да цырка, — гару зрабілі больш палогай, на Бакунінскай вуліцы для трамвая пабудавалі новы мост (гл. фотаздымкі). Будаўніцтва ішло хуткімі тэмпамі.

5 кастрычніка 1929 года ў правадную сетку падалі напружанне ў 6000 вольт. Міліцыя лавіла хуліганаў, што забаўляліся іскрамі ад падкінутых да правадоў жалезак. 8 кастрычніка па чыгунцы з Масквы прыбылі трамвайныя вагоны мадэлі КМ з драўляным корпусам, разлічаныя на 32 сядзячых і 40 стаячых месцаў. Гарсавет устанавіў таксу: 10 кап. за ўвесь маршрут (членам прафсаюза — 8 кап.). Як бачым, гэта прынцыпова адрознівалася ад аўтобусаў, дзе плату бралі за кіламетраж.

У ноч з 8 на 9 кастрычніка зрабілі пробны пуск. Па ўсіх лініях прайшоў адзін вагон, на якім да 4 гадзін раніцы паспела праехацца кіраўніцтва гарсавета і камгаса. Пераканаўшыся, што гарадскія начальнікі засталіся жывыя, ноччу праз суткі на трамваі ездзілі члены ўрада БССР на чале са Старшынёй Саўнаркома М. М. Галадзедам.

Афіцыйны пуск адбыўся ў нядзелю 13 кастрычніка 1929 года пасля мітынгу на Прывакзальнай плошчы ля трамвайнага кола.

Спачатку маршрутаў было два: «Таварная станцыя — Камароўка» і «Пасажырскі вакзал — Старажоўка». Рух пачынаўся ў 5 гадзін раніцы, спыняўся ў гадзіну ночы. Пасля пуску трамвая інтэнсіўны аўтобусны рух захаваўся толькі на лініі «Плошча Свабоды — Козырава». З 13 кастрычніка 1929 года па 1 студзеня 1930 года трамвай паспеў перавезці 1.502.431 чалавека, ці ў сярэднім 19 246 у дзень. Трамвайны парк знаходзіўся прыкладна на тым месцы, дзе сёння — тралейбуснае дэпо № 1 (на вул. Варвашэні).

Са жніўня 1932 года пачала дзейнічаць новая лінія — на Ляхаўку. Часопіс «Чырвоная Беларусь» тады пісаў: «... Тры карчмы адкінуты ў мінулае. Ляхаўка стала горадам, гордасцю Менску». З лістапада 1933 года заходняя частка горада наблізілася да цэнтра — стала дзейнічаць лінія на Кальварыю. У студзені 1935 года трамваі пайшлі да Серабранкі. За пяць год колькасць вагонаў узрасла з 8 да 50, замест першапачатковых 18 км ліній мелася 35 км. У другой палове 1930-х гадоў налічвалася ўжо восем маршрутаў.

23 снежня 1937 года старшыня Мінскага гарвыканкама У. Р. Ванееў падпісаў новыя «Правілы карыстання трамваем». Цікава, што эпоха наклала адбітак і на гэты, здавалася б, нейтральны, дакумент. У ім, напрыклад, агаворвалася, што ў трамваі забаронены праезд асобам з вінтоўкамі, а таксама арыштаваным у суправаджэнні канваіраў. Уваход праз пярэднюю пляцоўку дазваляўся толькі інвалідам, асобам з маленькімі дзецьмі, цяжарным жанчынам, а таксама школьнікам да 12-гадовага ўзросту ў часы пачатку заняткаў.

Колькасць насельніцтва сталіцы расла хутчэй, чым трамвайны парк. З перагружанасцю машын змагаліся па-рознаму, у тым ліку і нетрадыцыйна. Увесну 1937 года па Савецкай вуліцы да Камароўкі хадзіў некаторы час трохвагонны састаў. Аднак «цягніку» было цяжка манеўраваць — новаўвядзенне не прыжылося. Вось толькі ідэя, напэўна, засталася лунаць у паветры, бо як растлумачыць наступнае: праз 65 год, у пачатку 2002-га, на адной з найбольш напружаных ліній Мінска (каля Камароўкі) пачаліся выпрабаванні новага беларускага трохсекцыйнага трамвая, разлічанага на 302 пасажыра.

А ў 1930-я транспартную нішу паступова запаўняў аўтамабіль. Малавядомы факт з гісторыі айчыннага аўтасэрвісу: першая ў Беларусі аўтарамонтная станцыя была пабудавана ў сакавіку 1935 года ў Мінску на Магілёўскай шашы. Яна з'яўлялася чацвёртай па ліку ў Савецкім Саюзе. Напрыканцы дзесяцігоддзя ў Мінску ўзрасла колькасць таксі, аўтобусаў. У сакавіку 1940 года пачалі курсіраваць новыя аўтобусы маркі «ЗІС».

Мінчане ніколі не лічылі свой горад правінцыяй — здаўна ён знаходзіўся на перакрыжаванні буйных шляхоў, у тым ліку чыгуначных. Але сапраўднымі сталічнымі жыхарамі многія пачалі адчуваць сябе толькі, калі ўступіў у дзеянне Мінскі аэрапорт. Гэта адбылося 7 лістапада 1933 года. Праз некаторы час ужо як нешта звычайнае ўспрымаліся паведамленні прэсы: «У другой палове верасня санітарныя самалёты зрабілі з Менска 6 вылетаў — у Круглае, Халопенічы, Нароўлю, Капаткевічы, Бешанковічы, Азярышча. Для аказання хуткай дапамогі былі зроблены яшчэ 3 вылеты — у Магілёў, Клімавічы, Любань» (Звязда, 30.09.1935).

І ўсё ж галоўнымі сродкамі сувязі з сусветам былі ў той час тэлеграф і тэлефон. Пачыналі з малога. У 1920 годзе тэлефонная сетка Мінска налічвала каля 200 абанентаў. Снежань 1922-га быў адзначаны ўстанаўленнем сувязі з Бабруйскам, Барысавам, Койданавым і Слуцкам. 17 красавіка 1924 года на Мінскай тэлефоннай станцыі адбылася першая размова з Масквой. У пачатку 1925-га была наладжана тэлеграфная сувязь з еўрапейскімі краінамі праз Варшаву. А першая тэлефонная размова паміж Мінскам і Варшавай адбылася 3 верасня 1927 года. У горадзе было тады ўжо каля 1000 абанентаў.

К 15-й гадавіне Кастрычніцкай рэвалюцыі ў лістападзе 1932 года была здадзена ў эксплуатацыю аўтаматычная тэлефонная станцыя на 6 тысяч нумароў. Па афіцыйных дадзеных, за 1935 год на міжгародняй тэлефоннай станцыі Мінска адбылося 743 тысячы перагавораў, і яна, такім чынам, заняла 5-е месца па СССР. У 1940 годзе магутнасці АТС — 6 тысяч абанентаў — было ўжо недастаткова для сталіцы. 82 каналы сувязі існавалі тады на міжгародняй станцыі, а з АТС яе злучалі толькі 30 ліній. З хатняга тэлефона цяжка было трапіць на «міжгорад» адразу, прыходзілася вытрымліваць чаргу.

Але асобныя аматары тэхнікі не жадалі чакаць, пакуль узнімецца агульны ўзровень сродкаў камунікацыі, яны глядзелі ў будучыню. Прынята лічыць, што ў Мінску тэлебачанне з'явілася ў 1950-я гады. Як масавая звычка — так. Зараз мала вядома, што яшчэ ў 1930-я айчынныя «самародкі» пачалі выраблядь першыя тэлепрыёмнікі, падобна таму, дарэчы, як напрыканцы 1980-х у хатніх умовах майстры збіралі першыя спадарожнікавыя антэны.

Дык вось, першы тэлевізар з'явіўся ў Мінску роўна 70 год таму назад — у 1932-м! Юбілей варты таго, каб прывесці вялікую цытату (Звязда, 7.02.1936):

«Супрацоўнік Навукова-даследчага інстытута прамысловасці тав. Г. Бартноўскі сканструяваў у 1932 годзе апарат-тэлевізар, пры дапамозе якога можна слухаць радыёперадачы і бачыць іх удзельнікаў. 30 студзеня 1936 года на кватэры майстра (завулак Красівы, д. 8, кв. 2) быў наладжан прагляд чарговай праграмы тэлебачання для чатырнаццаці старэйшых радыёаматараў Менска.

На маленькім экранчыку з'яўляецца знаёмая фігура Аляксея Стаханава. Ён выказвае радасць, што яго адначасова бачаць у розных гарадах вялікай краіны. Славутыя забойшчыкі Дзюканаў і Канцэдалаў паказваюцца на экране. На іх грудзях ордэны Леніна. Парторг шахты «Цэнтральная — Ірміно» тав. Пятроў паведамляе, што па прыездзе дамоў ён таксама пабудуе сабе тэлевізар.

...Перадача заканчваецца тэлевіктарынай — з'яўляецца артыст і пачынае брыцца, потым ён мыецца, снедае, чысціць бацінкі, апранаецца і, развітаўшыся з «публікай», выходзіць.

Перадача ўскалыхнула гледачоў. Таварышы Яфімаў і Шумскі заявілі, што яны сканструююць сабе тэлевізары. Пад кіраўніцтвам тав. Бартноўскага пры радыётэхнічным кабінеце Белрадыёкамітэта арганізуецца гурток тэлебачання».

Невыпадкова, здаецца, ужо ў самых першых тэлеперадачах можна было пабачыць, як «звычайны чалавек» мыецца ці снедае. Нават у той наскрозь ідэалагізаваны час улады не забываліся, што сярэдняга абывацеля цікавіць у першую чаргу яго хатні быт. Важная роля ў выхаванні працоўных надавалася сістэме грамадскага харчавання. У другой палове 1920-х быў вельмі папулярным лозунг аб «вызваленні жанчын ад хатняга рабства». Замест былых рэстаранаў адчынялі дзверы «паказальныя сталоўкі», куды прапаноўвалася прыходзіць усёй сям'ёй.

Адным з перажыткаў мінулага было абвешчана п'янства. 9 лютага 1930 года ў будынку насупраць кіно «Чырвоная зорка» пачала працаваць першая ўзорная чайная з мэтай, як было шырока абвешчана, «арганізацыі культурнага адпачынку рабочых». Тут мелася вялікая бібліятэка-чытальня, а яшчэ і кожны столік быў забяспечаны асабістай радыёкропкай з навушнікамі, цэны ж не адрозніваліся ад іншых чайных горада.

А ў жніўні 1939 года ў Мінску, у доме № 50 па Савецкай вуліцы, пачаў абслугоўваць кліентаў першы ў БССР кафетэрый.

Напрыканцы 1934 года індустрыя ежы ў Беларусі набыла флагмана — уступіла ў строй фабрыка-кухня. Знаходзілася яна побач з Домам урада, і пабудаваны былі абодва будынкі амаль адначасова — сімвалічнае супадзенне. Фабрыка мела магчымасць накарміць у дзень некалькі тысяч чалавек. З наступнага года яна пачала развозіць штодзень снеданні па ўсіх школах Мінска — на ўласных аўтамашынах з фірменным кляймом.

Аб значнасці харчовай праблемы ў разглядаемы час сведчыць і наступны факт: найбольш моцная спартыўная база сталіцы, што знаходзілася ў парку імя Горкага, — са стадыёнам, трэкам, пунктамі пракату інвентару, лодачнай станцыяй належала спартыўнаму таварыству «Харчавік». Для мінчан 1930-х гадоў гэтая назва гучала не менш сур'ёзна, чым «Дынама» ці «Спартак».

Той, хто любіў гатаваць сам, мусіў выкарыстоўваць прымус — невялікі агрэгат, які працаваў на газе, але з ім было шмат праблем. Вось некалькі радкоў з артыкула «Прымус сапсаваўся» (Советская Белоруссия, 24.08.1938): «... сапсаваўся ў вас прымус. Вы імкнецеся як мага хутчэй адрамантаваць яго, бо інакш рызыкуеце застацца без гарачай ежы». Далей гаворыцца, што адпаведныя майстэрні працуюць вельмі дрэнна, і ўвогуле, іх няшмат. Канцоўка не прыбаўляла аптымізму: «... яшчэ горш, калі ў прымусе прыйшла ў непрыгоднасць гарэлка — тут ужо вам ніхто не дапаможа. Абыдзіце ўсе майстэрні Мінска, а гарэлкі к прымусу не знойдзеце».

Адна з тыповых рыс штодзённага жыцця 1920—30-х — гэта выключная роля ў грамадскім жыцці кінематографа. Сапраўды, «вялікі нямы» карыстаўся ў мінчан заслужанай папулярнасцю. Колькасць насельніцтва горада ўзрастала даволі хутка, але на працягу двух дзесяцігоддзяў тут было толькі пяць кінатэатраў. Некаторыя існавалі яшчэ да рэвалюцыі, як, напрыклад, «Гігант». Яму, увогуле, пашанцавала — у лістападзе 1930 года ён стаў першым гукавым у Беларусі. Так увайшоў у гісторыю, але ўжо пад назвай «Чырвоная зорка».

Другі па велічыне кіназал — «Пралетарый» — быў адчынены ў жніўні 1934 года ў будынку па Савецкай вуліцы, насупраць Цэнтральнага сквера. Наўрад ці трэба тут згадваць увесь тагачасны рэпертуар кінатэатраў, рабіць высновы аб іх ідэйнай значнасці і г.д. Звернем увагу на тое, што мала вядома — усё на той жа «быт». 9 верасня 1935 года «Звязда» змясціла фельетон маладога пісьменніка Станіслава Шушкевіча. Будучы літаратурны мэтр выказваўся даволі сярдзіта: «Чарга каля кіно «Пралетарый» круцілася, як скурат на агні. Шмат часоў прастаяў у чарзе глядач. Пару разоў яму наступілі на нагу, пару разоў штурхнулі... На эстраднай пляцоўцы файе на ўсе галасы разрываўся джаз. Некалькі шчасліўцаў сядзелі на крэслах і слухалі вясёлых музыкантаў. У велізарным файе, дзе можна рассесціся тысячы чалавек, стаяла ўсяго пара дзесяткаў крэслаў... Сеанс закончан. Трэба прайсці цёмны, брудны двор, каб выйсці на вуліцу.

Кіно «Чырвоная зорка». Тут столькі ж трэба стаяць у чарзе за білетамі. Праўда, тут можна пасядзець у файе... Адна бяда — эстрадная пляцоўка бывае пустой... Выхад і ў гэтым кінатэатры вядзе праз гразкі двор».

Дзеля чаго былі ўсе гэтыя ахвяры, таптанне ў чэргах па некалькі гадзін? Часам — дзеля сапраўднага Мастацтва. Дзве знакавыя постаці ўвайшлі ў жыццё мінскіх кінааматараў у сярэдзіне 1930-х — Чапаеў і Чаплін. Перагарнём некалькі старонак мясцовай хронікі.

Восень 1934 года — звесткі пра трыумф фільма «Чапаеў» у сталіцы СССР хутка трапілі ў Мінск. Трэст «Белдзяржкіно» завалены ўсхваляванымі запытамі грамадзян, але чыноўнікі самі не ведаюць, калі стужка пройдзе ўсе інстанцыі.

25 лістапада ў «Пралетарыі» пачаўся папярэдні продаж білетаў на 27-е. Чарга больш нагадвае натоўп. Яе нельга ўтрымаць на тратуары. Рух трамваяў па Савецкай спыняецца некалькі разоў.

26—29 лістапада 1934 года чэргі робяцца больш арганізаванымі, але зараз ужо нагадваюць мітынгі. Прэса паведаміла, што на пленуме ЦК УКП(б) у Маскве адбылося доўгачаканае — адменены ўсім абрыднуўшыя хлебныя карткі, у пэўнай ступені краіна вяртаецца да рыначнай эканомікі.

1 снежня 1934 года — першы дзень паказа «Чапаева» ў «Чырвонай зорцы». Са слязамі на вачах многія перажываюць гібель героя. Ідучы ўвечары дамоў, яны яшчэ не ведаюць, што некалькі гадзін назад у Ленінградзе забіты выдатны дзяржаўны дзеяч С. М. Кіраў, што заўтра краіна апранецца ў жалобнае адзенне.

Пачыналася іншая палітычная эпоха — эпоха масавых судовых працэсаў усесаюзнага маштабу. Неспакойныя часы надышлі і ў сталіцы БССР. Праходзілі бясконцыя «чысткі» партыі. Стандартным стала абвінавачванне ў трацкізме. Яно выкрэслівала чалавека не толькі з сацыяльнага жыцця, але нярэдка з жыцця ўвогуле.

Вялікі комік і трагік Чаплін з'явіўся ў Мінску непрыкметна. Ішоў ліпень 1936 года, працягваўся сезон адпачынкаў. Не было папярэдняй рэкламнай кампаніі, толькі паведамленне на апошняй старонцы «Звязды»: «Чарлі Чаплін у фільме «Новые времена», прэм'ера сёння». Першыя шчасліўцы ўзялі білеты даволі лёгка, аншлагі пачаліся пазней.

У верасні 1936-га — зноў прэм'ера: «Агні вялікага горада» у «Пралетарыі». Верагодна, што ў гэтым выпадку дата паказу была вызначана наўмысна. У той дзень, 13 верасня, на Мінскім аэрадроме адбыўся вялікі парад з нагоды заканчэння манеўраў часцей Беларускай ваеннай акругі. У горадзе гасцявалі вельмі важныя асобы: нарком абароны СССР К. Я. Варашылаў, маршалы Будзённы, Ягораў, Тухачэўскі, а таксама дэлегацыі армій Вялікабрытаніі, Францыі і Чэхаславакіі, якія прысутнічалі на манеўрах. Фільм Чапліна выводзіў культурнае жыццё горада на агульнаеўрапейскі ўзровень.

Дарэчы, з «Пралетарыем» звязана адна амаль містычная гісторыя — гісторыя апошніх перадваенных гадзін Мінска. Добра, што кінатэатр захаваўся на фотаздымках, бо зараз на тым месцы няма нават будынкаў (тут плошча насупраць Цэнтральнага сквера). Пасля рэканструкцыі ў 1938 годзе яго перайменавалі ў «Радзіму», зал павялічылі да 1000 месц. 21 чэрвеня 1941 года ў ім дэманстраваўся фільм «Фронтовые подруги» (сімвалічная назва). Назаўтра быў выхадны дзень — нядзеля, таму зрабілі дадатковы сеанс, які пачынаўся 22 чэрвеня ў палове першага ночы.

А роўна ў нуль-нуль гадзін у фае «Радзімы» адбылося, згодна з праграмай, вясёлае выступленне «Тэа-джаза» — куплеты, камічныя сцэнкі, аперэтачныя дуэты і інш. Фільм скончыўся каля трох гадзін ночы. Гэта было апошняе масавае грамадскае мерапрыемства ў даваенным Мінску, да пачатку вайны заставаліся лічаныя хвіліны.

Цікава, што прароцтва можна знайсці часам ў звычайнай газетнай заметцы. Вось радкі з «Советской Белоруссии» ад 7 верасня 1940 года: «... второй день больших противовоздушных учений в Минске. Утром все было спокойно. Но вдруг показались бомбардировщики. Завыли сирены. Радиорупоры коротко возвестили:

— Воздушная тревога! Воздушная тревога!

Зенитная артиллерия открыла «стрельбу», но нескольким самолетам все же удалось прорваться к городу и нанести немало «повреждений». «Бомбы» упали на площадь Свободы, «загорелась» гостиница «Европа». На сквере много «раненых, отравленных, обожженных»... Второй день учений в Минске вскрыл немало недостатков в деятельности отдельных служб».

Напэўна, у выніку такіх «недахопаў», менш, чым праз год, авіябомба ператварыла шасціпавярховую «Еўропу» ў руіны. Заляцанні з вайной кепска скончыліся.

18 чэрвеня 1941 года ў тры гадзіны дня пачалося запаўненне катлавіны Камсамольскага возера водамі Свіслачы. 21 чэрвеня «Советская Белоруссия» выступіла з вельмі актуальным матэрыялам «К открытию купального сезона на Минском озере». Але прызначанае назаўтра ўрачыстае адкрыццё не адбылося, як не адбыўся і запланаваны на 29 чэрвеня 1941 года грандыёзны Усебеларускі парад фізкультурнікаў перад Домам урада. Дарэчы, тады Мінскам кіравала ўжо зусім іншая адміністрацыя, за нейкі тыдзень змянілася ўсё... Толькі Свіслач здолела захаваць нязменным сваё павольнае цячэнне. Нарэшце і ёй трэба прысвяціць некалькі радкоў як раўнапраўнай частцы горада.

У разглядаемыя дзесяцігоддзі галоўная рака беларускай сталіцы страціла старадаўнюю веліч і нагадвала аб сабе гараджанам адзін раз у год, падчас вясновай паводкі. Нагадвала, бывала, даволі моцна. Напрыклад, 14 сакавіка 1936 года ўзровень вады дасягнуў 368 см, 18 сакавіка 1938 года — 356 см (пры звычайным 190 см). Тады пад вадой апынулася ўся прыбярэжная частка парку імя Горкага, стадыён, падыходы да Пуліхаўскай Слабады, шматлікія агароды.

Аднак што рабілася ў 1941-м! Па-першае, паводка была незвычайна позняя, па-другое... пад'ём ракі пачаўся ў 10 гадзін раніцы 14 красавіка, а 16 красавіка вада паднялася ўжо да 455 см! Затапіла дамы на Калгаснай, Садова-Набярэжнай, Лодачнай, Гарбарнай, Стара-Віленскай, Стара-Слабодскай, Кастрычніцкай, Пуліхаўскай вуліцах, а таксама значную частку парку імя Горкага. Звыш 150 сем'яў эвакуіравалі з затопленых кватэр. Былі прыняты надзвычайныя меры супраць затаплення электрастанцыі № 1 (побач з паркам). Прыбываючую ваду тут спрабавалі адкачваць помпамі. Патокі вады прарвалі дамбы, пабудаваныя ў Клябанскім завулку і на Садова-Набярэжнай вуліцы. Гідраметслужба, нарэшце, «супакоіла»: узровень вады не павінен перавысіць 465 см.

Некалькі год таму назад давялося пачуць цікавую версію тых падзей ад добрай знаёмай, мінскага старажыла Галіны Рыгораўны Каленік. Па яе словах: «Прырода нешта такое прадчувала. Ледзь ня ўвесь Мінск тады Свіслач слязамі абмыла, нібы развітвалася...»

Каб зняць залішнюю вільгаць са старонкі, выкарыстаем сухую газетную цытату (Звязда, 5.01.1941): «Пашпарт горада Мінска. Калі ў 1926 г. тут пражывалі 132 942 чалавекі, то цяпер амаль 300 тысяч. Каб прайсці ўсе вуліцы Мінска, трэба зрабіць 199 км. Уся тэрыторыя горада займае 65 км$^2$. Садамі і паркамі засаджана 1975 га.

У 10 вышэйшых навучальных установах вучыцца 6674 студэнты. Ёсць 17 тэхнікумаў і 42 школы, 36 ясляў, 76 дзіцячых садкоў.

Да паслуг працоўных — 12 бальніц і клінік, 20 паліклінік і амбулаторый, 48 урачэбных пунктаў і 2 радзільныя дамы. Працоўных абслугоўваюць 963 урачы.

У 1941-м — на 874-м годзе існавання — Мінск узбагаціць свой пашпарт яшчэ больш цікавымі і багатымі звесткамі».

Прагноз, на жаль, не спраўдзіўся.

Дадзеная кніга, па сутнасці, — адна велізарная фатаграфія, вырваная калісь жорсткім часам з «пашпарта» горада. Рана ці позна патрэбна было ўклеіць здымак на месца.

Шчыра дзякую людзям, без дапамогі і падтрымкі якіх ніколі не выйшаў бы ў свет гэты зборнік:

Вячаславу Дзмітрыевічу Селяменеву — дырэктару Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь.

Віктару Васільевічу Баландзіну — дырэктару Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў.

Васілю Аляксандравічу Дзмітрэнку — дырэктару Беларускага дзяржаўнага архіва навукова-тэхнічнай дакументацыі.

Ганне Вячаславаўне Запартыка — дырэктару Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва.

Пятру Сяргеевічу Хацько — дырэктару Нацыянальнага музея гісторыі і культуры Беларусі.

Лідзіі Пятроўне Палескай — захавальніцы калекцыі фотаздымкаў мінскага краязнаўцы Васіля Іванавіча Каляды.

Удзячны за магчымасць апублікаваць не проста разрозненыя фота, а зрабіць нешта накшталт сапраўднай экскурсіі. Яе пачатак традыцыйны — ад вакзала. Адтуль маршрут пралягае ўздоўж вуліцы Савецкай (праспекта Францішка Скарыны) — галоўнай артэрыі горада — на супрацьлеглы бок Мінска, да Усебеларускага стадыёна (раён Батанічнага саду). Экскурсанты маюць час абысці амаль увесь цэнтр Мінска 1920—30-х гадоў і таксама зазірнуць на ўскраіны — Койданаўскі тракт, Ляхаўку, Кальварыю, Старажоўку... Калі ласка, рушым наперад. Прыемнага падарожжа!

*Ілья КУРКОЎ*

# **MINSK THE UNFAMILIAR** 1920 -1940

Minsk's image has changed many times in its nearly thousand-year history. But interestingly, most of the changes have occurred in the last six dozens years. During this period, Belarus' capital has been demolished and has risen up from the ashes, losing much of its historical visage. So what are the people of today who wish to dip into the past to do?

Minsk's pre-revolution is familiar enough to the modern "spectator". More than a few postcards with streets for sightseers have been published. Already, the names sound familiar.

As strange as it may seem, social consciousness had not managed to create stereotypes and images for the next epoch — for the creation of socialism in the 20—30s. Even now, there are only a few phrases, which linger from school years: New Economic Politics (NEP), the five-year plan, and industrialization. One probably remembers yet another — the housing crisis. But where is the atmosphere, the witness of all this? Where are the decorations that were built for the Socialist drama?

An answer can be found in the photos of the 20s and 30s. Unfortunately, at that time, fans of photography were not so lucky. According to the recollections of an old-city citizen, well-known doctor and student of local lore, Vasily Ivanovitch Kaleda, it was dangerous to take photos of buildings and streets-especially in the center. This was connected to the Belarusian capital's peculiar status, which was unique even by the scales of the Soviet Union.

For almost twenty years, the Western border of the USSR laid approximately 30 short kilometers from Minsk. This determined its "specialization". Firstly, it was an "impregnable fortress" in case of enemy invasion. And secondly, it was a kind of "advertising shield", demonstrating the peculiarities of the social regime to arriving foreigners. The city was, in its essence, the facade for the entire Soviet country!

It's clear how every object was then considered to be "strategic" in those circumstances. As an unfortunate result, there were not many photos kept of 1920—40s Minsk. Even so, the period is a unique page in the city's history. For a short time, they had managed to pour a new "capital wine" into the old "governing furs"— right to the edges. Minsk had gained its own style and a new face.

Streets that had been planned in the beginning of the XIX century suddenly became important transport arteries, while the city's borders expanded. For twenty years, the capital's population had grown almost threefold. New personages appeared among the streets' crowds: students, industry workers, frontiersmen, and many soldiers. By the beginning of 1941, Minsk was already home to approximately 300,000 people. The sum for the streets' lengths came to approximately 200 km. The territory occupied 65 sq. km. By the end of 1940, 6,674 students studied at ten higher schools in Minsk. There were also 17 technical schools, 42 secondary schools and 112 preschool institutions.

The city's industry was developing at a quick tempo. New buildings for plants and factories were being created.

The purpose of this book is to restore, and to release from nonexistence, a complete visual compendium of 1920—30s Minsk that the majority of modern citizens have never seen. Having opened this album, one has the opportunity to walk along shadowy streets or to go on an excursion with friends while enjoying and recognizing familiar forms.

As an author and collector, I'm happy to not only be able to publish some never-seen photos, but to organize a real excursion. It starts traditionally — with a railway station. From there, the route passes along the main artery of the city — Savetskaya Street /today it is F.Skaryna Avenue/ to the opposite edge of the city — All-Belarusian Stadium /now it is the district of the Botanical Garden/. Excursionists can pass along the entire center of Minsk of the 1920—30s, as well as to see its suburbs — Koidanawsky highway, Lyakhawka, Kalvaria, Starazhowka...

So let's move on! And have a good trip!

*Ilya KURKOV*

# Ваенна-тапаграфічная карта (фрагменты) горада Мінска і ваколл[illegible]

**Захоўваецца ў Нацыянальным архіве Рэспублікі Беларусь. (Друкуецца ўпершыню.)**

| Управление военных топографов РККА<br>— 35 — С3 — А — а (Минск) | Секретно<br>[illegible] ССР. 1933 г. | Управление военных топографов РККА<br>— 35 — С3 — А — б (м[illegible]. Больш[illegible]) |
|---|---|---|





78
77
75
74
73
72
в Радошковичи
в м. Раков
Крупцы
Сох. Людамонт (зерн.)
Сох. СГПХ (жив.)
Сельхоз
Ольшово
Разъ.
Кирп.
Мал. Медвежино
Кирп.
Трикотаж
Ст.
Депо
Тов. ст.
р. Свислочь
Свислочь
224.4
208.1



г. МИНСК
Стадион
Больн.
Тр. Парк
Ипподро..
р. Свислочь
ТЭЦ
Тир
Инкубатор
Лагерь
Клх им. Дзержинского
Слепянка
19
Будилово
22


83
82
81
80
79
78
77
Зацень
Чижовка
Огородники
Зацень
Дрозды
Дачи О.Г.П.У.
Крупцы
Х. Новинки
Сех. Красный Маяк (плодоовощ)
Сех. ОГПУ (жив)
в Радошковичи



Х. Бродок
Х. Подгорное
Военн. лагерь
Станция



72
71
70
69
68
67
Депо
П.Депо
Кирп.
Кирп.
Кирп.
Кирп.
Кирп.
Гараж Союзтранс
Аэродром
Скл.
Раз
ПТС
Грицковщина
Лошица
Пос. Труд
Курасовщина
Х. Юзефово
Сх. Лошица (плодоовощ.)
208.1
223.0
221.4
212.5
219.9
220.0
221.9
251.5
223.2
232.8
в Негорелое
в Негорелое
в Осиповичи
53°
50'
27°
30'
34
35
36
37



ТЭЦ
Будилово
22
Слепенька
2
Столовая
Клх. Червонная Зорька
Шейпичи
7
Лагерь
Шатовка
14
Питомник
Гребельки
16
Клх. им. О. Г. П. У.
Дворище
2
Малявки
34
Шк.
Клх. им. Шаранговича
Лошица
13
Сех. Затишье (огор)
Клх. Пятилетка в 4 года
Корзюки
66
Красная Заря
38
39
55 40
55 42



Подболотье
Копище
Вдкч
Воен. лаг.
Уручье
Торф. разр.
Клх. Большевик
Слепня
Озерище
Колхоз Пром
Картоф. ст.
Сел. им. Буденного (огород)
Вдкч
Раз.
Липки
Смол.
Стрельбище
Арт.
Дражня
Клх. Червона Белорусь

# МІНСК

## на фотаздымках 1920–1940 гадоў



1



2

1. Будынак вакзала ў Мінску. Від з боку чыгуначных пуцей. 1920 г.

Railway station building in Minsk. Side view of rail tracks, 1920

2. На Мінскім вакзале 10 лютага 1936 г. Прыбыццё дэлегатаў з Масквы на Трэці пленум Саюза пісьменнікаў СССР.

Minsk railway station, the 10th of February, 1936. The delegates' arrival from Moskow to the 3rd Congress of USSR Writers Union



3



4

3. Прывакзальная плошча. 1928 г.

Station's square, 1928

4. Прывакзальная плошча. 1935 г.

Station's square, 1935



5

5. Мінскі вакзал пасля рэканструкцыі. 1940 г.

Minsk railway station after reconstruction, 1940



6



7

6. Інтэрнат Беларускага дзяржаўнага універсітэта на Маскоўскай вуліцы. Зараз тут знаходзіцца ваенная кафедра БДУ. 1939 г.

Boarding school of Belarusian State University on Moscow Street. Today, the military chair of Belarusian State University is situated here. 1939

7. Койданаўскі тракт. У студзені 1939 г. перайменаваны ў вуліцу Чкалава. 1926 г.

Koidanawsky highway, 1926



8

8. Прывакзальны раён. Злева былы будынак Казанскай царквы (зараз на яе месцы плошча Мяснікова). 1936 г.

Station's region. To the left, Kazan Church (today, Myasnikova Square is situated here). 1936

9. Будынак былой Казанскай царквы ў 1930-я гг. Зараз на гэтым месцы плошча Мяснікова.

Kazan Church in past. Today, Myasnikova Square is situated here, 1930s



9



10



11

10. Клуб чыгуначнікаў у будынку былой Казанскай царквы. 1933 г.

Railmen's Club in the Kazan Church building, 1933

11. Адзін з карпусоў Беларускага дзяржаўнага універсітэта — былое камерцыйнае вучылішча ў Васілеўскім (пазней Земляробскім) завулку. З лета 1930 г. тут размяшчаўся зноў створаны Беларускі політэхнічны інстытут. 1928 г.

One of the blocks of Belarusian State University, 1928



12

12. Від на Універсітэцкі гарадок. У цэнтры на другім плане — галоўны корпус БДУ (зараз галоўны корпус педагагічнага універсітэта). Відаць, што ён у пэўнай ступені "капіруе" будынак былога камерцыйнага вучылішча, які стаіць побач справа, — пабудаваны таксама ў выглядзе літары "Т", арыентаваны ў тым жа напрамку. Злева на другім плане бачны будынак, дзе зараз размяшчаецца рэктарат БДУ. 1930 г.

View of University Town, 1930

13. На будаўніцтве Універсітэцкага гарадка. 1929 г.

University Town construction, 1929



13



14

14. Група архітэктараў на будаўніцтве Універсітэцкага гарадка паводле праекта Г. Л. Лаўрова. Другі справа Г. Л. Лаўроў. 1930 г.

The architectural group during construction of University Town, 1930



15



16

15,16. Панарама Універсітэцкага гарадка. 1933 г.

Panarama of University Town, 1933



17



18

17. Від на Універсітэцкі гарадок. 1936 г.

View of University Town, 1936

18. «Жыхары» Універсітэцкага гарадка. Канец 1930-х гг.

"Citizens" of University Town. The end of the 1930s



19



20

19. Будынак хімічнага факультэта БДУ. 1936 г.

Belarusian State University chemistry faculty building, 1936

20. Студэнты. Канец 1930-х гг.

Students in University Town. The end of the 1930s



21

21. Універсітэцкі гарадок. Від на Дом урада з боку фантана. 1936 г.

University Town. View of the Government House, 1936



22

22. Будынак хімічнага факультэта БДУ і частка будынка анатамічнага корпуса Медыцынскага інстытута. 1933 г.

Belarusian State University chemistry faculty building and a part of Medical Institute building, 1933



23

23. Фантан у скверы Універсітэцкага гарадка. 1939 г.

Fountain in the public garder of University Town, 1939



24

24. Землябробскі завулак і Дом урада з боку Універсітэцкага гарадка. Верасень 1939 г.

Zemlyarobsky alley and the Government House. September 1939



25

25. У гэтым месцы (адносна Дома ўрада) пачынаўся Землябробскі завулак. 1934 г.

Here, beside the Government House, Zemlyarobsky alley made its start, 1934



26

26. Галоўны корпус БДУ. Захаваўся ў значна перабудаваным выглядзе. Зараз тут галоўны корпус Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта. 1934 г.

The main block of Belarusian State University. Today, Pedagogical University main building is situated here, 1934



27

27. Галоўны корпус БДУ. Двухпавярховы светлы будынак на другім плане дагэтуль захаваўся ў першапачатковым выглядзе. Зараз тут рэктарат БДУ. Пачатак 1930-х гг.

Belarusian State University main building. Beginning of the 1930s



28

28. Галоўны корпус БДУ. Від з боку Дома ўрада. Сярэдзіна 1930-х гг.

Belarusian State University main building. Side view of the Government House, 1930s

29. Від ад галоўнага корпуса БДУ ў бок Дома ўрада. 1935 г.

View from the Belarusian State University main building to the side of Government House, 1935

29





30



31

30. Пяціпавярховы будынак на рагу вуліцы Савецкай і Земляробскага завулка. Былы даходны дом Я. Кастравіцкай, пабудаваны ў 1904 г. У 1920-я гады — Дом металістаў. Знесены ў пасляваенны час. 1928 г.

Five-storey building at the corner of Savetskaya Street and Zemlyarobsky alley, 1928

31. Савецкая вуліца. 1920-я гг.

Savetskaya Street, 1920s



32

32. Дом металістаў з боку Універсітэцкага гарадка. 1930 г.

The House of Metalists. Side view of University Town, 1930



33

33. Будаўніцтва Дома ўрада. Замест пад'ёмных кранаў выкарыстоўвалі прыстасаванні, праверанья стагоддзямі. На здымку будаўнік і яго драўляная "каза", што вытрымала не адну тону цэглы. 1930 г.

Construction of the Government House, 1930



34

34. Пачатак будаўніцтва Дома ўрада. 1929 г.

Beginning of construction of the Government House, 1929



35

35. Будаўніцтва Дома ўрада. Від з даху галоўнага корпуса БДУ. 1933 г.

Construction of the Government House. View from the roof of Belarusian State University main building, 1933



36



37

36. Будаўніцтва Дома ўрада. 1932 г.

Construction of the Government House, 1932

37. Будаўніцтва Дома ўрада. 1932 г.

Construction of the Government House, 1932



38



39

38. Будаўніцтва Дома ўрада. Гужавы транспарт — звыклая з'ява ў цэнтральнай частцы Мінска. 1932 г.

Construction of the Government House, 1932

39. Будаўніцтва Дома ўрада на Савецкай вуліцы. Воддаль бачны Чырвоны касцёл. 1932 г.

Construction of the Government House on Savetskaya Street. In the distance, Red Castle. 1932


40


41

40. Помнік Леніну і Савецкая вуліца. Від з акна левага крыла Дома ўрада, які адкрыўся 7 лістапада 1933 г. Кастрычнік 1935 г.

Monument to Vladimir Lenin and Savetskaya Street. Left wing view from the window of the Government House. October 1935



42

41. Дом урада з боку вуліцы Нова-Маскоўскай (Мяснікова). 1934 г.

The Government House. Side view of Nova-Maskowskaya Street (Myasnikova Street), 1934

42. Стаянка службовых аўтамабіляў кіраўнікоў БССР ля Дома ўрада. 1935 г.

Service car parking lot for the Belarusian Soviet Socialistic Republic authorities near the Government House, 1935



43



44



45

43, 44, 45. Дэманстрацыя ля Дома ўрада. 11 ліпеня 1935 г.

Demonstration procession near the Government House, 1935



46




47



48

46,48. Вайсковы парад ля Дома ўрада з нагоды 20-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. 7 лістапада 1937г.

The military parade near the Government House, devoted to the20th anniversary of theOctober revolution, 7th November 1937

47. На дэманстрацыі каля Дома ўрада. 1937 г.

Demonstration procession near the Government House, 1937



49

49. Парад фізкультурнікаў.
1939 г.

Parade of PE-sportsmen
in 1939




50



51



52

50, 51. На прыпынку трамвая насупраць Чырвонага касцёла. Канец 1930-х гг.

Tram stop in front of Red Castle. The end of the 1930s

52. На дэманстрацыі каля Дома ўрада. 1937 г.

It's demonstration near the Government House, 1937



53




54

53. Дом урада. 1934 г.

The Government House, 1934

54. Транспарант на даху Дома ўрада. 1930-я гг.

The placard is on the roof of Government House: «Workers of the world, unite!», the 1930s




55



56

55. Дом урада. Від з даху галоўнага корпуса БДУ. 1937 г.

The Government House. View from the roof of Belarusian State University main building, 1937

56. Першы Дом Саветаў. Знаходзіўся на вуліцы Савецкай недалёка ад Дома ўрада. 1938 г.

The First Council House, 1938



57



58

57,58. Фабрыка-кухня. Пабудавана ў 1934 г., знаходзілася ў Свярдлоўскім тупіку. Зараз рэстаран "Папараць-кветка". 1936 г.

The kitchen-plant. At present, it is Paparats kvetka restaurant, 1936



59



60

59. Пачатак вуліцы Карла Маркса. Злева дом № 1 – да 1924 г. дом Глухоўскага. Від з вуліцы Свярдлоўскай. 1927 г.

Beginning of Karl Marx Street. View from Svyardlowskaya Street, 1927

60. Ленінградская вуліца. 1940 г.

Leningradskaya Street, 1940



61

61. "Дошка гонару калгасаў" у скверы на рагу вуліц Ленінградскай і Свярдлоўскай. 1940 г.

Honor Board of the kolkhozes in the garden at the corner of Leningradskaya and Svyardlowskaya Streets, 1940




62



63

62. Перакрыжаванне вуліц К. Маркса—Ленінградскай і Свярдлоўскай. У цэнтры — "сталінская" школа № 47 – дзесяцігодка. Будынак захаваўся ў значна перабудаваным выглядзе, зараз у ім адзін з карпусоў Беларускага дзяржаўнага эканамічнага універсітэта. Будынак на другім плане злева, з вежкай, захаваўся (на рагу вул. Кірава іВаладарскага). 1940 г.

Intersection of Karl Marx–Leningradskaya and Svyardlowskaya Streets. Now, one of Belarusian State Economic University buildings is situated here, 1940

63. Дарога на Лошыцу (сёння вул. Маякоўскага). 1930-я гг.

Road to Loshytsa (now Mayakowsky Street), 1930s



64

64. Від з вуліцы К. Маркса ў бок Ленінградскай. 1936 г.

View from Karl Marx Street to the side of Leningradskaya Street, 1936



65

65. Інстытут фізіятрыі і артапедыі, больш вядомы як электраводалячэбніца. Знаходзіўся на вуліцы Валадарскага, № 16 (прыкладна ў раёне сённяшняга магазіна "Глобус"). 1932 г.

The Institute of Physical Therapy and Orthopedics. It was situated on Valadarsky Street, 1932




66

66. Вокладка часопіса "Чырвоная Беларусь". Парад часцей Мінскага гарнізона, прысвечаны X Усебеларускаму з'езду Саветаў. Дом на другім плане захаваўся, знаходзіцца за гасцініцай "Мінск" на вуліцы Валадарскага. Зараз гэтыя дзверы — уваход у гастраном. Люты 1931 г.

Cover of Red Belarus magazine. Parade devoted to the Tenth All-Belarusian Council Meeting. February 1931



67

67. Псіханеўрадыспансер на вуліцы Валадарскага, № 16 пасля надбудовы аднаго паверха. 1938 г.

Psychoneurologic dispensary on Valadarsky Street, building 16, 1938


68


69

68. Пракладка трамвайных рэек па вуліцы Валадарскага. 1933 г.

Laying of tram battens on Valadarsky Street, 1933

69. Пасёлак Дуброўка (сёння раён Камвольнага камбіната). 1926 г.

Dubrowka village (today, it is the region of Worsted Combine), 1926



70

70. Перакрыжаванне вуліц Валадарскага і Савецкай. Дом злева захаваўся – знаходзіцца за гасцініцай "Мінск" (на вуліцы Валадарскага). Трамвай на другім плане ідзе па маршруту Старажоўка–Вакзал. 1938 г.

Intersection of Valadarsky and Savetskaya Streets, 1938



71

71. Былы будынак харальнай сінагогі на вуліцы Серпухаўскай. Пабудавана ў канцы XIX ст. у маўрытанскім стылі. У 1923 г. пераабсталявана пад рабочы клуб, пазней на яго базе быў адкрыты Дом культуры сакратарыята ЦВК імя М.В. Фрунзе. У 1926 г. тут стаў працаваць кінатэатр "Культура". У 1920-я гады тут выступалі Уладзімір Маякоўскі, Ірма Яўнзем, Леанід Уцёсаў. У 1930-я гады ў будынку знаходзіўся Дзяржаўны яўрэйскі тэатр. Пасля вайны быў перароблены. Зараз тут Дзяржаўны рускі драматычны тэатр. 1929 г.

Chorus synagogue building on Serpukhawskaya Street. Now, the State Russian Drama Theatre is situated here, 1929



72



73

72. Дзяржаўны яўрэйскі тэатр на вуліцы Валадарскага. 1932 г.

The State Jewish Theatre, Valadarsky Street, 1932

73. Мітынг каля Дзяржаўнага яўрэйскага тэатра, прысвечаны вайне ў Іспаніі. 1936 г.

Mass-meeting near State Jewish Theatre, devoted to the war in Spain. Inscription: "It's better to be a Hero's widow than to be caward's wife", 1936



74



75

74. Татарская слабада. Від з Замкавай гары (ад плошчы Свабоды). 1926 г.

Tatar Slabada. View from the Castle's Mountain (from Svaboda Square), 1926

75. Касцёл на Кальварыйскіх могілках. 1920-я гг.

Castle on Kalvariyskaya churchyard, 1920s



76



77

76. Драўляная маставая
на вуліцы Няміга. 1923 г.

Wooden pavement on
Nyamiga Street, 1923

77. Вуліца Няміга. 1926 г.

Nyamiga Street, 1926



78

78. Вуліца Дзям'яна Беднага, былая Касмадзям'янская. Ішла ад Кафедральнага сабора ўніз да Нямігі. 1931 г.

Dyamyan Bedny Street, the former Kazmadzyamyanawskaya Street, 1931




79

79. Жылы дом на рагу вуліц Рэспубліканскай і Рэвалюцыйнай. 1934 г.

Dwelling at the corner of Respublikanskaya and Revalutsyinaya Streets, 1934



80



81

80. Участак вуліцы Валадарскага ад вуліцы К. Маркса да вуліцы Кірава ў хуткім часе пасля заканчэння ваенных дзеянняў. 1920 г.

A part of Valadarsky Street from Carl Marx Street to Kirava Street, 1920

81. Будынак НКУС БССР на вуліцы Савецкай. Зараз будынак Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь на рагу праспекта Скарыны і вуліцы Гарадскі Вал. 1930-я гг.

Building on Savetskaya Street. Today, it is the Ministry of Internal Affairs of the Republic of Belarus building at the corner of Skaryna Avenue and Garadsky Val Street, 1930s



82



83

82. Гасцініца "Беларусь" на рагу вуліц Валадарскага і Кірава, зараз – гасцініца "Свіслач". 1940 г.

Belarus hotel at the corner of Valadarsky and Kirava Streets. Now, it is Svislach hotel, 1940

83. Гасцініца "Беларусь". Від з вуліцы Валадарскага. 1940 г.

Belarus hotel. View from Valadarsky Street, 1940



84



85

84. Стадыён "Дынама" — трыбуна з урадавай ложай (адкрыўся 12 чэрвеня 1934 г.). Дом на заднім плане захаваўся (знаходзіцца на рагу вуліц Кірава і Камсамольскай). 1936 г.

Dynama stadium — a tribune with the governmental box, 1936

85. Гледачы на стадыёне «Дынама». 1936 г.

Spectators on Dynama stadium, 1936



86



87

86. Буфет на стадыёне "Дынама". 1938 г.

Snack bar on Dynama stadium. 1938

87. Вядомая спартыўная фігура «Ваза» ў выкананні мінскіх прыхільнікаў спорта. Стадыён «Дынама». 1936г.

The famous figure "Vase" made by Minsk sportsmen. Dynama stadium, 1936



88

88. Валейбольная пляцоўка
на стадыёне "Дынама".
1936 г.

Volleyball yard on Dynama
stadium, 1936




89

89. Ад разліваў Свіслачы цярпелі ў большасці нізінныя раёны, накшталт Ляхаўкі. Штогод увесну прэса адлюстроўвала вынікі паводкі (з часопіса "Чырвоная Беларусь", № 10, 1931 г.).

Svislach flood, 1931



90

90. Ляхаўскі раён. Від на вуліцы Беларускую (на пярэднім плане) і Ніжне-Ляхаўскую (цяпер Кастрычніцкая). Удалечыні дражджавы завод "Чырвоная зорка" і гарбарны "Бальшавік". Здымак зроблены з гары, дзе ў пачатку 1930-х гг. пачалі будаваць стадыён "Дынама". 1920-я гг.

Lyakhawsky region. View of Belaruskaya Street (on the foreground) and Nizhne-Lyakhawskaya Street (now Kastrychnitskaya Street), 1920s



91

91. Вуліца Універсітэцкая (з 22 снежня 1934 г. — імя Кірава). Від з боку гары, на якой пазней пабудавалі стадыён "Дынама". Дом злева захаваўся ў першапачатковым выглядзе. 1927 г.

View of Universitetskaya Street (now Kirava Street), 1927



92

92. Аўтаматычная тэлефонная станцыя. Здадзена ў эксплуатацыю ў лістападзе 1932 г. Знаходзілася на вуліцы К. Маркса недалёка ад перакрыжавання з вуліцай Валадарскага. Разбурана ў час вайны. Цяпер на гэтым месцы жылы дом, на першым паверсе якога ашчадны банк. 1934 г.

Automatic telephone station. It was situated on Karl Marx Street, not far from intersection with Valadarsky Street, 1934



93

93. Асфальтаванне вуліцы К. Маркса побач з АТС. 1936 г.

Asphalt laying on Karl Marx Street, 1936



94

94. Вуліца К. Маркса.
Удалечыні відаць дамы
на вуліцы Ленінградскай.
1930-я гг.

Carl Marx Street.
Leningradskaya Street
buildings are seen
in the distance, 1930s



95

95. Вуліца К. Маркса. У другім будынку справа ў 1920-я — пачатку 30-х гадоў размяшчаўся Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі. Цяпер тут Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі. 1939 г.

Carl Marx Street. Now, the National Museum of History and Culture of Belarus is here, 1939



96

96. Вуліца К. Маркса.
Від ад будынка, дзе сёння размешчаны Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі. 1938 г.

Carl Marx Street, 1938



97

97. Будынак Наркамата лясной прамысловасці (Дом Наркамлесу). Від з вуліцы К. Маркса. 1939 г.

The Ministry of Wood Industry building. View from Carl Marx Street, 1939




98

98. Перакрыжаванне вуліц К. Маркса і Камсамольскай, удалечыні вуліца Кірава. Будуецца Дом Наркамлесу. Пасля вайны часткова перабудаваны. 1937 г.

Intersection of Carl Marx and Kamsamolskaya Streets, with Kirava Street in the distance, 1937



99

99. Вуліца Камсамольская. Удалечыні на вуліцы Універсітэцкай (Кірава) відаць радыёмачту. Дом, што будуецца, захаваўся. У 2001 г. скончана яго рэканструкцыя. Здымак зрабіў вядомы беларускі фотамайстар Леў Дашкевіч. 1929 г.

Kamsamolskaya Street, 1929



100

100. Мінскі ГУМ, пачаў працаваць 28 мая 1934 г. Знаходзіўся на рагу вуліц Савецкай і Камсамольскай. Цяпер прыкладна на гэтым месцы вугал будынка КДБ. 1936 г.

Minsk City Supermarket (GUM) began working on May 28, 1934. It was situated at the corner of Savetskaya and Kamsamolskaya Streets, 1936



101

101. Рэканструкцыя Савецкай вуліцы на ўчастку ад вуліцы Камсамольскай да Ленінскай. Лета 1931 г.

Reconstruction of Savetskaya Street in the place from Kamsamolskaya Street to Leninskaya Street. Summer 1931



102

102. Пракладка каналізацыйных труб па Савецкай вуліцы на ўчастку ад вуліцыЛенінскай да Камсамольскай. Лета 1928г.

Sewer-pipe drain laying on Savetskaya Street from Leninskaya to Kamsamolskaya streets. Summer 1928




103

103. "Новы Менскператварае былую Захар'еўскую ў сапраўды Савецкую вуліцу" (з часопіса "Чырвоная Беларусь"). Лета 1931 г.

Photo commentary from Red Belarus magazine: New Mensk is turning the former Zakhariewskaya into a real Sawetskaya Street. Summer 1931



104

104. Савецкая вуліца.
На месцы дамоў злева
цяпер Цэнтральная
кнігарня. 1930-я гг.

Savetskaya Street, 1930s



105

105. Дэманстрацыя 1 мая 1932 г. Калона рухаецца ў бок Дома ўрада па Савецкай вуліцы. Першы і другі будынкі справа знаходзяцца на перакрыжаванні з Камсамольскай вуліцай.

Demonstration procession on May 1, 1932



106

106. Дом на рагу вуліц Камсамольскай і Універсітэцкай (Кірава). 1929 г.

Building at the corner of Kamsamolskaya and Universitetskaya (now Kirava) Streets, 1929



107

107. Дом на рагу вуліц Універсітэцкай (Кірава) і Камсамольскай. 1930 г.

Building at the corner of Universitetskaya (Kirava) and Kamsamolskaya Streets, 1930



108

108. Вуліца К. Маркса, бачна перакрыжаванне з Камсамольскай. Будынак справа захаваўся. 1934 г.

Carl Marx Street. Its intersection with Kamsamolskaya is seen from here, 1934



109

109. Пачатак будаўніцтва дома на вуліцы К. Маркса, у якім на працягу дзесяцігоддзяў змяшчалася Вышэйшая партыйная школа (ВПШ), цяпер філалагічны факультэт Белдзяржуніверсітэта. 1935 г.

Beginning of a house construction on Carl Marx Street. Now, here is Belarusian State University philological faculty, 1935



110

110. Вуліца К. Маркса. Справа заканчваецца будаўніцтва ВПШ. 1939 г.

Carl Marx Street, 1939



111

111. Вуліца К. Маркса. Від на ВПШ. Снежань 1940 г.

Carl Marx Street. December 1940



112

112. Вуліца К. Маркса. Від на ВПШ. 1940 г.

Carl Marx Street, 1940



113

113. Вуліца К. Маркса. Від на ВПШ. Май 1941 г.

Carl Marx Street. May 1941



114

114. Будынак Белкамунбанка на рагу вуліц К. Маркса і Ленінскай. Пабудаваны ў 1928 г. Панарамны здымак 1932 г.

Bank building at the corner of Carl Marx and Leninskaya Streets, 1932



115

115. Вуліца Ленінская з боку Першамайскай. Удалечыні на ўзгорку будынак Белкамунбанка. 1930-я гг.

Leninskaya Street from the side of Pershamaiskaya Street, 1930s



116

116. Святочная дэманстрацыя і гулянне на перакрыжаванні вуліц Ленінскай і К.Маркса. 1939 г.

Holiday demonstration and celebration at the intersection of Leninskaya and Carl Marx Streets, 1939



117

117. Будынак Белдзяржкіно на вуліцы К. Маркса, пасля вайны перабудаваны. Цяпер тут знаходзяцца пасольствы Вялікабрытаніі і Італіі. 1935 г.

The Belarusian State Cinema building on Carl Marx Street. Today, here are the embassies of Great Britain and Italy, 1935




118

118. Вуліца Ленінская. Від з вуліцы К. Маркса. Пачатак 1930-х гг.

Leninskaya Street. View from Carl Marx Street. Beginning of the 1930s



119

119. Вуліца Ленінская. Від з боку плошчы Свабоды. 1930 г.

Leninskaya Street. View from the side of Svaboda Square, 1930



120



121

120. Міліцыянер-рэгуліроўшчык на рагу вуліц Ленінскай і Савецкай. Від вуліцы Ленінскай у бок плошчы Свабоды. 1932 г.

A policeman-regulator standing at the corner of Leninskaya and Savetskaya Streets.

121. Плошча Свабоды. Від з даху гасцініцы "Еўропа". 1940 г.

Svaboda Square, 1940




122

122. Гасцініца "Еўропа". Справа — званіца сабора былога жаночага Праабражэнскага манастыра. Цяпер на яго месцы знаходзяцца кінатэатр "Пабеда" і Пракуратура Рэспублікі Беларусь. Сярэдзіна 1920 - х гг.

Europe hotel. To the right, Women's Transfiguration Monastery church-tower. Now, Pabeda cinema and the Public Prosecutions Department of the Republic of Belarus are situated here. Middle of the 1920s



123

123. Гасцініца "Еўропа". 1938 г.

Europe hotel, 1938

124. Жаночы Праабражэнскі манастыр. Від з боку плошчы Свабоды. 1925 г.

View of Women's Transfiguration Monastery from Svaboda Square, 1925

124





125



126

125. Дом Саветаў на плошчы Свабоды, былы дом губернатара. Убраны жалобнымі транспарантамі ў памяць забітых правадыроў камуністаў Германіі Розы Люксембург і Карла Лібкнехта. Студзень 1919 г.

The Council House on Svaboda Square, the former house of the governor. January 1919

126. Дэманстрацыя на плошчы Свабоды. Пачатак 1920-х гг.

Demonstration procession on Svaboda Square. Beginning of the 1920s



127

127. Будынак Цэнтральнага выканаўчага камітэта (ЦВК) БССР на плошчы Свабоды. Убраны транспарантамі з нагоды 15-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. 1932 г.

The Central Executive Committee (CEC) building of the Belarusian Soviet Socialistic Republic on Svaboda Square, 1932



128

128. Дэманстрацыя на плошчы Свабоды з нагоды сесіі ЦВК БССР. Від з акна будынка ЦВК. 1925 г.

Demonstration procession on Svaboda Square, 1925



129



130

129. Дом "Белмедгандлю" на плошчы Свабоды — справа, пачатак вуліцы Школьнай (сёння тут пачынаецца пуцеправод да праспекта Машэрава) — злева. 1930-я гг.

To the right, Belarusian Medicine Trade house on Svaboda Square, to the left, beginning of Shkolnaya Street. Today, the bridge to Masherava Avenue makes its start here, 1930s

130. Плошча Свабоды. 1932 г.

Svaboda Square, 1932



131



132

131,132. Плошча Свабоды,
7 лістапада 1936 г.:
удзельнікі дэманстрацыі
ў гонар 19-й гадавіны
Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Svaboda Square.
November 7, 1936



133




134

133. Плошча Свабоды. 1937 г.

Svaboda Square, 1937

134. Агітацыйная стэндавая ўстаноўка на плошчы Свабоды. 1937 г.

Agitation stand setting on Svaboda Square, 1937



135

135. Будынак былога гасцінага двара на плошчы Свабоды. У 1920-я — пачатку 30-х гадоў тут размяшчаўся Мінскі гарсавет. Зараз вядзецца рэканструкцыя дома. 1924 г.

Construction of the former hotel garden on Svaboda Square, 1924



136

136. Фантан у скверы
на плошчы Свабоды. 1936 г.

Fountain in the yard of
Svaboda Square, 1936




137

137. Дом працы на плошчы Свабоды. Цяпер Дом прафсаюзаў Мінскай вобласці. 1932 г.

The Working House on Svaboda Square. Now here is the House of Professional Unions of the Minsk region, 1932



138

138. Вуліца Савецкая (праспект Ф. Скарыны). На месцы дамоў злева цяпер знаходзіцца ГУМ. Справа — былая гасцініца "Нова-Маскоўская", далей новы будынак Дзяржаўнага банка БССР, за ім — кінатэатр "Чырвоная зорка". Надпіс на афішы: "Ціхі Дон". На доме справа прымацавана таблічка: "Пешаходны рух толькі па тратуарах". Злева натоўп "штурмуе" трамвай № 7. 1930-я гг.

Savetskaya Street (F. Skaryna Avenue). To the right, the former Nova-Maskowskaya hotel. Further, a new building of the Belarusian Soviet Socialistic Republic State Bank. Behind, it is Red Star cinema, 1930s



139

139. Вайсковая аўтакалона рухаецца па Савецкай вуліцы. 1 мая 1935 г.

Troop motorcade is moving along Savetskaya Street. May 1, 1935

140. Гутарка на Савецкай вуліцы. 1935 г.

Conversation on Savetskaya Street, 1935

140





141

141. Будаўніцтва Дзяржбанка на Савецкай вуліцы. 1931 г.

Construction of the State Bank on Savetskaya Street, 1931



142

142. Вуліца Савецкая на перакрыжаванні з Ленінскай. Злева ўзводзіцца будынак Дзяржаўнага банка БССР. 1931 г.

Savetskaya Street at the intersection with Leninskaya Street. To the left, Belarusian Soviet Socialistic Republic State Bank under construction, 1931



143



144

143. Дзяржбанк на рагу Савецкай і Ленінскай вуліц. 1932 г.

The State Bank at the corner of Savetskaya and Leninskaya Streets, 1932

144.Участак вуліцы Савецкай паміж вуліцамі Ленінскай і Энгельса. 1937 г.

A part of Savetskaya Street between Leninskaya and Engels Streets, 1937



145

145. Перакрыжаванне Савецкай і Ленінскай вуліц (цяпер пр. Ф. Скарыны і вул. Леніна). На месцы будынка справа сёння стаіць ГУМ. 1930-я гг.

Intersection of Savetskaya and Leninskaya Streets (now — of Skaryna Avenue and Lenin Street), 1930s

146. Кінатэатр "Чырвоная зорка". 1933 г.

Red Star cinema, 1933




146




147

147. Савецкая вуліца. Першы ў Беларусі гукавы кінатэатр "Чырвоная зорка". 1932 г.

Savetskaya Street. The first sound cinema in Belarus — Red Star, 1932



148

148. Першы ў Беларусі дзіцячы гукавы кінатэатр "Новости дня". Быў змешчаны ў былым будынку лютэранскай кірхі на Савецкай вуліцы побач з кінатэатрам "Чырвоная зорка". 1936 г.

Day News, the first sound children's cinema, 1936



149. Від ад дзіцячага кінатэатра. На процілеглым баку Савецкай вуліцы знаходзіліся магазін "Садавіна, гародніна" і Дом Галоўхімзбыту. 1937 г.

View from the children's cinema, 1937

149



150

150. Уваход у Вялікі сад — сённяшні Цэнтральны сквер на рагу праспекта Ф. Скарыны і вуліцы Энгельса. Від з вуліцы Савецкай. 1933 г.

Entrance to the Great Garden, today's Central Yard, at the corner of F.Skaryna Avenue and Engels Street, 1933





151

151. Савецкая вуліца і ўваход у Цэнтральны сквер. Від з вуліцы Энгельса. 1938 г.

Savetskaya Street and entrance to the Central yard. View from Engels Street, 1938



152



153

152. Забудова вуліц Энгельса і Савецкай ля іх скрыжавання (не захавалася). Сёння на месцы гэтага квартала плошча і Палац Рэспублікі. 1938 г.

Construction of Engels and Savetskaya Streets near their intersection. Today, here is the square and Palace of the Republic, 1938

153. Перакрыжаванне вуліц Савецкай і Энгельса. Тут 7 снежня 1935 г. быў устаноўлены першы ў Мінску электрычны гадзіннік.

Intersection of Savetskaya and Engels Streets



154

154. Трамвайная лінія на Ляхаўку праходзіла па вуліцы Энгельса. Від на Першы беларускі дзяржаўны драматычны тэатр (цяпер імя Янкі Купалы). 1930-я гг.

Tramway to Lyakhawka passed through Engels Street. View of the First Belarusian State Drama Theatre (now it is Ya. Kupala's Theatre), 1930s



155

155. Цэнтральны Дом камуністычнай асветы імя К. Маркса на рагу вуліц Маркса і Энгельса (раней у будынку змяшчаўся Дваранскі сход). Цяпер на гэтым месцы ўваход у метро "Купалаўская". Пачатак 1930-х гг.

The Central House of Communist Enlightening named after Carl Marx at the corner of Marx and Engels Streets. Beginning of the 1930s



156



157

156. Адкрыццё помніка на скрыжаванні вуліц Маркса і Энгельса 7 лістапада 1922 г.

Opening of the monument at the intersection of Marx and Engels Streets. November 7, 1922

157. Перад урачыстым адкрыццём помніка Карлу Марксу ля гарадскога тэатра з нагоды 5-й гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. 7 лістапада 1922 г.

Before the festive opening of the monument to Carl Marx. November 7, 1922



158

158. Фасад I-га Белдзяржрамтэатра (цяпер імя Янкі Купалы) і помнік Карлу Марксу (знесены ў час пракладкі трамвайнай лініі на Ляхаўку). 1931 г.

Facade of the First State Drama Theatre (now – Ya.Kupala's Theatre) and monument to Carl Marx, 1931



159

159. Палац піянераў на рагу вуліц Кірава і Энгельса. Пачаў дзейнічаць у 1936 г. Цяпер між калонамі – уваход у Тэатр юнага гледача.

The Pioneers' Palace at the corner of Kirava and Engels Streets. Now, in between their columns, entrance to the Theatre of Young Spectator is situated



160

160. Вуліца Энгельса ў бок Ляхаўкі. Побач з Палацам піянераў ідзе трамвай № 5, маршрут: "Выстаўка (сёння раён плошчы Калініна) — завод імя Варашылава". 1938 г.

Engels Street to Lyakhawka, 1938



161

161. Завод імя Варашылава (былы "Энергія"). 1930-я гг.

Plant named after Varashylaw (the former Energia), 1930s



162

162. Адзін з карпусоў гарбарнага завода "Бальшавік". У 1938 г. тут упершыню ў Савецкім Саюзе пачалі вырабляць высакаякасны хром са свіных шкур. 1930-я гг.

One of the Bolshevik pottery buildings, 1930s



163

163. Дражджавы завод
"Чырвоная зорка".
1930-я гг.

Red Star yeast plant, 1930s



164

164. Цукерачная фабрыка "Камунарка". 1930-я гг.

Kamunarka sweet plant, 1930s




165



166

165. Святкаванне 1 Мая на цукерачнай фабрыцы "Камунарка". 1930-я гг.

Celebration of the first of May at Kamunarka sweet plant, 1930s

166. Кінатэатр "Пралетарый", з 1938 года — "Радзіма". Від са сквера. 1934 г.

Proletarian cinema. From 1938 — Radzima, 1934



167

167. Выхад са сквера да Дома селяніна. Калі выгляд адміністрацыйных будынкаў за апошнія 70 год не вельмі змяніўся, то "архітэктура кіёскаў" крочыла далёка наперад — гэта відавочна. 1929 г.

Exit from the yard to the House of Villager, 1929




168

168. Будынак ЦК КП(б)Б,
былы Дом селяніна.
1930-я гг.

The Central Committee
of the Communistic Party
of Belarus building,
the former House of Villager,
1930s



169

169. Будынак Саўнаркома БССР, былы Архірэйскі дом. Пасля пераезда ў 1933–1934 гг. Саўнаркома ў Дом урада будынак быў перабудаваны для Дома Чырвонай Арміі. 1930 г.

The BSSR Soviet People's Committee building, the former House of the Member of higher orders of clergy, 1930



170



171

170. Дом Чырвонай Арміі. Від з вуліцы К. Маркса. 1937 г.

The Red Army House. View from Carl Marx Street, 1937

171. Пачатак будаўніцтва Дома Чырвонай Арміі. 1934 г.

Beginning of construction of the Red Army House, 1934



172



173

172. Басейн у Доме Чырвонай Арміі.1936г.

Swimming-pool in the Red Army House, 1936

173. На спаборніцтвах па плаванню ў басейне ДомаЧырвонай Арміі.1938г.

Swimming competitions in the Red Army House, 1938



174



175

174. Вуліца Чырвонаармейская. Від ад Дома Чырвонай Арміі. 1937 г.

Chyrvonaarmeiskaya Street. View from the Red Army House, 1937

175. Від ад Дома Чырвонай Арміі ў бок Савецкай вуліцы. 1940 г.
View of Savetskaya Street from the Red Army House, 1940



176



177

176. Дом Чырвонай Арміі. 1940 г.

The Red Army House, 1940

177. Каля Дома Чырвонай Арміі. 1939 г.

Near the Red Army House, 1939



178



179

178. Чырвонаармейская вуліца. Новы будынак Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна, уступіў у строй у лістападзе 1931 г. На другім плане — ЦК КП(б)Б. 1930-я гг.

Chyrvonaarmeiskaya Street. Belarusian State Library new building, 1930s

179. Студэнткі пасля наведвання «Ленінкі».

Girl-students after visiting theState Library. The end of the 1930s.



180

180. Чырвонаармейская вуліца. 1940 г.

Chyrvonaarmeiskaya Street, 1940



181

181. Помнік Леніну і Сталіну побач з Беларускай дзяржаўнай бібліятэкай імя У. І. Леніна быў пастаўлены ў другой палове 1930-х гадоў. На другім плане злева сярэдняя школа (цяпер № 4). У аднапавярховым будынку справа ў 1870-я гады жыў вядомы герой руска -турэцкай вайны генерал-лейтэнант М. Дз. Скобелеў. Вуліцу Кашарскую, на якой стаяў дом, у 1890-я гады перайменавалі ў Скобелеўскую (цяпер Чырвонаармейская). 1939 г.

Monument to Lenin and Stalin near Belarusian State Library named after V.I.Lenin. On the other side secondary school (now – № 4), 1939



182

182. Помнік Леніну і Сталіну ля Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна. 1940 г.

Monument to Lenin and Stalin near Belarusian State Library named after V.I.Lenin, 1940



183

183. Помнік Леніну ў файе Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна. Зараз на гэтым месцы спуск у падвальнае памяшканне (гардэроб). 1936 г.

Monument to Lenin in the foyer of Belarusian State Library named after V.I.Lenin, 1936



184

184. Галоўная лесвіца Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна. 1936 г.

Main staircase of Belarusian State Library named after V.I.Lenin, 1936



185

185. Калідор на першым паверсе Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна. Тут і зараз перыядычна рыхтуюцца выставы. 1936 г.

Hall on the first floor of Belarusian State Library named after V.I.Lenin, 1936



186

186. Галоўная чытальная зала Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі імя У. І. Леніна. 1936 г.

Main reading hall of Library named after V.I.Lenin, 1936



187



188

187. На другім плане дом, які стаяў на рагу вуліц К. Маркса і Чырвонаармейскай. 1930-я гг.

House at the corner of Carl Marx and Chyrvonaarmeiskaya Streets, 1930s

188. "Ля дзяржаўнай бібліятэкі высаджан кветкамі контур самалёта. На крылах з кветак жа зроблена надпіс "ІОСІФ СТАЛІН". Разбіўкай клумб кіравала інжынер трэста зялёнага будаўніцтва т. Ірына Мешачок" ("Звязда", 1 верасня 1935 г.).

Near Belarusian State Library named after V.I.Lenin, 1935



189

189. Беларуская дзяржаўная бібліятэка імя У. І. Леніна. 1933 г.

Belarusian State Library named after V.I.Lenin, 1933



190

190. Уваход у сярэднюю школу "капіруе" суседні, "бібліятэчны". 1930-я гг.

Entrance to secondary school (now – a school № 4), 1930s



191

191. Шлях да ведаў у стылі 1930-х гг.

A way for knowledge in a style of the 1930s



192

192. Пад'ём па Чырвонаармейскай да Беларускай дзяржаўнай бібліятэкі (з боку вул. Першамайскай). Возчык – "рэдкая птушка" у эпоху трамваяў. 1937 г.

Ascent along Chyrvonaarmeiskaya to Belarusian State Library named after V.I.Lenin (from the side of Pershamaiskaya Street), 1937



193



194

193. Вуліца Савецкая. Педагагічны тэхнікум . 1925 г.

Savetskaya Street. Pedagogical Technical School, 1925

194. Пракладка трамвайнай лініі. Участак сучаснага праспекта Ф. Скарыны ад Палаца прафсаюзаў уніз да цырка. Лета 1929 г.

Tramline laying. A part of present F.Skaryna Avenue from the Palace of Professional Unions down to the circus. Summer, 1929



195



196

195. Першы мінскі трамвай на новым мосце, які спецыяльна быў пабудаваны для трамвайнага руху (на Бакунінскай вул.). На месцы драўляных дамоў на другім плане цяпер знаходзіцца выставачны комплекс на вуліцы Я. Купалы, злева — 2-я клінічная бальніца. Восень 1929 г.

The first Minsk tram on a new bridge. Autumn, 1929

196. Новы трамвайны мост праз Свіслач. 1929 г.

New tram bridge through Svislach, 1929



197



198

197,198. Лодачная станцыя. Пабудавана ў маі 1935 г. у садзе "Профінтэрн" (з 1936 г. — парк імя Горкага). Знаходзілася прыкладна пасярэдзіне участка ракі паміж мостам — увaходам з вуліцы К. Маркса і мостам па вуліцы Першамайскай. 1940 г.

Boat station, 1940



199

199. Сад "Профінтэрн". Від на трэк. 1927 г.

Profintern garden. View to track, 1927



200




201

200. Сад "Профінтэрн". Галоўная алея. 1932 г.

Profintern garden. Main alley, 1932

201. Уваход у сад "Профінтэрн" (мост) з вуліцы К.Маркса. 1931 г.

Entrance to Profintern garden (bridge) from Carl Marx Street, 1931



202



203

202. Парк імя Горкага, стадыён. 1938 г.

Gorky Park. Stadium, 1938

203. Адпачынак у парку імя Горкага. 1938 г.

Resting in Gorky Park, 1938



204



205

204. Парк імя Горкага. Павільён "Марожанае". 1938 г.

Gorky Park. Ice-cream pavilion, 1938

205. Ля фантана ў парку імя Горкага. 1937 г.

Near the fountain in Gorky Park, 1937



206

206. Электрастанцыя №1 на Савецкай вуліцы. Сучасны ўчастак праспекта Ф. Скарыны паміж цыркам і мостам праз Свіслач. 1930-я гг.

Electrical station № 1 on Savetskaya Street. The present part of Skaryna Avenue between the circus and the bridge through Svislach, 1930s



207



208

207. Будаўніцтва рэзервуара для вады побач з электрастанцыяй № 1.

Construction of the reservoir for water near with electrical station on Savetskaya Street, 1927

208. Разліў Свіслачы ў раёне электрастанцыі № 1 на Савецкай вуліцы. 1930-я гг.

A flood in the area of electrical station on Savetskaya Street. The 1930s



209

209. 2-я клінічная бальніца на скрыжаванні вуліц М. Горкага і Пралетарскай (Я. Купалы). 1930-я гг.

The Second Hospital at the intersection of Gorky and Praletarskaya (Ya.Kupala) Streets, 1930s



210



211

210. Першы ў Мінску жалезабетонны мост праз Свіслач на Савецкай вуліцы. Адсюль пачалася пракладка трамвайных рэек у верасні 1928 г.

The first in Minsk Ferroconcrete Bridge through Svislach on Savetskaya Street

211. Аўтобус на Савецкай вуліцы (сёння раён цырка). 1927г.

A bus on Savetskaya Street (the present area of the circus), 1927



212

212. Трэці Дом Саветаў на перакрыжаванні вуліц М. Горкага з Пралетарскай (Я. Купалы), захаваўся. 1936 г.

The Third Council House at the intersection of Gorky and Praletarskaya (Ya.Kupala) Streets, 1936



213



214

213, 214. Дзяржаўны тэатр оперы і балета. Пабудаваны ў 1938 г.

State Theatre of Opera and Ballet. It was built in 1938



215



216

215, 216. Такой бачылі будучыню сучаснага раёна плошчы Перамогі сталічныя архітэктары напярэдадні вайны. 1940 г.

Present region of Peramoga Square was planned in this way by the architects before the war, 1940



217

217. Дом-музей I-га з'езда РСДРП. 1930-я гг.

House-museum of the First Congress of the Russian Social-Democratic Labor Party, 1930s



218

218. Радыёзавод на вуліцы Чырвонай (сённяшні "Гарызонт"). 1940 г.

Radio-plant on Chyrvonaya Street (today's Garyzont plant), 1940



219

219. Піўзавод "Беларусь" на вуліцы М. Горкага. 1930-я гг.

Brewery plant Belarus on Gorky Street, 1930s



220

220. Царква на Старажоўскіх могілках. Фатограф — Леў Дашкевіч. 1920-я гг.

Church on Starazhowskiye cemetery, 1920s



221

221. Такім планавалі зрабіць раён Камсамольскага возера, у прыватнасці, пабудаваць стадыён-падкову на 10 тысяч месц з тым, каб гледачы мелі магчымасць назіраць за грабнымі спаборніцтвамі. 1940 г.

Kamsamolskaye Lake region was seen in this way in 1940



222

222. Залатагорскі касцёл. Від з боку недабудаванага да рэвалюцыі трамвайнага парку (у раёне сучаснага тралейбуснага дэпо на вул. Варвашэні). 1920-я гг.

Zalatagorsky Castle. View from the side of the tram park that was unfinished before the revolution (in the region of the present trolleybus park on Varvasheny Street), 1920s



223

223. Укладка драўляных водаправодных труб на вуліцы Даўмана. Будынкі на другім плане ў цэнтры часткова захаваліся. 1933 г.

Laying of wooden water pipes on Dawman Street, 1933



224

224. Новы 24-кватэрны дом на Даўгабродскай вуліцы, пабудаваны для супрацоўнікаў кінастудыі "Советская Белоруссия". Жнівень 1939 г.

New 24-apartment house on Dawgabrodskaya Street. August 1939



225

225. Школа на Савецкай вуліцы. Цяпер сярэдняя школа № 23. 1940 г.

School on Savetskaya Street. Now, it is secondary school № 23, 1940



226

226. Дом спецыялістаў. Від з боку сучаснай плошчы Перамогі. 1939 г.

The House of Specialists. View from the side of present Peramoga Square, 1939



227



228

227. Дом спецыялістаў на рагу Савецкай і Даўгабродскай вуліц. Разбураны ў пачатку вайны. 1937 г.

The House of Specialists at the corner of Savetskaya and Dawgabrodskaya Streets, 1937

228. У час вучэнняў па грамадзянскай абароне ў Мінску. 1939 г.

It's during military stadies in Minsk, 1939



229

229. Від ад Дома спецыялістаў у бок сучаснай плошчы Перамогі. 1937 г.

View from the House of Specialists to the side of present Peramoga Square, 1937



230

230. Жылы дом на Савецкай вуліцы. Знаходзіўся побач з Домам спецыялістаў (амаль насупраць). Захаваўся ў першапачатковым выглядзе (пр. Ф. Скарыны, № 43). 1940 г.

Dwelling on Savetskaya Street, 1940



231



232

231, 232. Такім планавалі зрабіць сучасны ўчастак ад плошчы Перамогі да плошчы Я. Коласа мінскія архітэктары ў 1940 г.

Present part from Peramoga Square to Ya.Kolas Square was planned in this way by Minsk architects in 1940



233

233, 234. Інстытут фізкультуры на развілцы Лагойскага тракту і Пушкінскай вуліцы (зараз плошча Я. Коласа). 1939 г.

Physical Culture Institute on the road fork of Lagoisky highway and Pushkinskaya Street (now — Ya.Kolas Square), 1939



234



235

235. Будаўніцтва Політэхнічнага інстытута. Сярэдзіна 1930-х гг.

Construction of Polytechnic Institute in the middle of the 1930s



236

236. Будаўніцтва Політэхнічнага інстытута. Від з боку Клінічнага гарадка (цяпер 1-я клінічная бальніца). Сярэдзіна 1930-х гг.

Construction of Polytechnic Institute. View from the side of Hospital town (now – the First Hospital), in the middle of the 1930s



237

237. Клінічны гарадок. Сярэдзіна 1930-х гг.

Hospital town in the middle of the 1930s



238



239

238. Будаўніцтва Дома друку на вуліцы Пушкінскай (цяпер знаходзіцца на рагу праспекта Ф. Скарыны і вул. Сурганава). 1933 г.

Construction of Printing House on Pushkinskaya Street (now it is situated at the corner of Skaryna Avenue and Surganaw Street), 1933

239. Дом друку. 1940 г.

The Printing House, 1940



240

240. Сённяшні будынак Мінскага політэхнічнага каледжа напрыканцы 1930-х гг.

Today's Minsk Polytechnic college building in the end of the 1930s



241

241. Усебеларускі стадыён
у раёне сучаснага Палаца
воднага спорту,
ля Батанічнага сада.
Удалечыні відаць Дом
друку. 1935 г.

All-Belarusian stadium
in the region of present
Palace of Water-sport near
Botanical garden.
In the distance, Printing
House, 1935



242

242. Трыбуны
Усебеларускага стадыёна.
1930-я гг.

Tribunes of All-Belarusian
stadium in the 1930s



243

243. Свята спартыўнага таварыства "Дынама" на Усебеларускім стадыёне. 1933 г.

Holiday of sport community Dynama on All-Belarusian stadium, 1933


ФІЗКУЛЬТУРА РАБОЧЫМ СТАДЫЁН. Г. МЕНСК.

244

244. Спаборніцтвы на Усебеларускім стадыёне. Здымкі з часопіса "Чырвоная Беларусь". 1931 г.

Competitions on All-Belarusian stadium, 1931



245

245. Другі злёт піянераў Беларусі на Усебеларускім стадыёне. Здымкі з часопіса "Чырвоная Беларусь". 25 ліпеня 1931 г.

The Second Meeting of the Belarusian pioneers on All-Belarusian stadium on the 25th of July 1931



246

246. Помнік Сталіну
на Усебеларускім
стадыёне. 1936 г.

Monument to Stalin
on All-Belarusian Stadium,
1936

У ЯКАСЦІ ДАДАТКУ ПУБЛІКУЕМ У СКАРОЧАНЫМ ВЫГЛЯДЗЕ Ў ТАГАЧАСНАЙ АРФАГРАФІІ БЕЗ СТРАТ ДЛЯ ЯГО ІНФАРМАЦЫЙНАГА НАПАЎНЕННЯ РАРЫТЭТНАЕ ВЫДАННЕ — «СПАДАРОЖНІК ПА МЕНСКУ» 1930 ГОДА. ЗАРАЗ ЁН ВЯДОМЫ Ў АДЗІНКАВЫХ ЭКЗЕМПЛЯРАХ, ДАГЭТУЛЬ НЕ ПЕРАВЫДАВАЎСЯ. ПЕРАД НАМІ САПРАЎДНАЯ ЭНЦЫКЛАПЕДЫЯ ГАРАДСКОГА ЛАДУ, ЯКАЯ НЕАЦЭННА ДЛЯ ПРАЯСНЕННЯ СКЛАДАНАЙ МІНСКАЙ ТАПАНІМІКІ. ЦІКАВА, КАЛІ РАПТАМ ЗАЎВАЖАЕШ СВОЕАСАБЛІВУЮ ЛОГІКУ Ў СІСТЭМЕ ПЕРАЙМЕНАВАННЯ ВУЛІЦ. БЫВАЛА, ШТО РАБІЛІ «АД ПРОЦІЛЕГЛАГА». НАПРЫКЛАД, БЫЛА ВУЛІЦА БАГАДЗЕЛЬНАЯ, СТАЛА — КАМСАМОЛЬСКАЯ; БЕЛАЦАРКОЎНАЯ — ЧЫРВОНАШТАНДАРТНАЯ; ПАЛІЦЭЙСКІ ЗАВУЛАК СТАЎ ПРАЛЕТАРСКІМ. У ІНШЫХ ВЫПАДКАХ НОВЫЯ НАЗВЫ ДЗІЎНА СУГУЧНЫ БЫЛЫМ: ВУЛІЦА ВАСКРАСЕНСКАЯ СТАЛА ВУЛІЦАЙ ВЫЗВАЛЕННЯ; БРАЦКІ ЗАВУЛАК — ТАВАРЫСКІМ; ІЛЬІНСКАЯ — УЛЬЯНАЎСКАЙ; НЯМЕЦКАЯ — КАРЛА ЛІБКНЕХТА.

ГЭТЫ «СПАДАРОЖНІК», НІБЫ ЦУДОЎНАЕ ЛЮСТЭРКА, ШТО НЕ ПАМУТНЕЛА ЗА 70 З ЛІШНІМ ГОД, ПРОСТА РАЗГОРТВАЕ ПАНАРАМУ БЫЛОГА ГАРАДСКОГА ЖЫЦЦЯ. У СПАЛУЧЭННІ З ФОТАЗДЫМКАМІ ЧАСАМ АТРЫМЛІВАЕЦЦА, ТАК БЫ МОВІЦЬ, «СТЭРЭАЭФЕКТ» — КАЛІ МАЕШ МАГЧЫМАСЦЬ УДАКЛАДНІЦЬ АДРАС ТОЙ ЦІ ІНШАЙ УСТАНОВЫ, ДАВЕДАЦЦА, КАЛІ АДЫХОДЗІЛІ ЦЯГНІКІ АД БУДЫНКА ВАКЗАЛА, ЯКІ БОЛЬШ НЕ ІСНУЕ. І НА ГАСЦІНІЦУ «ЕЎРОПА» ГЛЯДЗІШ З ІНШАЙ ЗАЦІКАЎЛЕНАСЦЮ, КАЛІ ВЕДАЕШ, ШТО НУМАРЫ ТУТ КАШТАВАЛІ АД 1 РУБЛЯ 75 КАПЕЕК ДА 8 РУБЛЁЎ У СУТКІ.

ДАВЕДНІК СКЛАДАЕЦЦА З НАСТУПНЫХ РАЗДЗЕЛАЎ: «АГУЛЬНЫЯ СПРАВАЧНЫЯ ВЕСТКІ», «УСТАНОВЫ І АРГАНІЗАЦЫІ», «КУЛЬТУРНА-АСВЕТНЫЯ ЎСТАНОВЫ», «СУВЯЗЬ І ТРАНСПАРТ», «ЭКСКУРСІІ ПА МЕНСКУ», «ПРАМЫСЛОВАСЦЬ». ТЭКСТ ДРУКУЕЦЦА ПА ЭКЗЕМПЛЯРУ, ЯКІ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў НАЦЫЯНАЛЬНЫМ МУЗЕІ ГІСТОРЫІ І КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСІ. ПРЫ ПУБЛІКАЦЫІ ЗАХАВАНЫ ПРАВАПІС АРЫГІНАЛА.

# СПАДАРОЖНІК ПА МЕНСКУ

Выданьне Менгарсавету і рэдакцыі газ. «Рабочий»
1930 г.

## АГУЛЬНЫЯ СПРАВАЧНЫЯ ВЕСТКІ

**МІЛІЦЫЯ І КРЫМІНАЛЬНЫ ВЫШУК**
**Крымінальны вышук** — Камуністычная, 1.
**Акруговая міліцыя** — Камуністычная, 1.

**ГАСЬЦІНІЦЫ І ІНТЭРНАТЫ**
1. **Менская дзяржаўная гасьцініца (б. «Эўропа»),** рог Ленінскай і Пляцу Волі, № 1/9. Кошт нумару ў суткі ад 1 р. 75 кап. да 8 рублёў.
2. **Першая савецкая гасьцініца,** Комсомольская вул., № 13/15. Кошт нумару ў суткі ад 1 да 5 руб.
3. **Дом Селяніна,** рог вул. К. Маркса і Чырвонаармейскай, № 5/52.
4. **Дом Асьветы,** Комуністычная вул., № 19.
5. **Інтэрнат для палітэмігрантаў,** Савецкая вул., № 87.
6. **Заезны дом,** Няміга, 20.

**ЛАЗЬНІ**
**Лазьня № 1** — Акцябрская, 25.
**Лазьня № 2-3 (гарнізонная)** — Стара-Віленская, 5.
**Лазьня № 4** — 2-я Лекерта, 5.
**Мэханічная пральня** — Кастрычніцкая, 25.

**ЛЯЧЭБНІЦЫ**
**1-я гарадзкая больніца,** Ленінская, 54.
**2-я гарадзкая больніца,** Комунальная.
**Лячэбніца комітэту ўзаемадапамогі,** Ленінская, 25.
**Трахоматозная лячэбніца,** Чырвоная Зорка, 22.
**Фавозная лячэбніца,** Карла Маркса, 41.
**Радзільны прытулак,** Валадарскага, 19.
**Вэтэрынарная лячэбніца,** Пуліхава, 1.

**КЛІНІКІ**
1. **Вочных хвароб,** Ленінская, 54.
2. **Дзіцячых хвароб,** Карла Маркса, 28.
3. **Нэрвовых хвароб,** Сьвярдлоўская, 13.
4. **Скурана-вэнэролёгічная,** Чырвонаармейская, 14.
5. **Вуха, горла і носа,** Ленінская, 54.

**ДЫСПАНСЭРЫ**
1. **Сухотны,** Урыцкага, 3.
2. **Вэнэролёгічны,** Чырвонаармейская, 14.

**АПТЭКІ**

1. **Цэнтральная аптэка,** Ленінская, 7.
2. **Гарадзкая аптэка,** Няміга, 8.
3. **Аптэка** , рог Карла Маркса і Сьвярдлоўскай.
4. **Гарадзкая аптэка,** Савецкая, 181.
5. **Гарадзкая аптэка,** Камунальная, 25.
6. **Аптэка**, Савецкая, 24.
7. **Аптэка** , Савецкая, 97.

**СУДОВЫЯ ЎСТАНОВЫ**

**Нар. ком. юст.,** К. Маркса, 5, НКЮ т. Сташэўскі.
**Вярхоўны суд рэспублікі,** Карла Маркса, 5.
**Акруговы суд,** Карла Маркса, 5.
**Акр. прокуратура,** Рэвол., 2, менск. акр., пракурор т. Зысьман.
**Нарсуд 1-га вуч.,** Карла Маркса, 28.
**Нарсуд 2-га вуч.,** Пролетарская, 15.
**Нарсуд 3-га вуч.,** Міхайлаўская, 18.
**Польская суд. камэра і трудсэсія,** Сьвярдлоўская, 2.
**Яўрэйская суд. камэра,** Сьвярдлоўская, 2.
**Колегія абаронцаў,** Карла Маркса, 4.
**Нотарыяльная контора,** Карла Маркса, 5.
**Юрыдычная консультацыя,** Карла Маркса, 5.

**БАНКІ**

1. **Белкомунбанк** (Рог Ленінскай і К. Маркса, 36/43).
2. **Усебеларуская контора Дзяржбанку** (Савецкая, 59).
3. **Усебеларуская контора саюзколгасбанку СССР** (Комсомольская, 34/59).

**АШЧАДКАСЫ**

**Працоўная ашчадная каса,** Ленінская, 20.

**ТРАНСПАРТНЫ ТРЭСТ МЕНАКРВЫКАНКОМУ**

ПРАЎЛЕНЬНЕ: Савецкая, 77/26.
ГАРАЖ І ПАРК: Даўгаброцкая.
КОНСКІ ПАРК: Дабратысьлінскі зав.
ЭКСПЭДЫЦЫЯ: Маскоўская, 1.

МЭТА І ЗАДАЧА ТРЭСТА

1. Абслугоўваньне гарадзкога насельніцтва гор. Менску трамвайнымі пасажырскімі зносінамі па маршрутах:
№ 1. ТАВАРНАЯ — САВЕЦКАЯ — КАМАРОЎКА.
№ 2. ПАСАЖЫРСКІ ВАКЗАЛ — ПЛЯЦ ВОЛІ — СТАРАЖОЎКА.
Пачатак трамвайнага руху а 5 гадзіне, канец а 1 гадзіне ночы.

2. Абслугоўваньне гарадзкога насельніцтва г. Менску аўтабуснымі зносінамі па лініі:
ПЛЯЦ ВОЛІ — КОЗЫРАВА. Пачатак руху а 7 гадз., канец у 23 гадз.

3. Міжгародні аўтабусны рух па сувязі акруговага цэнтру г. Менску з раёнамі і вёскамі па наступных маршрутах:
1. МЕНСК — ГАРАДОК — ЛАГОЙСК.
2. МЕНСК — ЛАГОЙСК — ПЛЕШЧАНІЦА — ЗЕМБІН — БЯГОМЛЯ.
3. МЕНСК — СЬМІЛАВІЧЫ — ЧЭРВЕНЬ.
4. МЕНСК — СЬМІЛАВІЧЫ — ЧЭРВЕНЬ — БЯРЭЗІНА.
5. МЕНСК — САМАХВАЛАВІЧЫ — УЗДА — ГРОЗАЎ — КАПЫЛЬ — ЦІМКАВІЧЫ — СЛУЦАК.
6. КОЙДАНАВА — НЕГАРЭЛАЕ — УЗДА.
7. МЕНСК — КАВ. ЛЯГЕРЫ — ДРАЗДЫ.
8. МЕНСК — ЧЫРВОНАЕ УРОЧЫШЧА.
Адпраўка аўтобусаў кожны дзень па асобнаму на гэта раскладу.

4. Цяжаровыя аўтамабільныя перавозкі ў г. Менску розных цяжараў.

5. Цяжаровыя гужавыя перавозкі розных цяжараў у г. Менску.

6. Пракат легкавых аўтамабіляў (таксі) як па г. Менску, так і па-за горадам кожны дзень. Стаянка машын: ГОТЭЛЬ «ЭЎРОПА» і ПАС. ВАГЗАЛ.

7. Перавозка розных экскурсій і арганізацый як у горадзе, так і за горад, у любы час па асобнай на гэту мэту згодзе.

8. Пракат аўтобусаў, грузавікоў і легкавых машын.

9. Абслугоўваньне транспартнымі сродкамі насельніцтва, устаноў, прадпрыемстваў, дзяржаўных, грамадзкіх і каапэрацыйных організацый, знаходзячыхся на тэрыторыі г. Менску і ў раёнах Менскай акругі.

**САЮЗ ЖЫЛЬЛЁВАЙ КААПЭРАЦЫІ БЕЛАРУСІ «БЕЛЖЫЛСАЮЗ»**
*г. Менск, Інтэрнацыянальная, 12*
СКЛАД БЕЛЖЫЛСАЮЗУ — Энгельса, 2.
БАЗА БЕЛЖЫЛСАЮЗУ — Правіанцкая вул., насупроць сьвінарніка.

На падставе пастаноў урадавых органаў Белжылсаюз у сучасны момант зьяўляецца асноўнай рэспубліканскай арганізацыяй, якая вытварае жыльлёвае і ведамсьцвенае будаўніцтва і рамонты.

Пры Белжылсаюзе арганізавана праектнае бюро, у задачы якога ўваходзіць складаньне і распрацоўка праектаў жыльлёвага, клюбнага, больнічнага і інш. будаўніцтва, за выключэньнем прамысловага.

Праектнае бюро вытварае работу па складаньні праектаў па заказах асобных арганізацый і для патрэб жыльлёва-каапэрацыйнага будаўніцтва.

Акрамя вытварэньня каапэрацыйнага і ведамсьцвенага будаўніцтва, Белжылсаюз вядзе работу па абслугоўваньню індывідуальных забудоўшчыкаў у сэнсе забесьпячэньня іх матар'яламі, аказаньня тэхнічнай і юрыдычнай дапамогі.

У сучасны момант Белжылсаюз аб'яднае па Менску 22 ЖАКТ'ы (жыльлёва-арэндныя каапэрацыйныя т-вы) і 10 ЖБКТ (жыльлёва-будаўнічыя каапэрацыйныя т-вы).

Паводле вестак на 1.1-29 г. ЖАКТ'ы г. Менску аб'ядналоць 567 домаўладаньняў з 198.780 тыс. кв. мэтраў жыл. плошчы.

У дамох, арандуемых ЖАКТ'амі, пражывае 24 115 чал., у тым ліку рабочых 10.370 чал.

Членаў ЖАКТ'аў налічваецца 6.142 чал. Сабрана паявога капіталу 50.000 руб.

Да 1929 г. ЖАКТ'ы вытварылі рамонтаў на суму 2.069.000 руб., у 1929 г. — на суму 542.000 руб., а ўсяго да 1930 г. - на 2.611.000 руб.

РЖБКТ аб'ядналоць 1077 чал. членаў, з якіх ужо атрымалі кватэры 329 чал.

За ўвесь час да 1929 г. пабудована 90 дамоў на 335 кватэр. Каштоўнасьць вытваранага будаўніцтва складае 1.689.000 руб.

У сучасны момант па жыл. каапэратывах асабліва пачынае разгортвацца культбытавая работа, па лініі калектывізацыі быту і хатняй працы, шляхам арганізацыі калектыўных сталовак, пральняў, дзіцячых установ і г.д. Ужо арганізавана і працуе з 1/1–30 г. агульная калектыўная сталоўка пры ЖАКЦЕ № 16. Намячаецца арганізацыя сталовак пры ЖАКТ'ах №№ 7, 10, 18, 1.

У Барысаве ёсць раённы саюз жылкаапэрацыі, які аб'яднае 2 ЖАКТ'ы і 3 ЖБКТ.

Саюзы жылкаапэрацыі ёсьць у кожнай акрузе.

**МЭДЫЧНА-ГАНДЛЁВА-ПРАМЫСЛОВЫ І ЗАБЕСЬПЯЧАЛЬНЫ ОРГАН НКАЗ БССР ДЗЯРЖАЎНЫ ГАНДАЛЬ І ВЫРАБ МЭДМАЁМАСЬЦІ НКАЗ БССР «БЕЛМЭДГАНДАЛЬ»**
Забесьпячэньне акруговых аптэкакіраўніцтваў, аптэчных і лекава-санітарных установ мэдыкамэнтамі, хірургічным інструмэнтарам і іншай мэдычнай маёмасьцю саюзнага вырабу і імпартнай; загатоўка лекавых расьлін дзікарастучых і кантрактацыя культурных.

АГУЛЬНЫ ЗВАРОТ:
1926/27 г. — 2.407.000 р.; 1927/28 г. — 3.731.500 р.; 1928/29 г. — 5.076.600 р.
ВЫРАБ ХЭМФАРМАЗАВОДУ:
1926/27 г. — 283.000 р.; 1927/28 г. — 456.000 р.; 1928/29 г. — 661.000 р.
Праўленьне Белмэдгандлю — Пляц волі, 29.
Цэнтральны склад — Пляц волі, 29.
Хэмфармазавод — рог вул. Дзяржынскага і Рыгораўскай.

**АПТЭКАКІРАЎНІЦТВА МЕНСКАЙ АКРУГІ**
*Камуністычная, 4.*

**ПРАДПРЫЕМСТВЫ:**
Склад-разьмеркавальнік — Ленінская, № 10.
Цэнтральная аптэка — Ленінская, 7/1.
Аптэка № 2 — Няміга, № 8.
Аптэка № 3 — Сьвярдлоўская.
Аптэка № 4 — Савецкая, № 181.
Аптэка № 5 — Камунальная, № 1.
Аптэка № 6 — Савецкая, 24.
Аптэка № 7 — Савецкая, 97.
Аптэка ў раёне Эльвода.
Аптэка ў раёне таварнай ст. МББ ж. д.
Магазын «Санітарыі і гігіены» № 1 — Ленінская, 7/1.
Магазын «Санітарыі і гігіены» № 2 — Ракоўская, 26.
Магазын «Санітарыі і гігіены» № 3 — Нова-Маскоўск., 42.
Магазын «Санітарыі і гігіены» № 4 — Савецкая, 84.
Магазын «Санітарыі і гігіены» № 5 — Камунальная, 25.
У раёне Менскай акругі — 25 аптэк і два магазыны сангігіены.

Акрамя водпуску лякарстваў, аптэчныя прадпрыемствы прадаюць прадметы сангігіены, прадметы догляду за хворымі, гаспадарчыя прадметы, мінэральныя воды (нарзан, баржом, эсэнтукі), маскатэльныя тавары, касмэтычна-парфумэрныя прадметы (мыла, парфуму, адэкалён, пудру, крэмы для твару і г. д.), гумавыя прадметы (грэбні, расчоскі, цацкі, мячы).

У цэнтральнай аптэцы ёсьць аддзелы: інструмэнтарыя, оптыкі, лябараторных прыладаў і начыньня і майстэрня па пачынцы інструмэнтарыя.

У магазынах №№ 1, 4, 5 і ў Барысаўскіх магазынах прадаюцца фатаграфічныя прадметы і матар'ялы.

Усе нашы аптэчныя прадпрыемствы купляюць лякарственую сыравіну (чарніку, дзеразу, валяр'яну, воск і г.д.).

**ПОМНІКІ**

1. ПОМНІК АХВЯРАМ КУРЛОЎСКАГА РАССТРЭЛУ 1905 г.

*(Пляц 25 Кастрычніка, каля вагзалу)*

На пляцу 25 Кастрычніка, перад памяшканьнем вагзалу, пастаўлены з чорнага мармуру жалобны помнік у памяць курлоўскага расстрэлу 1905 г. «18 кастрычніка 1905 г. бастуючымі чыгуначнікамі Лібава-Роменскай чыгункі быў вызначаны мітынг, які павінен быў адбыцца ў залі III клясы. Зранку 18 кастрычніка на мітынг зьявілася шмат народу. Заля была перапоўнена. З гэтай прычыны мітынг быў перанесены на пляц каля вагзалу. Калі адкрыўся мітынг, была ўнесена прапанова зараз жа прыняць захады да вызваленьня палітычных зьняволеных. Абралі дэлегацыю, у якую ад чыгуначнікаў уваходзілі Жаба, Валынскі і Метлін. Выбраная дэлегацыя накіравалася да губэрнатара і была «ласкава» прынята. Усьміхаючыся, губэрнатар Курлоў згадзіўся для «народу» просьбу задаволіць. На пляцы мітынг ішоў сваёй чаргой. Прамоўца за прамоўцам падымаліся на трыбуну, і кожны канчаў сваю прамову заклікамі: «Далоў самаўладзтва», «Няхай жыве сусьветная рэволюцыя». Зварот дэлегацыі мітынг сустрэў радаснымі крыкамі. Пасьля абвяшчэньня вынікаў і вызваленьня палітычна-зьняволеных натоўп звыш 10.000 чал. накіраваўся да Віленскага вагзалу. Была 4-я гадзіна, калі да вагзалу пачалі падыходзіць узброеныя вайсковыя часткі. У хуткім часе з іх боку раздалася частая страляніна. Енкі, крыкі напоўнілі паветра. Натоўп з перапалоху кінуўся ўцякаць, салдаты па камандзе сваіх афіцэраў учашчалі стрэлы. У выніку гэтага пролетарыят панёс шмат ахвяр: 80 чал. забітых і больш 300 чал. параненых. Менскія працоўныя масы ў адзнаку ўшанаваньня памяці сваіх братоў у 1905 годзе паставілі помнік» («Рабочий», 1928).

2. ПОМНІК КАРЛУ ЛІБКНЭХТУ

*(У садзе імя Карла Лібкнэхта, каля Віленскага рынку)*

Помнік Карлу Лібкнэхту — правадыру і заснавальніку групы «Спартак» у Нямеччыне, які загінуў разам з Розай Люксэмбург 15 студзеня 1919 году ад рукі нямецкіх катаў, пастаўлен рабочай моладздзю 5 верасьня 1926 г.

3. ПОМНІК КАРЛУ МАРКСУ

*(Вул. Энгельса, супроць гарадзкога тэатру)*

Працоўныя Менску, шануючы памяць найвялікшага тэорэтыка і правадыра рабочае клясы ўсяго сьвету, заснавальніка навуковага соцыялізму, паставілі гэты помнік у 1922 годзе.

4. ПОМНІК ГІРШУ ЛЕКЕРТУ

*(У малым садзе на Пляцу Волі)*

1 мая 1902 г. у гор. Вільны адбывалася масавая дэмонстрацыя. Дэмонстрантаў арыштавалі, і Віленскі губэрнатар фон-Валь загадаў біць дэмонстрантаў розкамі. Гэты ўчынак фон-Валя раззлаваў рэволюцыйных рабочых і кожны з іх жадаў адпомсьціць яму. Гірш Лекерт, шавец па профэсіі, страляў у губэрнатара і параніў яго. За гэта Лекерта прысудзілі да пакараньня сьмерцьцю. 10 ліпеня 1902 г. яго павесілі. Працоўныя Беларусі, шануючы памяць рэволюцыянэра Лекерта, паставілі гэты помнік у 1922 годзе на месцы былога помніка аднаму з расійскіх цароў.

5. ПОМНІК Я. ПУЛІХАВУ

*(На Старажоўскіх могілках)*

Пасьля расстрэлу Курловым мірнай дэмонстрацыі 18 кастрычніка 1905 г. П. С. Р. пастанавіла забіць Курлова. Выкананьне гэтага абавязку ўзяў на сябе член партыі, студэнт Ян Пуліхаў. 14 студзеня 1906 г. Я. Пуліхаў кінуў у Курлова бомбу, але бомба не разарвалася. Бомба, як выявілася пасьля, была дастаўлена провокатарам Азэфам. У ноч на 25 лютага 1906 г. Пуліхаў быў павешаны на варотах Менскай турмы. Помнік гэты пастаўлены ў 1928 годзе.

**БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ КУЛЬТУРНА-ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЭЙ**

*Менск, Чырвонаармейская, 5 (Дом Селяніна, 2-і і 3-і паверх)*

Канцэлярыя адчынена штодзённа ад 9 гадз. раніцы да 4 гадз. дня, а для агляду — штодзённа ад 12 1/2 гадз. дня да 4-х гадз., апрача дзён, чыслы якіх канчаюцца на 5 і 0 (напрыклад, 10, 15, 20 і г.д.).

У дні, чыслы якіх канчаюцца на 5, 0, музэй для агляду адчынен ад 5 да 9 гадзін увечары, а канцэлярыя — ад 2 да 9 гадзін.

АРГАНІЗАВАНЫЯ ЭКСКУРСІІ

праходзяць дарма па папярэдняму запісу ў канцэлярыі музэю.

АСОБНЫЯ НАВЕДВАЛЬНІКІ ПЛОЦЯЦЬ:

1. Вучні і чырвонаармейцы па 5 кап.
2. Сябры прафсаюзаў па 10 кап.
3. Іншыя па 20 кап.

МУЗЭЙ МАЕ АДДЗЕЛЫ:

1. АРХЭОЛЁГII (жыцьцё і праца чалавека ў часы старакаменнага і нова-каменнага веку і першых часоў зьяўленьня жалеза).

2. ЭТНАГРАФII (індывідуальная сялянская гаспадарка і быт сялян): А. а) праца прыгоннага часу, б) быт прыгоннага часу. Б. а) праца пасьля прыгоннага часу, б) быт пасьля прыгоннага часу.

3. ГІСТОРЫІ. А. а) рыцарства (зброя, здымкі беларускіх замкаў), б) шляхецтва эпохі разьвіцьця прыгоннага права (тыпы, агнястрэльная зброя па малюнках і слуцкія паясы), в) шляхецтва часу разьвіцьця прамысловага капіталізму (тыпы, мэбля, парцаляна), г) грошы беларускія і тыя, якія хадзілі на тэрыторыі Беларусі, д) мэдалі беларускія, расейскія, зах.-эўрапейскія. Б. а) горад цэхавы (цэхавыя вырабы, цэхавыя сьцягі, абраднасьць цэхавая). б) Менск — губэрнатарская — архірэйскі, в) Менск, чырвоная сталіца БССР, г) рэвалюцыйныя падзеі на Беларусі.

4. АНТЫРЭЛІГІЙНЫ АДДЗЕЛ.

5. САЦЫЯЛІСТЫЧНЫ СЭКТАР (сацыялістычнае будаўніцтва ў БССР).

6. МАСТАЦКІ АДДЗЕЛ: а) заходня-эўрапейскае мастацтва часу разьвіцьця гандлёвага капіталу, б) расійскае і беларускае мастацтва часу разьвіцьця прамысловага капіталу, в) сучаснае мастацтва ў БССР.

7. ЯЎРЭЙСКІ АДДЗЕЛ. А. а) зьяўленьне яўрэяў на Беларусі, б) яўрэйская беларусізацыя і яе змычка з буржуазіяй пануючай нацыі і ўрадам, в) сынагога і яе роля ў эксплёатацыі яўрэйскай бедняты, г) яўрэй-гандляр і яўрэй-рамесьнік, д) яўрэйская бедната. Б. а) яўрэйства ў БССР пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі.

**САДЫ І БУЛЬВАРЫ**

1. САД «ПРОФІНТЭРН»

Знаходзіцца ў цэнтры гораду і займае плошчу каля 14 га. Распланаваны сад да рэволюцыі. Дрэвы самыя рознастойныя — таполі, ліпа, асіна, граб, клён, вяз, сасна (хвоя), вярба і інш.

Усходняя частка саду зьмяшчае спортыўныя пляцоўкі, вэлёсыпэдную пляцоўку, тыр дзеля малакаліберных вінтовак, а таксама абсталяваны палявы тыр. У гэтым годзе абсталяваны летні тэатр; пабудавана сталоўка, якая ўзімку прыстасавана да організацыі лыжнае станцыі, вялікая адкрытая эстрада і асобны будынак-чытальня.

На плошчы спортыўных пляцовак узімку ўтвараецца каток, разьлічаны на 800-1000 чалавек.

Гарадзкі сад «Профінтэрн» перададзены ў веданьне ЦСПСБ.

2. ВЯЛІКІ САД

Знаходзіцца ў цэнтры гораду паміж вуліцамі: Савецкай і К. Маркса, Чырвонаармейскай і Энгельса. Плошчу займае каля 1 1/2 га. Распланаваны да рэволюцыі. Заснаваны ў 1884 годзе. У 1890 годзе на рагу саду пабудаваны гарадзкі тэатр, цяпер Беларускі дзяржаўны акадэмічны тэатр. У садзе ёсьць фонтан, будка аўтоматычнае вагі, кіёск для продажу газэт і пэрыодычных выданьняў і інш.

3. МАЛЫ САД

Знаходзіцца на Пляцу Волі. Плошчу займае троху менш за 1 га. Закладзены да рэволюцыі. Дрэвы дэкорацыйныя. Тут помнік Гіршу Лекерту, што рабіў замах на Віленскага губэрнатара.

4. НОВЫ САД

Знаходзіцца на Унівэрсытэцкай вул., каля ком. унівэрсытэту. Заснаваны ў 1925 годзе і займае плошчу адзін га. Вельмі прыгожыя віды на Менск.

5. САД ІМЯ КАРЛА ЛІБКНЭХТА

Знаходзіцца ля Віленскага базару і займае плошчу каля 1 га. Закладзены ў 1926 годзе. На сквэры знаходзіцца помнік Карлу Лібкнэхту.

6. СЬВЯРДЛОЎСКІ БУЛЬВАР

Займае невялікую плошчу, засаджан рознымі дрэвамі (каштаны, таполі, ліпа і інш.). Вельмі прытульны прыродны куток.

7. САД ІМЯ 25 КАСТРЫЧНІКА

Знаходзіцца на пляцу 25 Кастрычніка і займае плошчу каля 1 га. Закладзены ў 1926 годзе.

8. СТАРАЖОЎСКІ САД

Знаходзіцца на рагу Старажоўскае і Старавіленскае вул. Займае плошчу каля 2 га. Дрэвы фруктовыя. Ёсьць слуцкія бэры, апорт і інш. гатункі грушавых і яблачных дрэваў.

9. ЛЕТНІ САД САЮЗУ ПРАЦАСЬВЕТЫ

Знаходзіцца на Савецкай вул. паміж дамамі 96-94, на схіле ўзвышша. Ёсьць сцэна. Дрэвы фруктовыя. Займае плошчу больш га.

10. ЛЕТНІ САД САМАТУЖНІКАЎ

Знаходзіцца на Комуністычнай вул. Ёсьць летняя сцэна.

11. ЛЕТНІ САД ХАРЧАВІКОЎ

Знаходзіцца на Ленінскай вул., супроць 1-ай савецкай больніцы. Ёсьць сцэна.

12. ЛЕТНІ САД ГУТНІКАЎ

На Рыгораўскай вул., супроць дому № 14. Фруктовы дрэвы. Ёсьць сцэна, бібліотэка, спортыўныя пляцоўкі.

**ПЕРАІМЕНАВАНЫЯ НАЗВЫ ВУЛІЦ**

| СТАРЫЯ НАЗВЫ | НОВЫЯ НАЗВЫ |
|---|---|
| Александраўская | Комунальная |
| Архірэйскі завулак | Луначарскага завулак |
| Архірэйскае ўрочышча | Піліхава ўрочышча |

| | |
|---|---|
| Афіцэрская | Каменеўская |
| Багадзельная | Комсомольская |
| Белацаркоўная | Чырвонаштандартная |
| Брацкі завулак | Таварыскі завулак |
| Васілеўскі завулак | Земляробскі завулак |
| Васкрасенская | Вызваленьня |
| Вясёлая | Першамайская |
| Георгіеўская | Чычэрынская |
| Губэрнатарская | Ленінская |
| Дабрамысьленскі завулак | Чырвонамысьленскі завулак |
| Дзяменцеўская | Дзяржынскага |
| Есіфская | Разінская |
| Жандарская | Пуцейская |
| Залатагорская | Чырвоназьвёздная |
| Захараўская | Савецкая |
| Захараўскі завулак | Урыцкага |
| Ільінская | Ульянаўская |
| Казакоўская | Пугачоўская |
| Каломенская | Сьвярдлоўская |
| Кандуктарская | Чыгуначная |
| Крашчэнская | Кастрычнікаўская |
| Койданаўская | Рэвалюцыйная |
| Ляхаўка верхняя | Беларуская |
| Ляхаўка ніжняя | Лекерта |
| Ляхаўская слабада | Беларуская слабада |
| Магазынная | Унівэрсытэцкая |
| Манастырская | Бакунінская |
| Мала-манастырскі завулак | Герцанскі завулак |
| Мала-георгіеўская | Талстога Льва |
| Мацьвееўская | Люксэмбург |
| Мікалаеўская | Крапоткіна |
| Міхайлаўская | Мопраўская |
| Нова-раманаўская | Рэспубліканская |
| Нямецкая | Лібкнэхта |
| Паліцэйска-узьбярэжная | Пролетарска-узьбярэжная |
| Паліцейскі завулак | Пролетарскі завулак |
| Падгорная | Маркса |
| Петрапаўлаўская | Энгельса |
| Петраградзкая | Ленінградзкая |
| Петраградзкі завулак | Ленінградзкі завулак |
| Прэабражэнская | Інтэрнацыянальная |
| Рыбны базар | Біржавы завулак |
| Скобелеўская | Чырвонаармейская |
| Сямёнаўская | Партызанская |
| Сярпухоўская | Валадарскага |
| Трубны завулак | Берсана |
| Узьбярэжная | Камунальна-узьбярэжная |
| Юраўская | Комуністычная |

| | |
|---|---|
| ПЛЯЦЫ | |
| Саборны | Волі |
| Троіцкі | Парыскай комуны |
| Юбілейны | 25 Кастрычніка |

## УСТАНОВЫ І ОРГАНІЗАЦЫІ

**УРАДОВЫЯ УСТАНОВЫ БССР**

1. **Цэнтральны выканаўчы комітэт** — Пляц Волі, № 17.
2. **Савет народных комісараў** — Чырвонаармейская, 3.
3. **Народны комісарыят земляробства** — Савецкая вул., № 70/71.
4. **Народны комісарыят рабоча-сялянскай інспэкцыі** — Савецкая вул., № 55.
5. **Народны комісарыят фінансаў** — вул. К. Маркса, № 14.
6. **Народны комісарыят аховы здароўя** — Рэвалюцыйная вул., № 2.

**7. Народны комісарыят юстыцыі** — вул. К. Маркса, № 5.
**8. Народны комісарыят асьветы** — Пляц Волі, № 23.
**9. Народны комісарыят працы** — Пляц Волі.
**10. Вышэйшы савет народнае гаспадаркі** — Пляц Волі.
**11. Народны комісарыят соцыяльнага забесьпячэньня** — Комсамольская, 32.
**12. Народны комісарыят гандлю** — Пляц Волі.
**13. Упаўнаважаны Народнага камісарыяту па замежных справах пры СНК БССР** — Комуністычная, 2.
**14. Дзяржплян пры СНК БССР** — Пляц Волі, 15.
**15. Цэнтральнае Архіўнае кіраўніцтва** — рог Бакунінскай і Пляцу Волі.

**ЦЭНТРАЛЬНЫ ВЫКАНАЎЧЫ КАМІТЭТ БЕЛАРУСІ**
*(Пляц Волі)*
ТЭЛЕФОНЫ
1. Габінэт старшыні ЦВК БССР.
90. Кватэра
38. Габінэт сэкратара
33. Кватэра
4-75. Загадчык сэкратарыяту прэзыдыуму ЦВК БССР.
9-28. Протокольная частка, юрысконсультац., стэнографісткі.
11-49. Комэндант ЦВК, бухгальтэрыя.
3-63. Агульная канцэлярыя, рэгістратура.
8-56. Сэкратар організацыйна-інструктарскага аддзелу.
8-56. Інструктары організацыйна-інструктарскага аддзелу.
1-83. Інформацыйна-вучотна-статыстычная частка організацыйнага аддзелу.
4-83. Цэнтральная комісія па перавыбарах саветаў.
8-56. Цэнтральная комісія па палепшаньні быту і працы жанчын.
12-11. Нацыянальная комісія ЦВК БССР.
12-26. Белкомзет (комісія па земляўпарадкаваньню працоўных яўрэяў).
8-55. Комісія прыватных амністый.
4-83. Цэнтральная комісія садзейнічаньня дзяржкрэдыту і ашчадсправе.
11-49. Цэнтральная комісія дапамогі дзецям.
3-82. Дзяжурны міліцыянэр ЦВК, комэндант будынку ЦВК.
7-69. Рэдакцыя газэты «Савецкая Беларусь» (орган ЦВК БССР).
10-20. Вышэйшы савет фізкультуры, намесьнік старшыні і адказны сэкратар.
17-42. Кватэра загадчыка сэкратарыяту прэзыдыуму ЦВК БССР.
5-32. Кватэра адказнага сэкратара комісіі прыватных амністый.
17-24. Кватэра шофэра ЦВК БССР.

**ПРЫЁМНАЯ ЦВК БССР**
*(Пляц Волі)*
47. Загадчык прыёмнае ЦВК БССР.
1-46. Сэкратар
Прыёмная працуе штодзённа ад 9 гадз. 15 хвілін раніцы да 4 гадзін увечары.

**САВЕТ НАРОДНЫХ КОМІСАРАЎ**
*(Чырвонаармейская, 3)*
ТЭЛЕФОНЫ
6-47. Сэкратарыят, протокольная частка.
92. Сэкратар СНК.
6-41, 84. Намесьнік сэкратара і асабовы сэкратарыят старшыні СНК.
7-85. Старшыня падрыхтоўчай комісіі.
6-64. Сэкратар падрыхтоўчае комісіі.
14-96. Сэкратар эканомічнае нарады.
16-37. Інформацыйны аддзел.
16-40. Дзяжурны міліцыянэр.
12-63. Заля пасяджэньняў.
16-72. Комітэт хэмізацыі.
16-38. Кіраўнік спраў.
93. Намесьнік старшыні СНК.
8-51. Комітэт па справах друку.

**НАРОДНЫ КОМІСАРЫЯТ АСЬВЕТЫ БЕЛАРУСІ**
*(Пляц Волі)*
ТЭЛЕФОНЫ
14-12. Агульная канцэлярыя.

11-47. Мэтадком.
8-93. Галоўмастацтва.
8-93. Галоўнавука.
1-35. Рэдакцыя часопісу «Ком. Выхаваньне».
1-35. Інспэктар соцвыху.
14-12. Інспэктар палітасьветы.
2-51. Тэхнічны нагляд па будаўніцтву.
4-43. Націнспэктура.
4-43. Інспэктар профасьветы.
3-09. Габінэт наркома.
8-41. Намесьнік наркома.
11-47. Сэкратар колегіі Наркомасьветы.
2-21. Бухгальтэрыя.

**НАРОДНЫ КОМІСАРЫЯТ ПРАЦЫ**
*(Пляц Волі)*
ТЭЛЕФОНЫ
12. Агульная канцэлярыя.
7. Габінэт наркома.
8-16. Габінэт намесьніка наркома.
1-69. Рынак працы.
5-82. Статыстыка і плянбюро.
12-84. Бухгальтэрыя.
14-54. Інспэктар-тарыфны, праўны і сельска-гаспадарчы.
8-64. Акруговая інспэкцыя працы.

**НАРОДНЫ КОМІСАРЫЯТ ЮСТЫЦЫІ**
*(Карла Маркса, 5)*
ТЭЛЕФОНЫ
1-19. Агульны аддзел.
4-48. Сэкратар агульнага аддзелу.
1-19. Агульная канцэлярыя.
25. Габінет наркома юстыцыі.
1-19. Габінэт прокурора.
4-48. Габінэт прокурора вярхоўнага суду.
10-48. Прокурор па зямельн. і працправах.
4-48. Сэкратар прокур. па зямельн. і працправах.
Прыём адбываецца ад 9 да 11 гадзін раніцы штодзённа, для прыежджых — ад 9 раніцы да 4 папоўдні.
Пры Народным комісарыяце юстыцыі знаходзіцца Вярхоўны суд, акруговы суд і колегія абаронцаў — тэл. № 2-90.

**ВЫШЭЙШЫ САВЕТ НАРОДНАЕ ГАСПАДАРКІ**
*(Пляц Волі)*
ТЭЛЕФОНЫ
80. Старшыня ВСНГ — т. Грысевіч.
63. Нам. старшыні — т. Васкабойнікаў.
3-20. Нам. старшыні — т. Стракоўскі.
12-44. Член прэзыдыуму — т. Панкоў.
1-22. Сэкратар ВСНГ — т. Ізакаў.
5-11. Горны аддзел — т. Розін.
5-11. Сэктар кон'юнктуры і статыстыкі — т. Шульман.
5-11. «Птэк» — плянавае тэх.-эконом.-кіраўніцтва т. Пагосткі, Русановіч.
4-52. Галоўн. інспэкцыя — т. Рудкін.
4-92. Сэктар забесьпячэньня — т. Васільлеў.
4-92. Сэктар сабекошту — т. Сальскі.
4-92. Сэктар рацыяналізацыі і вынаходзтва — т. Кейлін.
16-02. Сэктар мясцовай прамысловасьці — т. Брыкман.
16-02. Сэктар капітальн. будаўніцтва — т. Шляпнікаў.
24. Энэрг. бюро — т. Паднясенскі.
14-33. Аддзел кадраў — т. Дружалоўскі.
24. Сэктар эконом. працы — т. Каган.
1-22. Вучразьмерк. — т. Скараход.
80. Сэкратар прэзыдыуму — т. Дубровенская.
24. Агульная канцэлярыя.

**АБ'ЯДНАНЬНІ ВСНГБ**
ТЭЛЕФОНЫ
16-00. Стройаб'яднаньне — дырэктар т. Васэрман. Рэволюцыйная, 3.
1-20. Харчаб'яднаньне — дырэктар т. Раксін. Рэволюцыйная, 3.
6-31. Папераб'яднаньне — дырэктар т. Кофман. Рэволюцыйная, 3.
11-56. Торпаб'яднаньне — дырэктар т. Вольняк (час. вык. абавяз.). Рэволюцыйная, 3.
10-21. Мэталяаб'яднаньне — дырэктар т. Фіш. Ракаўская, 8.
6-21. Скураб'яднаньне — дырэктар т. Штэйнэр. Інтэрнацыянальная, 10/17.
7-73. Хэмааб'яднаньне — дырэктар т. Ківель. Савецкая, 82.
4-15. Лесбел — дырэктар Дварэцкі. Пл. Волі 21/1.
24. Ільно-пяньковае аб'яднаньне — дырэктар т. Лучышын. Пляц Волі, 21/1.
10-16. Кіно-фото-аб'яднаньне — дырэктар т. Галкін, Рэволюцыйная, 4.
10-16. Кіно-фото-аб'яднаньне — дырэктар т. Мілоўскі, Ленінская, 13.
13-54. Швейаб'яднаньне — дырэктар т. Баскін. Рог Савецкай і Ленінскай, 28/86.
3-37. Белснабаб'яднаньне — дырэктар т. Луцкевіч. Ленінская, дом Комунбанку.
4-69. Палата мер і вагі — кіраўнік Марыгін.

**ЦЭНТРАЛЬНАЯ КОНТРОЛЬНАЯ КОМІСІЯ КОМУНІСТЫЧНАЕ ПАРТЫІ (Бальшавікоў) БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КОМІСАРЫЯТ РАБ.-СЯЛЯНСКАЙ ІНСПЭКЦЫІ**
*(Савецкая, 55)*
ТЭЛЕФОНЫ
20. Габінэт наркома.
7-18. Габінэт намесьніка.
6-03. Сэкратар.
8-88. Контрольна-плянавае бюро.
8-88. Арганізацыйная група.
Партколегія:
2-16. Канцэлярыя.
3-62. Сэкратар.
Бюро скаргаў:
6-04. Агульная канцэлярыя.
6-04. Старшыня.
6-24. Прыёмная.
6-24. Інспэктар.
7-57. Прамыслова-будаўнічая група.
7-36, 11-75. Група савецкага апарату.
9-45. Група транспарту і сувязі.
4-57. Група сельска-гаспадарчая.
7-36. Група соцыяльна-культурная.
62. Бухгальтар.

**НАРКОМАТ СОЦЫЯЛЬНАГА ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ**
*(Комсамольская, 32)*
1) Забесьпячэньне сямей асоб, прызваных у шэрагі Чырвонай арміі і тэрзбор.
2) Забесьпячэньне інвалідаў грамадзянскай вайны.
Забесьпячэньне інвалідаў былых чырвоных партызан.
Забесьпячэньне інвалідаў чырвонагвардзейцаў.
Забесьпячэньне інвалідаў імпэрыялістычнай вайны, асоб, страціўшых працаздольнасьць у час ваенізацыі насельніцтва, асоб, страціўшых працаздольнасьць пры актыўным змаганьні з контррэволюцыяй, асоб, страціўшых працаздольнасьць пры аказаньні дапамогі адпаведным органам пры змаганьні з злачынствамі.
3) Забесьпячэньне сямей памершых інвалідаў грамадзянскай вайны, былых чырвоных партызан, чырвонагвардзейцаў, інвалідаў імпэрыялістычнай вайны і інш. асоб вышэйпаказаных катэгорый.
4) Забесьпячэньне ўсяе беднаты, якая ня мае сродкаў існаваньня.
5) Забесьпячэньне асоб, якія маюць выключныя заслугі перад рэспублікай.
6) Забесьпячэньне навуковых працаўнікоў за выслуг год.
7) Кіраўніцтва працай сялянскіх грамадзкіх комітэтаў ўзаемадапамогі.
8) Працоўнае ўстройства інвалідаў.
9) Кіраўніцтва і нагляд за працай коопэрацыі інвалідаў.
10) Зьмяшчэньне састарэлага элементу ў дамы інвалідаў.
11) Протэзаваньне.

**МЕНСКІ ГАРАДЗКІ САВЕТ**
**Прэзыдыум Менгарсавету**
Старшыня Гарсавету тав. Аксючыц.

Намесьнік старшыні тав. Крузмат.
Член прэзыдыуму тав. Славінскі.
Адказны сакратар тав. Пасынкоўскі.
Загадчык Менкамгасу тав. Казакевіч.
Начальнік Менгарміліцыі тав. Кроль.
Член прэзыдыуму тав. Цімашэнка.
Член прэзыдыуму тав. Аверын.
Член прэзыдыуму тав. Бяркоўскі.
Член прэзыдыуму тав. Нісенбаум.
Член прэзыдыуму тав. Максімчук.
Член прэзыдыуму тав. Цыпін.

**СЬПІС БЮРО СЭКЦЫЙ МЕНГАРСАВЕТУ**

**Комунальная сэкцыя**
Старшыня сэкцыі т. Каржанеўскі (Белжылсаюз)
Сакратар сэкцыі т. Александровіч

**Жыльлёва-будаўнічая сэкцыя**
Старшыня сэкцыі т. Фіш (рабочы-будаўнік)
Сакратары сэкцыі т. Дарафеева (МББ чыг.) і т. Грыцкевіч (Колгасбанк

**Сэкцыя РСІ**
Старшыня сэкцыі т. Максімчук (Белмэдгандаль)

**Сэкцыя працы і прамысловасьці**
Старшыня сэкцыі т. Гольдбэрг (заг. абутковай базы МЦРК)
Сакратар сэкцыі т. Райхэльсон (цукеркавая фабрыка)

**Сэкцыя соцыяльнай забясьпекі**
Старшыня сэкцыі т. Каліноўскі (інвалідн. страхкаса)
Сакратар т. Пэўзнэр (інвалідна-кравецкая майстэрня)

**Камісія пры жылстале**
Старшыня камісіі т. Сельдзіеўскі (майстэрня Акрпляну)

**Сэкцыя аховы здароўя**
Старшыня сэкцыі т. Грыб
Сакратар сэкцыі т. Зайчык (тубінстытут)

**Сэкцыя нарасьветы**
Старшыня сэкцыі т. Казакоў (музтэхнікум)
Сакратар сэкцыі т. Юдзель (Комвуз)

**Сэкцыя коопэрацыйная**
Старшыня сэкцыі т. Скрыпка (зав. «Комунар»)
Сакратар сэкцыі т. Бірыла (МЦРК)

**Сэкцыя адміністрацыйна-прававая**
Старшыня сэкцыі т. Мілікоўскі (зав. «Бальшавік)
Сакратар сэкцыі т. Лютарэвіч (Вадаканал)

**Усяго ў лік членаў менскага гарадзкога савету абрана 666 чал.**

Гарадзкія прадпрыемствы, якія знаходзіліся пад кіраўніцтвам Менскага Акруговага Выканаўчага Камітэту, цяпер пераходзяць да Менгарсавету. Пад кіраўніцтвам Менгарсавету пераходзяць прадпрыемствы, якімі ведаў аддзел мясцовай прамысловасьці (тэкстыльная фабрыка, друкарня Акадэміі Навук, лямцавая фабрыка, абутковыя майстэрні, Транспорттрэст, Эльвод і г.д.).

Комгас пераходзіць у Гарсавет як яго аддзел.

Майстэрні і прадпрыемствы Акрана таксама пераходзяць у Гарсавет (беларускі дзіцячы дом, яўрэйскі дзіцячы дом, польскі дзіцячы дом, піонэр-комуна. Майстэрні Акрана рэорганізуюцца ў фабзавучы, якія таксама будуць знаходзіцца пад кіраўніцтвам Менгарсавету).

У час выхаду справачніка прэзыдыум Менгарсавету яшчэ ня вынес пастанову аб канчатковым складзе яго аддзелаў пасьля ліквідацыі акруговых установ. Аддзелы Акрвыканкому пакуль што выконваюць свае функцыі і пераходзяць пад загад Менскага Гарадзкога Савету.

**ПАРТЫЙНЫЯ ОРГАНІЗАЦЫІ**

ЦЭНТРАЛЬНЫ КОМІТЭТ КОМУНІСТЫЧНАЕ ПАРТЫІ (бальшавікоў) БЕЛАРУСІ
(вул. Карла Маркса, № 14)
20. Сэкратар ЦК КП(б)Б т. Гэй.
10. Сэкратар ЦК КП(б)Б т. Васілевіч.
22. Кіраўнік справамі.
22. Агульная канцэлярыя, рэгістратура, экспэдыцыя і гаспадарчая частка (дадатак 2 зв.).
36. Загадчык аддзелу культуры і пропаганды.
46. Сэкратарыят.
1-76. Дзяжурны міліцыянэр.

2-43. Сэктар праверкі і інструктажу.
3-70. Загадчык аддзелам агітацыі і масавых кампаній.
4-11. Арганізатарска-інструкцыйны аддзел.
4-18. Разьмеркаваньне працаўнікоў савецкіх, саюзных і гаспадарчых устаноў (2 зв.).
4-19. Сэктар народнае асьветы, навуковае працы і сектар культпрапаганды.
7-30. Сэктар культпропу і мастацтва.
7-31. « інформацыі і статыстыкі.
10-00. « організац.-інструкт. аддзелу.
10-01. « агітацыі і масавае працы сярод рабочых і работніц гораду і вёскі.
10-08. Сэктар партбудаўніцтва.
10-02. Інструктар ЦК.
16-51. Сэктар друку культпропу.
16-44. Дасьледчы інстытут па вывучэньню гісторыі партыі і рэволюцыйнага руху
9-02. Музэй рэволюцыі і архіў ЦК, вул. Урыцкага, № 4.

**ЦЭНТРАЛЬНАЯ КОНТРОЛЬНАЯ КОМІСІЯ КП(б)Б**
*(Савецкая, 55)*
20. Старшыня ЦКК КП(б)Б т. Калнін.
7-18. Намесьнік старшыні.
2-16, 3-62. Партколегія.

**ЦЭНТРАЛЬНЫ КОМІТЭТ ЛКСМБ**
*(Карла Маркса, 14)*
4-28. Сэкратар ЦК ЛКСМБ.
1-13. Кіраўнік справамі.
8-11. Аддзел організацыйна-інструктарскі.
16-97. « адукацыі і быту, масава-экономічны аддзел.

**МЕНСКІ АКРУГОВЫ КОМІТЭТ КП(б)Б**
*(вул. Энгельса, 28)*
4-42. Сэкратар АК КП(б)Б.
4-34. Сэкратарыят.
7-56. Агульная канцэлярыя.
5-86. Дзяжурны міліцыянэр.
4-96. Інструктарская.
5-61. Заг. аддзелу разьмеркав.
5-94. Намесьнік загадчыка.
2-27. Заг. арг. інстр. аддз.
5-87. « культ. проп.
13-79. « аддз. мас. кампаній.
1-60. « сэктару інфармац. і вучоту.
17-41. « вучоту культпрацы.
17-41. « прапаганды.
13-79. « па рабоце сярод жанчын.
4-27. Менскі акруговы камітэт ЛКСМБ — Энгельса, 28.

**Фрунзаўскі райком КП(б)Б.** (Энгельса, 28)
**Кастрычнікавы райком КП(б)Б.** (Рог К. Маркса і Урыцкага, 8/11)

**ГРАМАДЗКІЯ ОРГАНІЗАЦЫІ**
1-05. Чырвоны крыж, вул. К. Маркса, 3.
9-28. ЦК памдзет пры ЦВК, Пляц Волі, 17.
1-35. Ц. С. т-ва «Прэч няпісьменнасьць», Пляц Волі, 23.
9-38. ЦК МОПР, Савецкая вул., 87.
4-09. ЦС ТСА-авіяхэму.
69. Беларускае т-ва па землеўпарадкаваньні працоўных яўрэяў, Савецкая вул., № 70.
Ц. С. бязбожнікаў, рог вул. К. Маркса і Энгельса, № 30/47, будынак Дому комуністычнае асьветы.

**ПРОФЭСІЯНАЛЬНЫЯ ОРГАНІЗАЦЫІ**
*(Пляц Волі, Палац Працы)*
**ЦСПСБ**
1-61. Габінэт старшыні ЦСПСБ.
2-65. Адказны сэкратар і сэктар кадраў.
4-71. Культсэктар.
12-75. Сэктар социяльна-бытавы.

12-75. Сэктар вытворчасьці і зарплаты.
1-29. Організацыйна-інструктарскі сэктар.
39. Аддзел статыстыкі і інформацыйны пададдзел.
12-74. Кіраўніцтва справамі.
3-45. Міжсэкцыйнае бюро інжэнэрна-тэхнічных прац.
12-33. Вартаўнічая будка.
13-22. Канцэлярыя рэспубліканскае школы профруху (пры доме ЦСПСБ).
6-37. Рэдакцыйна-выдавецкі аддзел.
9-77. Юрыдычная консультацыя.

**ЦП САЮЗАЎ**

4-08, 65. Саюз сельска-гаспадарчых працаўнікаў.
5-79. Саюз папернікаў.
1-42. Саюз дрэваапрацоўшчыкаў.
10-12, 3-43. Саюз гарбароў (скурнікаў).
3-34. Саюз мэталістаў.
4-76. Саюз друкароў.
87. Саюз харчавікоў.
3-54, 1-92. Саюз будаўнікоў.
2-50, 11, 10-19. Саюз хэмікаў.
2-68. Саюз швейнікаў.
3-52. Саюз транспартнікаў.
4-39. Саюз працаўнікоў мастацтва.
2-59, 10-57. Саюз мэдсанпрацы.
2-41, 11-62. Саюз працасьветы.
1-28, 12-21. Саюз саўгандальслужачых.
14-06, 1-91. Саюз комунальнае гаспадаркі.
13-29. Саюз чыгуначнікаў.

## КУЛЬТУРНА-АСЬВЕТНЫЯ ЎСТАНОВЫ

### ВЫШЭЙШЫЯ НАВУЧАЛЬНЫЯ ЎСТАНОВЫ

1. **Беларускі дзяржаўны унівэрсытэт,** Савецкая вул., № 33, тэл. 617.
2. **Рабочы факультэт Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту,** рог Чырвонаармейскай і Унівэрсытэцкай, № 8/42, тэл. 158.
3. **Комуністычны унівэрсытэт імя Леніна,** вул. К. Маркса, № 37, тэл. 266.
4. **Політэхнічны інстытут** будзе мець наступныя факультэты: **хэміка-тэхнолёгічны** з аддзяленьнямі тэхнолёгіі і пераапрацоўкі сельска-гаспадарчых продуктаў; сілікатным са спэцыяльнасьцямі: шкляная і грубая кераміка; тарпяным, леса-хэмічным са спэцыяльнасьцямі: каніфольна-шпігінарнай і папярова-цэлюлёіднай.

**Мэханічны факультэт** з аддзяленьнямі халоднай апрацоўкі мэталяў, станкабудаўніцтва і леса-хэмічнае аддзяленьне.

**Электра-тэхнічны факультэт** з аддзяленьнямі: прамысловай электрыфікацыі і сельскай электрыфікацыі.

**Будаўнічы факультэт** з аддзяленьнямі: фабрычна-заводзкага будаўніцтва, комунальнага будаўніцтва, колгаснага будаўніцтва, шляхавага і жыльлёвага будаўніцтва.

### ТЭХНІКУМЫ

Менскі дзярж. белпэдтэхн. імя Ігнатоўскага — Савецкая, 107.
Менскі яўрэйскі пэдтэхнікум — Няміга-Ракаўская, 9.
Менскі польпэдтэхнікум — Савецкая, 144.
Дзяржполітэхнікум — Карла Маркса, 37.
Вячэрні раб. тэхнікум — Карла Маркса, 37.
Музычны тэхнікум — Унівэрсытэцкая, 45.
Фізкультурны тэхнікум — Савецкая, 144.
Менскі дашкольны тэхнікум — Савецкая, 144.
Менскія 2-гадовыя пэд. курсы — Камсамольская, 23.

### ШКОЛЫ ГОРАДУ МЕНСКУ

Школа № 1 — Інтэрнацыянальная, 31 — беларуская.
Школа № 2 — Ленінская, 21 — беларуская.
Школа № 3 — Міхайлаўская, 4 — беларуская.
Школа № 4 — Савецкая, 95 — расійская.
Школа № 5 — Ленінская, 21 — расійская.
Школа № 6 — Доўгаброцкая, 21 — польская.
Школа № 7 — Комсамольская, 40 — яўрэйская.
Школа № 8 — Энгельса, 8 — яўрэйская.

Школа № 9 — Міхайлаўская, 4 — расійская.
Школа № 10 — Герцэна, 4 — яўрэйская.
Школа № 11 пры Белпэдтэхн., Комсам., 23 — беларуская.
Школа № 12 пры БДУ, Землябробчы зав. — беларуская.
Школа № 13 — Комунальная, 32 — беларуская.
Школа № 14 — Кошпітальная, 31/5 — беларуская.
Школа № 15 — Команульная, 31 — беларуская.
Школа № 16 — Унівэрсытэцкая, 40 (4-годка) — беларуская.
Школа № 17 — Рэвалюцыйная, 22 — яўрэйская.
Школа № 18 — Інтэрнацыянальная, 31 — яўрэйская.
Школа № 19 — Лагойскі тракт, 28 — беларуская.
Школа № 20 — Лекерта, 5 — беларуская.
Школа № 22 — Падгорны зав., 8 — беларуская.
Школа № 23 — Савецкая, 126 — беларуская.
Школа № 24 — Энгельса, 33 (4-годка) — беларуская.
Школа № 26 — Вул. Вызваленьня, 8 — беларуская.
Школа № 27 пры яўпэдтэхн., Савецкая, 44 — яўрэйская.
Школа № 28 — Комунальная, 31 — яўрэйская.
Школа № 29 — Паўночна-Заходняя, 10 — беларуская.
Школа № 30 — Рэволюцыйная, 28 — яўрэйская.
Школа № 31 пры БДУ — Землябробчы зав. — беларуская.
Школа № 32 — Загародная, 1/4 — беларуская.
Школа № 33 — Міхайлаўская, 4 — польская.
Школа № 34 — Шырокая, 49 — беларуская.
Школа № 35 — Стара-Мяшчанская, 15 (4-годка) — белар.
Школа цэнтральн.-дасьледчая — Савецкая, 113.
« практ.-паказ. пры польпэдтэхн. — Доўгаборская, 21.

**ПРЫГАРАДНЫЯ ЧАТЫРОХГОДКІ**

Школа № 36 — Вялікасьляпянская — В. Сьляпянка.
Школа № 37 — Пятроўшчынская — Пятроўшчына.
Школа № 38 — Маляўская — Маляўка.
Школа № 39 — Чырвона-Слабодзкая — Ч. Слабада.
Школа № 40 — М. Сьляпянская — М. Сьляпянка.
Школа № 41 — Лошыца-Немаршанская — Л. Немаршанская.
Школа № 42 — Азярышчына-Сьляпянская — А. Сьляпянка.
Школа № 43 — Нядзьвежынская — Нядзьвежына.
Школа № 44 — Нядзьвежынская яўрэйская — Нядзьвежына.
Школа № 45 — Кавальварыйская — Кальварыя.
Школа № 46 — Хмарынская — Кальварыя.
Школа № 47 — Зялёна-дубская — Кальварыя.
Школа № 48 — Кальварыйская — Кальварышкі.

**ЧЫГУНАЧНЫЯ ШКОЛЫ**

Дзевяцігодка імя Чарвякова — Савецкая, 44.
Школа МББ ж. д. — Таварная, МББ.

**ФЗУ І ПРОФШКОЛЫ**

Стройвуч пры зав. «Бальшавік».
Стройвуч пры зав. «Энэргія».
Школа-фабрыка Меншвей — Ленінская вул.
ФЗУ друкароў.
Профшкола аб'ядналая — Валадарскага, 25.
Школа будаўнікоў — Нова-Маскоўская, 76.
Школа швейнікаў — Пролетарская, 4.
Школа хэмікаў — Землябробчы завул.
Школа агнятрывал. будаўніцтва — Міхайлаўская, 4.
Школа музычная — Лекерта, 5.
Школа канторвучу — Міхайлаўская, 4.
Профшколы кулінарыі — Загародная, 1/14.

**СПЭЦКЛЯСЫ**

Бухгальтарскія курсы — Міхайлаўская, 4.
Рахункаводна-коопэр. курсы — Комсамольская, 40.
Курсы агнятрывалага будаўніцтва — Міхайлаўская, 4.

**ВЯЧЭРНІЯ ШКОЛЫ ПАДВЫШАНАГА ТЫПУ**

Школа № 1 — Міхайлаўская, 4.
Школа № 2 — Інтэрнацыянальная, 31.
Школа № 3 — Савецкая, 44.
Школа № 4 — Падгорны зав., 8.
Школа № 5 — Энгельса, 8.
Школа № 6 — Рэвалюцыйная, 22.
Школа № 7 — Комсамольская, 40.
Школа № 8 — Загародная, 1/14.

**ВЯЧЭРНІЯ ШКОЛЫ ПЕРШАЙ СТУПЕНІ**

Школа № 1 — Міхайлаўская, 4.
Школа № 2 — Падгорны зав., 8.
Школа № 3 — Комунальная, 31.
Школа № 4 — Рэвалюцыйная, 28.
Школа № 5 — Герцэна, 4.

**НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧЫЯ ЎСТАНОВЫ**

1. **БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК**

... Гэта праца пачалася адначасова. На Ляхаўцы адчыніўся першы чыгуна-літоўны завод “Энэргія”, задымілі трубы гарбарных заводаў. У тыя хвіліны, калі пачалі закладваць першыя цэглы соцыялістычнай прамысловасьці, пачалі закладваць фундамэнт і пролетарскай культуры.

Адным з найбольш вялізарных культурных дасягненьняў Савецкай Беларусі зьяўляецца ўтварэньне Беларускай акадэміі навук — першай акадэміі, утворанай у СССР за часы пролетарскай рэволюцыі.

Шлях утварэньня акадэміі — шлях перамог і барацьбы працоўных БССР.

Аб неабходнасьці організацыі ў БССР цэнтральнай навукова-дасьледчай установы ўзьнікла думка яшчэ ў 1921 годзе. 27 студзеня 1921 г. на сходзе культурных працаўнікоў, скліканым Народным комісарыятам асьветы БССР, загаварылі аб організацыі навуковай установы ў БССР, якая-б займалася вывучэньнем мовы, літаратуры і мэтодолёгічнымі пытаньнямі.

Гэта пытаньне было падхоплена ўсімі працоўнымі БССР. Зразумела, у той час, калі не хапала сродкаў, калі культурныя сілы яшчэ былі раскіданы, адразу немагчыма было ўтварыць буйную навуковую ўстанову, але першая цэгла была закладзена. 10 лютага 1921 г. СНК БССР зацьвердзіў утварэньне навукова-тэрмінолёгічнай комісіі, якая пачала вялікую працу па вывучэньні багацьцяў беларускай мовы.

У пачатку 1921 г. быў утвораны інстытут беларускай культуры. Інстытут з першых жа дзён свайго існаваньня разгарнуў творчую працу па ўзмацненьні беларускай пролетарскай культуры, прасоўваючы культуру ў масы працоўных.

Інстытут разгарнуў глыбокую навуковую працу: пасылаліся экспэдыцыі, склікаліся навуковыя зьезды, праводзіліся гісторычныя раскопкі.

Інстытут праводзіў вялікую краязнаўчую працу. У 1924 г. у сувязі з утварэньнем цэнтральнага краязнаўчага бюро гэта праца разгарнулася яшчэ шырэй.

Інстытут беларускай культуры набыў вялікае значэньне для БССР і ў 1926 г., згодна пастанове ЦВК і Саўнаркому БССР быў рэорганізаваны па загаду Наркомасьветы ў самастойную ўстанову, якая знаходзілася непасрэдна пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі.

Адным з буйных мерапрыемстваў інстытуту беларускай культуры, праведзеных у гэтыя гады, было скліканьне акадэмічнай конфэрэнцыі па рэформе беларускага правапісу і азбукі. У конфэрэнцыі прымалі ўдзел 69 дэлегатаў. Былі прадстаўнікі замежнага навуковага сьвету. Конфэрэнцыя прапрацавала шэраг галоўнейшых пытаньняў беларускага правапісу, заслухала даклады па гісторыі беларускай літаратуры.

Прадстаўнікі замежнага навукова-літаратурнага сьвету (сярод гасьцей быў і вядомы латвійскі поэт Ян Райніс) была азнаёмлены з дасягненьнямі маладой Савецкай Беларусі, адбудаванай намаганьнямі працоўных Беларусі пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі.

У 1926 г. бюро ЦК КП(б)Б заслухала даклад аб дзейнасьці інстытуту беларускай культуры. Бюро ЦК КП(б)Б адзначыла шэраг дасягненьняў у працы інстытуту і знайшло неабходным узяць курс на рэорганізацыю інстытуту беларускай культуры ў акадэмію навук.

Два гады цягнулася ўзмоцненая падрыхтоўка да гэтай рэорганізацыі, і 23 кастрычніка была выдана пастанова ЦВК і Саўнаркому БССР аб рэорганізацыі. Рэорганізацыя павінна была закончыцца да 1 студзеня 1929 г.

1 студзеня 1929 г., у дні сьвяткаваньня дзесяцігодзьдзя аглашэньня БССР, у Менску адбылося ўрачыстае адчыненьне Беларускай акадэміі навук.

У сучасны момант Беларуская акадэмія навук (Менск, рог Ленінскай і Унівэрсытэцкай, № 27/35) падзяляецца на два аддзелы: аддзел гуманітарных навук і аддзел прыроды і народнай гаспадаркі.

У аддзел гуманітарных навук уваходзяць: інстытут лінгвістыкі, катэдра жывой беларускай мовы, інстытут навуковай мовы, катэдра гісторыі беларускай мовы, комісія для ўскладаньня гісторычнага слоўніку, інстытут літаратуры — катэдра гісторыі беларускай літаратуры, комісія па выданьню твораў

беларускай літаратуры, інстытут гісторычных навук з катэдрамі: усеагульнай гісторыі, гісторыі Беларусі, гісторыі беларускага права, сучаснага беларускага права, археолёгіі, этнографіі, марксызму і ленінізму, гісторыі Літвы, комісіяй па вывучэньню латышоў.

У аддзел прыроды і гаспадаркі Беларускай акадэміі навук уваходзяць: геолёгічны інстытут, катэдра глебазнаўства, катэдра ботанікі, зоолёгіі, антраполёгіі, географіі, інстытут хэміі, інстытут экономікі, комісія па вывучэньню рамесьніцтваў, катэдра коопэрацыі і колектывізацыі.

Яўрэйскі сэктар акадэміі складаецца з комісій: гісторычнай, лінгвістычнай і літаратурнай і комісіі па этнографіі і фольклёру. Апрача яўрэйскага сэктару, ёсць польскі сэктар.

Цэнтральнае краязнаўчае бюро, якое існуе пры акадэміі, мае свой орган — часопіс "Наш край". У склад акадэміі ўваходзяць: У. М. Ігнатоўскі — прэзыдэнт акадэміі, М. І. Бялуга — віцэ-прэзыдэнт, Я. Колас — віцэ-прэзыдэнт акадэміі, І. А. Пятровіч — неадменны сэкратар акадэміі, С. М. Некрашэвіч, Я. Ю. Лёсік, З. Т. Жылуновіч, І. І. Замоцін, У. І. Пічэта, С. Я. Вольфсон, М. Я. Грэдынгэр, С. Ю. Матулайціс, В. Я. Ластоўскі, Г. І. Гарэцкі, Я. Купала, У. В. Шкатэлаў, Я. М. Афанасьеў (Горкі), А. Д. Дубах, С. М. Вышалеўскі, М. Т. Бліодуха, Б. Тарашкевіч, А. П. Карпінскі (Ленінград), М. Я. Мар (Ленінград).

Апрача таго, акадэмія мае шэраг членаў-корэспондэнтаў.

Бібліотэка акадэміі навук налічвае звыш 50.000 тамоў кніг. Наладжан абмен выданьняў з акадэміямі навук, якія існуюць у СССР і шэрагам замежных акадэмій.

У гэтым годзе на Камароўцы распачалася пабудова новых будынкаў для беларускай акадэміі навук. Пабудова будынкаў будзе каштаваць звыш 2 з паловай мільёнаў руб.

### 2. БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧЫ ІНСТЫТУТ СЕЛЬСКАЙ І ЛЯСНОЙ ГАСПАДАРКІ ІМЯ Ў. І. ЛЕНІНА

*(Шырокая вул., № 28)*

Інстытут працуе з 1927 году пад загадам Савету народных камісараў і зьяўляецца вышэйшай навукова-дасьледчай установай як у галіне тэорытычных дасьледваньняў, так і ў справе вырашэньня практычных проблем сельскай і лясной гаспадаркі. Інстытут мае на мэце сыстэматычнае і ўсебаковае вывучэньне сельскай і лясной гаспадаркі шляхам стацыянарных і экспэдыцыйных дасьледваньняў ды распрацоўкі навуковых літаратурных матар'ялаў. Яму належыць кіраўніцтва і ўзгадненьне ўсіх дасьледчых прац на Беларусі як паасобных установаў, так і самастойных дасьледчыкаў, якія займаюцца вывучэньнем сельскай і лясной гаспадаркі на данай тэрыторыі: апрача гэтага, інстытут кіруе працаю сялян-дасьледчыкаў. Інстытут складаецца з 5 асноўных аддзелаў: а) жывёлагадоўлі і прыкладной зоолёгіі, б) расьлінагадоўлі і прыкладной ботанікі, в) лясной гаспадаркі, г) мэліорацыі і культуры балот, д) сельска-гаспадарчай эканомікі і аграрнай політыкі. Інстытут мае вялізную бібліотэку. Пад загадам аддзелаў інстытуту працуе шэраг дасьледчыкаў станцый на провінцыі і ў Менску. Кароткія весткі аб апошніх ніжэй.

### 3. ЦЭНТРАЛЬНАЯ РАСЬЛІНАВОДНАЯ ДАСЬЛЕДЧАЯ СТАНЦЫЯ

*(Праўленьне станцыі — Шырокая вул., № 28)*

Цэнтральная расьлінаводная дасьледчая станцыя навукова-дасьледчага інстытуту сельскай і лясной гаспадаркі мае на мэце: а) дасьледваньне шляхоў і спосабаў павялічэньня ўраджайнасьці, б) генэтычнае, ботанічнае і біолёгічнае вывучэньне асобных гатункаў расьлін у глебава-кліматычных умовах БССР, в) організацыю працы інстытуту сялян-дасьледчыкаў, г) дапамогу цэнтральным і акруговым зямельным установам у распрацоўцы агрокультурных мерапрыемстваў, д) консультацыю па розных пытаньнях расьлінагадоўлі і г.д. Станцыя працуе ў складзе 3 аддзелаў: а) паляводзтва з пададдзелам кармавых культур, б) генэтыкі з сэлекцыяй і насеннаводзтвам, в) ужыткоўнага. Праца аддзелаў адбываецца на дасьледчых палёх станцыі: а) Пярэспа (Стара-Віленскі шлях, № 73), б) Антоліна (14 кл. ад Менску па Койданаўскім шляху), в) Малая Сьляпянка (па Барысаўскім шляху, 2 клм. ад Менску).

### 4. ЦЭНТРАЛЬНАЯ ДАСЬЛЕДЧАЯ СТАНЦЫЯ АХОВЫ РАСЬЛІН

*(Шырокая вул., № 28)*

Гэта станцыя навукова-дасьледчага інстытуту сельскай і лясной гаспадаркі мае на мэце: а) вывучэньне шкодных казурак і грызуноў, а таксама вывучэньне хвароб расьлін, в) распрацоўку мерапрыемстваў у справе змаганьня са шкоднікамі і хваробамі расьлін. Станцыя мае шмат цікавых колекцый.

### 5. ЦЭНТРАЛЬНАЯ БАЛОТНАЯ СТАНЦЫЯ

*(Праўленьне станцыі — Шырокая вул., № 28)*

Гэта станцыя навукова-дасьледчага інстытуту сельскай і лясной гаспадаркі мае на мэце ўсебаковае вывучэньне балот Беларусі і спосабаў іх скарыстаньня. Сваю працу станцыя праводзіць на Камароўскім балоце, 4 клм. на поўнач ад Менску. Гэта балота зьяўляецца надзвычайна цікавым.

### 6. ЦЭНТРАЛЬНАЯ АГРО-ХЭМІЧНАЯ ЛЯБОРАТОРЫЯ

*(Шырокая вул., № 28)*

Гэта лябораторыя навукова-дасьледчага інстытуту мае на мэце ўсебаковае агро-хэмічнае вывучэньне сельскай і лясной гаспадаркі шляхам распрацоўкі паасобных тэм, організацыйна зьвязаных з палявымі і вэгетацыйнымі досьледамі, а таксама хэмічнае і фізычнае дасьледваньне ў галіне хэміі, глеб, вады, паветра. Асабліва цікавае абсталяваньне лябораторыі ў галіне агро-фізыкі.

7. **КОНТРОЛЬНА-НАСЕННАВОДНАЯ СТАНЦЫЯ**
*(Савецкая вул., № 71, пакоі 31 і 32)*

Гэта станцыя Народнага комісарыяту земляробства зьяўляецца практычнай і навукова-дасьледчай установай па вызначэньні якасьці насеньня. Экскурсант можа бачыць працэс вызначэньня якасьці насеньня, усходжасьці, хваравітасьці і г.д. Глебавае вывучэньне якасьці насеньня выконваецца на расьлінаводнай станцыі гаспадаркі: Пярэспа, па Стара-Барысаўскім шляху, 2 кл ад Менску.

8. **ІНСТЫТУТ ФІЗЫЯТРЫІ І ОРТАПЭДЫІ**
*(Вул. Валадарскага, № 16)*

Інстытут вырас з невялічкай клінікі па нэрвовых хваробах. Новы інстытут зьяўляецца цэнтрам навуковай думкі Беларусі ў галіне нэўрапаталёгіі. Інстытут складаецца з раду аддзяленьняў і стацыянараў — фізыка-тэрапэўтычнага, ортапэдычнага, нэрвовай клінікі, псыхіка-нэўралёгічнага дыспансэру.

Пры інстытуце будзе абсталяваны спэцыяльны дыспансэр са стацыянарам для наркоманаў.

Інстытут абсталяваны па апошняму слову мэдыцынскай навукі і тэхнікі і мае аддзяленьні — электра-сьветавога лячэньня, штучнага горнага сонца, гразелячэньня і г.д. Некаторыя віды фізычных мэтадаў лячэньня, як спэцыяльныя ваны і гразелячэньне прымяняюцца ў Беларусі ўпяршыню.

9. **БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ СОЦЫЯЛЬНАЙ ГІГІЕНЫ**
*(Інтэрнацыональная, № 21)*

Інстытут працуе з 1927 году і мае на мэце: а) вывучэньне ўплыву соцыяльна-экономічных умоў на здароўе насельніцтва, б) зьбіраньне і распрацоўку антропомэтрычных матар'ялаў, в) распрацоўку розных спэцыяльных пытаньняў у галіне мэдычна-санітарнай статыстыкі і санітарнай асьветы, г) навуковае ўгрунтаваньне мерапрыемстваў у справе організацыі аховы здароўя і соцыяльна-гігіенічнага заканадаўства.

10. **ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ АХОВЫ ПРАЦЫ**
*(Рог К. Маркса і Энгельса, № 44/23)*

Інстытут мае на мэце вывучэньне ўсіх умоў працы, якія могуць мець уплыў на здароўе работніка, а таксама тых запатрабаваньняў, якія вымагаюцца ад організму ў залежнасьці ад тых ці іншых умоў працы.

Інстытут мае наступныя лябораторыі і аддзелы: а) лябораторыю прамысловай гігіены, якая дасьледуе мэтэоролёгічныя факты, асьвятленьне, прамяністую энэргію, вытворчы пыл, газы і іншае, б) лябораторыю фізыолёгіі працы, якая вывучае ўплыў працы на організм пры розных умовах (біолёгічных, надворных і соцыяльных), в) псыхо-тэхнічную лябораторыю, якая вывучае профэсіі і складае індывідуальныя псыходыяграмы, г) аддзел організацыі працы, што вывучае рацыянальную організацыю працы ў вытворчасьці і ўстановах, д) спортыўны габінэт, які вывучае траўматызм, інваліднасьць і часовую непрацаздольнасьць у розных галінах вытворчасьці, е) музэй працы, які зьбірае экспонаты, што характарызуюць мясцовую прамысловасьць і дзейнасьць інстытуту. Апрача навуковай працы, інстытут вядзе і практычную ў справе аховы працы.

11. **БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ СУХОТНЫ ІНСТЫТУТ**
*(Інтэрнацыянальная вул., № 21/25)*

Інстытут мае на мэце навуковую організацыю барацьбы з сухотамі, вывучэньне мэтодаў лячэбнай і соцыяльна-бытавой барацьбы з сухотамі, ды вывучэньне ўсіх пытаньняў, зьвязаных з гэтай хваробай наогул. Інстытут складаецца з наступных аддзелаў: а) сухотнага дыспансэру, б) стацыянарнага аддзяленьня на 60 ложкаў і в) аддзелу соцыяльнай паталёгіі, які вывучае распаўсюджваньне сухотаў.

12. **СУХОТНЫ ДЫСПАНСЭР**
*(Вул. Урыцкага, № 3)*

Сухотны дыспансэр зьяўляецца часткаю сухотнага інстытуту. Ён мае на мэце барацьбу з сухотамі ў Менску і Меншчыне. Дыспансэр складаецца з наступных габінэтаў: а) лекавага, б) кварцавага, в) рэнтгенаўскага і г) патронажнага. Апошні габінэт аглядае хворых дома, вывучае соцыяльна-бытавы стан хворых, сьмяротнасьць ад сухот і г.д. Апрача таго, пры дыспансэры існуе савет соцыяльнай дапамогі, які складаецца з прадстаўнікоў рабочых і змагаецца з сухотамі на прадпрыемствах.

13. **ХЭМІЧНА-ТЭХНІЧНАЯ ЛЯБОРАТОРЫЯ**
*(Рэволюцыйная вул., № 21/1)*

Лябораторыя мае сваёю задачаю: а) дасьледваньне якасьці сыравіны, мінэральнага і іншага апалу і дапаможных матар'ялаў, патрэбных для прамысловасьці, б) дасьледваньне якасьці продукцыі прамысловых прадпрыемстваў, в) дасьледваньне якасьці капальняў, г) вывучэньне пытаньняў, зьвязаных з памяншэньнем колькасьці сыравіны.

14. **КЕРАМІЧНАЯ ЛЯБОРАТОРЫЯ**
*(Комсамольская вул., № 9/12)*

Керамічная лябораторыя дасьледуе розныя пароды глін на прадмет выраба простай цэглы, чарапіцы, клінкэру, каналізацыйных труб, простага ганчарнага начыньня, парцаляны і г.д. Апрача таго, у лябораторыі працуе ганчарны варштат і печ для апальваньня вырабаў з гліны.

15. **ПАЛАТА МЕР І ВАГІ**
*(Провадная, 6)*
Палата мер і вагі правярае правільнасьць самых розных мерак, вагі, прастору, ціску, тэмпэратуры, часу і г.д. і вывучае ўмовы парушэньня гэтай правільнасьці. Зьяўляецца надзвычайна цікавай сваім абсталяваньнем і процэсам працы.

16. **БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ НАВУКОВА-ДАСЬЛЕДЧЫ ПЭДОЛЁГІЧНА-ПЭДАГОГІЧНЫ ІНСТЫТУТ**
Інстытут організуецца народным комісарыятам асьветы і адпаведна проекту статуту мае надзвычайна шырокія задачы ў галіне дасьледваньня пытаньняў пэдолёгіі і пэдагогікі.

17. **БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ІНСТЫТУТ ПРАМЫСЛОВАСЬЦІ**
*(Рэволюцыйная, 1)*
Савет народных комісараў зацьвердзіў статут гэтага інстытуту, які мае на мэце ўсебаковае дасьледваньне прамысловасьці і зьвязаных з ёю пытаньняў. Інстытут знаходзіцца ў стадыі організацыі.

18. **БАКТЭРЫОЛЁГІЧНЫ ПАСТЭРАЎСКІ ІНСТЫТУТ**
*(Нова-Маскоўская вул., № 60, тэл. 2-04)*
Апрача сваіх лячэбных і профіляктычных функцый, бактэрыолёгічны пастэраўскі інстытут выконвае значную працу ў справе вывучэньня географічнага пашырэньня выпадкаў шалёнства на Беларусі і ўсіх зьвязаных з гэтым пытаньняў.

19. **ОДОНТОЛЁГІЧНЫ ІНСТЫТУТ**
*(Рэволюцыйная, 20)*

20. **МЕНСКАЕ АКРУГОВАЕ ТАВАРЫСТВА КРАЯЗНАЎСТВА**
*(Ракаўская вул., № 2)*
Таварыства заснавана ў 1924 годзе ў складзе наступных сэкцый: а) культурна-гісторычнай, б) прыродна-географічнай, в) грамадзка-экономічнай і г) школьна-краязнаўчай. Таварыства выканала надзвычайна вялікую організацыйна-краязнаўчую працу, а таксама значную зьбіральніцкую і навукова-дасьледчую. Сабраны значныя колекцыі для будучага музэю Менску і Меншчыны. Выдадзена праца — "Лагойскі раён".

**МУЗЭІ, ГАБІНЭТЫ, ВЫСТАЎКІ**

1. **БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЭЙ**
*(Чырвонаармейская вул., "Дом селяніна")*
Да рэволюцыі ў Менску было 2 музэі: царкоўна-археолёгічны, які быў заснаваны ў 1907 годзе і за 7 год свайго існаваньня сабраў 1363 экспонаты і 1900 кніг, і музэй менскага таварыства аматараў прыродазнаўства, этнографіі і археолёгіі, які меўся скласьці аснову гарадзкога музэю. Пасьля Кастрычнікавай рэвалюцыі 20 студзеня 1919 году быў адчынены трэці, па часе заснаваньня, Беларускі краёвы музэй.

... У 1921 годзе краёвы музэй зачыніўся. На яго месцы быў адчынены сучасны Беларускі дзяржаўны музэй. 31 жніўня 1923 году музэй быў адчынены для агляду. За час з 1923 да 1928 году музэй сабраў 16445 новых экспонатаў; за гэты час музэй аглядала 68.645 наведвальнікаў. Музэй імкнецца стаць сапраўднай катэдрай соцыялістычнага гаспадарчага і будаўнічага жыцьця Беларусі. Зараз музэй складаецца з наступных аддзелаў: археолёгіі, зброі, нумізматыкі, старога Менску, этнографіі, мастацтва і яўрэйскага. Аддзел археолёгіі, у сваю чаргу, складаецца з пададдзелаў: палеолітычнага, які зьмяшчае ў сабе рэшткі мамантаў, пячэрнага мядзьведзя, пясца і д. т. п. і крамнёвыя прылады; нэолітычнага, што зьмяшчае надзвычайна багатую колекцыю крамнёвых прылад і керамікі; мэталёвага (часоў бронзы і жалеза), у якім паказаны колекцыі керамікі, крамнёвых прылад і каменных шліфаваных вырабаў. У багатым аддзеле зброі паказаны галоўныя моманты ў зьмене тэхнікі ўзбраеньня ад XVI да XIX стагодзьдзя. Аддзел нумізматыкі мае каля 18.000 тысяч монэт, якія паказваюць старажытныя беларускія дзяржаўныя грошы, а таксама чужаземныя, што сьведчаць аб гандлевых зносінах Беларусі. Аддзел старога Менску паказвае быт розных пластоў насяленьня Менску старых часоў. Цікавая гравюра Менску пачатку XIX стагодзьдзя. Ёсьць вырабы менскіх рамесьнікаў XVII і XIX стагодзьдзя. Аддзел этнографіі на помнік матар'яльнай культуры паказвае беларускі сялянскі быт і мастацтва. Ён складаецца з колекцый: ткацтва, керамікі, бандарства, вагі і мерак, прамысловасьці, набойкі, пернікарства, вопраткі, разьбы, гаспадарчых хатніх прылад, цацак, музычных інструмантаў, батлейкі, дзявочых аздоб, вырабаў з саломы, паясоў і вышывак. Аддзел мастацтва мае колекцыі беларускага дарэволюцыйнага і рэволюцыйнага мастацтва, расійскага мастацтва і заходня-эўропейскага. Ёсьць працы Рэпіна, Серава, Макоўскага, Свэнэвэльда (Голандыя XVIII в.), Шэфэра (Нямеччына, XX в.), Росі (Італія XIX в.) і інш. ды Грубэ, Воўкава, Эндэ, Філіповіча, Кудрэвіча і інш. Яўрэйскі аддзел вельмі багата паказвае матар'яльную культуру беларускіх яўрэяў і творы сучасных яўрэйскіх мастакоў ды яўрэйскае ўжытковае мастацтва. Для агляду музэй адчынены 5, 10, 15, 20, 25, 30 кожнага месяца ад 5—9 гадз. увечары, а ў іншыя дні — ад 12 $^{1}/_{2}$ — 4 гадз. Загадзя запісаўшыся, экскурсіі праходзяць дарма; чырвонаармейцы і вучні плоцяць па 5 кап.; сябры профсаюзаў — 10 кап. і інш. — 20 кап.

2. **МУЗЭЙ РЭВОЛЮЦЫІ**
*(Вул. Урыцкага, № 4/А)*
Для агляду музэй адчынены быў 2 траўня 1926 году. Да гэтага часу была праведзена значная зьбіральніцкая праца. Зараз музэй даволі поўна паказвае рэволюцыйны рух ад дэкабрыстых да апошніх часоў. Паказана

таксама пара Пугачова і Разіна. Час дэкабрыстых паказаны ў портрэтах, тагочаснай літаратуры і фотографіях. Таксама поўна экспонавана пара пэтрашэўцаў і народнікаў. Але найбольш яскрава экспонаваны соцыял-дэмократычны рух. Ёсьць вельмі цікавыя матар'ялы аб жыцьці і дзейнасьці У. І. Леніна. Багата прадстаўлена Лютаўская і Кастрычнікавая рэволюцыі ды чырвоны партызанскі рух. Музэй адчынены для агляду штодзённа ад 13 да 19 гадзін, апрача панядзелка і аўторка.

3. **ДОМ ПЕРШАГА ЗЬЕЗДУ РСДРП**

*(Савецкая вул., № 137)*

Гэта вуліца называлася тады, у гонар аднаго з губэрнатараў, Захараўскай. На Камароўцы, пасьля масточка цераз Сьвіслач, рассыпаліся тут маленькія дзеравяныя домікі, агароджаныя дзеравянымі платамі. А далей, там, дзе цяпер вырасьлі павільёны выстаўкі і высяцца корпусы клінічнага гарадку, пачыналася топкае, вязкае камароўскае балота.

Тут, на Камароўцы, жыў у тыя гады контролёр Лібава-Роменскай чыгункі Пётра Базылёў Румянцаў.

Невялікі дзеравяны домік, сьпераду нізенькі плоцік, побач маладое дрэва мала чым маглі прыцягнуць чыю-небудзь увагу.

Але ў гэтым доміку здарыліся падзеі, якія рэзка вызначылі яго ад усіх яго суседзяў, падзеі, якія пакінулі глыбокі сьлед на старонках гісторыі клясавай барацьбы.

"Адзін раз, у сакавіку 1898 г., да мяне зайшла Аўгеня Адольпаўна Гурвіч і кажа, што патрэбна кватэра для надта консьпіратыўнага сходу, чалавек на 10—12, і яна лічыць, што мая кватэра была бы падыходзячай для гэтага. Я, зразумела, згадзіўся. Мая кватэра знаходзілася тады на Захараўскай вуліцы ў доме Ржэцкай № 135 (цяпер № 137) і складалася з чатырох пакояў", — расказвае Румянцаў, — гаспадар кватэры. Ён нават ня ведаў тады, што прадастаўляе яе для паседжаньняў 1-га зьезду РСДРП. Даведаўся ён аб гэтым пазьней, калі вячэрнімі часамі "прагульваўся" недалёка ад сваёй кватэры, ахоўваючы пасяджэньне зьезду.

На зьезд прыбылі прадстаўнікі буйнейшых соцыял-дэмократычных організацый, якія існавалі ў той час.

1. Пецярбурскі саюз барацьбы за аслабаненьне рабочае клясы. — С. Радчэнка.
2. Маскоўскі саюз барацьбы — Ваноўскі.
3. Кіеўскі саюз барацьбы — П. Тучанскі.
4. Харкаўскі саюз барацьбы.
5. Екацерынаслаўскі саюз барацьбы — Пятрусевіч.
6. Група "Рабочай газэты" — Эйдэльман, Вігдорчык.
7. Замежны саюз РСДРП.
8. Усеагульны яўрэйск. раб. саюз у Расеі і Польшчы (Бунд) — Крэмер, Мутнік, Касоўскі.

Працаваць зьезду прыходзілася захоўваючы самую строгую консьпірацыю. Працавалі з 6 да 12 гадз. ночы. Вакеніцы былі наглуха зачынены. Сярод вялікага пакою стаяў пакрыты белым настольнікам стол, а на ім устаўлена было ўсё, што патрэбна было для вясёлай гулянкі. Увесь час весела трышчэла вялікая галяндэрская печ. Калі наскочыць паліцыя, дык ад усіх папер, рэзолюцый, проектаў застанецца адзін попел.

На першым зьезьдзе не пасьпелі выпрацаваць програмы партыі, а абмежаваліся складаньнем маніфэсту Расейскай соцыял-дэмократычнай рабочай партыі, які быў апублікаваны толькі ў 1903 г.

На апошнім урачыстым пасяджэньні зьезду, 1-га сакавіка 1898 г. (стары стыль) быў абраны першы Цэнтральны комітэт партыі ў складзе Эйдэльмана, Радчэнка і Крэмера. У той жа вечар некаторыя дэлегаты разьехаліся, а праз некалькі месяцаў амаль усе ўдзельнікі зьезду, за выключэньнем Радчэнкі, былі арыштаваны, у тым ліку быў арыштаваны і гаспадар кватэры Румянцаў.

Вясной 1923 г., у 25-гадовы юбілей нашай партыі, стараньнямі Гістпарт'у ЦК КП(б)Б домік на Савецкай вул. № 137 быў адрамантаваны і захаваны для гісторыі.

Пасьля рэстаўрацыі домік амаль не зьмяніўся. Толькі дзеравяная агароджа была заменена жалезнай, і над крайнім вакном прыбіта мармуровая дошка, на якой залатымі літарамі выведзены прозьвішчы 9 удзельнікаў зьезду.

Унутры доміку чыста і ціха. На сьценах пакою, у якім адбываўся зьезд, вісяць портрэты ўдзельнікаў яго. У другіх пакоях — портрэты паўшых за справу партыі пад яе сьцягамі.

4. **ЗООЛЁГІЧНЫ МУЗЭЙ**

*(Шырокая, 28)*

Зоолёгічны музэй Беларускай акадэміі навук адчынены 7 лістапада 1927 году. Ён зьяўляецца значным асяродкам вывучэньня фаўны Беларусі і захоўваньня матар'ялаў, сабраных у часе навуковых экспэдыцый. Апрача таго, музэй популярызуе фаўну Беларусі і яе ахову. Музэй складаецца з 2 аддзелаў: а) навуковага, дзе знаходзяцца колекцыі, на падставе якіх вывучаецца і апісваецца фаўна Беларусі і б) выставачнага, дзе багата прадстаўлены сысуны, птушкі і рыбы. Адчынены музэй па чацьвяргох і суботах ад 11 да 14 гадзін і ў нядзелю ад 11 да 15 гадзін.

5. **ДОМ САНІТАРНАЙ АСЬВЕТЫ**

*(Пляц Волі, № 23/2)*

Дом організаваны ў 1921 годзе з мэтаю пашырэньня сярод насельніцтва біолёгічных і санітарна-гігіенічных ведаў. Дом мае: а) санітарна-асьветнае абсталяваньне музэйнага тыпу для агляду экскурсіямі, б) перасовачны матар'ял для абслугоўваньня провінцыі і в) бібліотэку. Музэйная частка дому складаецца з наступных аддзелаў:

а) анатоміі і фізыялёгіі, б) гігіены, в) прафэсіянальнай гігіены, г) інфэкцыйных хвароб, д) соцыяльных хвароб, дз) школьніка, е) аховы матак і дзяцей. Для агляду дом адчынены штодзённа ад 12 да 15 гадзін і ад 18 да 20 гадзін.

6. **ЦЭНТРАЛЬНЫ ДОМ СЕЛЯНІНА**
*(Рог вул. К. Маркса і Чырвонаармейскай)*
Цэнтральны дом селяніна знаходзіцца ў новапабудаваным спэцыяльным будынку, які структураю і дапасаванасьцю да абслугоўваньня сялянскіх патрэб зьяўляецца лепшым у СССР. Пры доме існуе: а) інтэрнат на 164 чал., б) сталоўка, в) сельска-гаспадарчы музэй і музэй дзяржаўнага страхаваньня, г) ленінскі, д) санітарны, дз) антырэлігійны і е) вайскавыя куткі, а таксама э) бібліотэка, ё) чытальня, ж) заля на 400 чал. Асабліва цікавы музэй, які паказвае сельскую гаспадарку і магчымасьці і спосабы яе палепшаньня. Экскурсіі ў дом магчымы па папярэдняй умове з адміністрацыяй дому.

7. **ЦЭНТРАЛЬНЫ ДОМ КОМУНІСТЫЧНАЕ АСЬВЕТЫ ІМЯ К. МАРКСА**
*(Рог вул. К. Маркса і Энгельса)*
Дом комасьветы мае прыгожую залю, шмат добра абсталяваных рабочых пакояў, багатую бібліотэку і г.д. З 1925 году ў Доме функцыянуе музэй катаргі і ссылкі, організаваны Менскім таварыствам політкатаржан і ссыльных. Пасяленцаў у музэі сабраны розныя экспонаты ад народніцтва да часоў кастрычнікавай рэволюцыі. Апрача таго, у доме існуе антырэлігійны выставачны куток. У фойэ ёсьць найвялікшая ў БССР скульптура Ў. І. Леніна, работы Грубэ. Экскурсіі — па ўмове з адміністрацыяй дому.

8. **ДОМ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ**
*(Вул. Энгельса, № 26)*
Дом адчынены ў 1927 годзе. У ім працуе надзвычайна цікавы вялізны вайсковы габінэт, які складаецца з трох аддзелаў: а) іполёгічнага, у якім разьмешчаны плякаты, модэлі, картаграмы і д.т.п., як даглядаць каня, чым карміць, як падкоўваць, лячыць і ахоўваць ад газаў і г.д.; б) тактычна-стралковага з колекцыяй зброі, паляўніцтва і тыру; тутака можна бачыць ня толькі гісторыю рознай зброі, але і спосабаў ратаваньня ад яе; в) тэхнічна-вайсковага з авіацыйна-хэмічным пададдзелам, дзе можна знаёміцца з відам газаў і спосабамі ратаваньня ад іх і інш. Экскурсіі ў Дом магчымы пасьля ранейшай умовы з адміністрацыяй Дому.

## КЛЮБЫ

1. **Цэнтральны Дом працаўнікоў асьветы**, Комуністычная вул., № 19.
2. **Цэнтральны Дом комуністычнае асьветы імя К. Маркса**, вул. К. Маркса, № 10/47.
3. **Цэнтральны польскі клюб імя Розы Люксэмбург**, рог вул. Урыцкага і К. Маркса, № 11/33.
4. **Цэнтральны яўрэйскі клюб імя Ў. І. Леніна**, рог вул. Урыцкага і К. Маркса, № 11/13.
5. **Дом комсомолу імя КІМ**, Комсомольская вул., № 25.
6. **Клюб саўгандальслужачых**, рог Комуністычнай і Энгельса.
7. **Дом пісьменьнікаў**, Савецкая вул., № 68.

## БІБЛІОТЭКІ

1. **БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ БІБЛІОТЭКА**
*(Савецкая вул., № 94)*
Бібліотэка адынена ў 1921 годзе. Цяпер налічвае 450 тысяч тамоў, якія ахапляюць усе віды бібліотэчнае і бібліографічнае працы. У аснову бібліотэкі ляглі 40 тысяч тамоў кніг, сабраных у часе рэволюцыі Народным комісарыятам асьветы, 5 тысяч тамоў цэнтральнае бібліотэкі, што закладалася ў Менску да адчыненьня унівэрсытэту, а таксама з іншых крыніц да 25 тысяч тамоў. Набыта кніжніца акадэміка Карскага, профэсара Янчука па беларусазнаўству, этнографіі і літаратуры, а таксама бібліотэкі Ісаева, Барысава, Грота, Гольдштэйна. Ад Расейскай акадэміі навук у бібліотэку паступіла 2800 тамоў поўнага комплекту выданьняў акадэміі, археографічнай комісіі і ўрадавых архіваў. Бібліотэка з 1922 году атрымлівае абавязковы экзэмпляр ад кніжных палат усіх саюзных рэспублік. Наладжана сталая сувязь абмену выданьнямі з заграніцай праз Усесаюзнае таварыства сувязі з заграніцай. Бібліотэка мае аддзелы: а) агульны з двума пададдзеламі — гуманітарных і прыродазнаўчых навук, б) беларускі, які зьяўляецца асноўнай крынічнай базай для краязнаўчай і навуковай працы па пытаньнях Беларусі 17 экзэмпляраў, в) Беларускае бібліографічнае бюро — картотэка, г) Кніжную палату па аналёгіі з кніжнымі палатамі другіх рэспублік СССР, д-дз) яўрэйскі і польскі — абслугоўваюць на нацыянальных мовах культурныя запатрабаваньні па пытаньнях нацменшасьцяй БССР, е-э) аддзелы марксызму і савецкага будаўніцтва. Бібліотэка абслугоўвае бясплатна ўсіх працоўных гораду Менску, а таксама жыхароў другіх гарадоў БССР, што прыяжджаюць у Менск. Бібліотэка мае 2 чытальні. Адчынена ад 9 да 21 гадзіны штодзённа.

2. **АКРУГОВАЯ БІБЛІОТЭКА**
*(Кастрычнікавая вул., № 5)*
Заснавана бібліотэка ў 1898 годзе. Цяперака налічвае на сваіх паліцах 36.745 т. кніг. Бібліотэка вырасла, галоўным чынам, за рэволюцыйны час. Бібліотэка падзяляецца на аддзелы: а) навуковы з чытальняй,

б) бэлетрыстыкі, в) дзіцячы аддзел з чытальняй, г) перасовачны фонд, д) архіў старых часопісаў і газэт. Акрамя таго, бібліотэка мае свае філіалы: а) бібліотэку на Нова-Маскоўскай вул., б) бібліотэку на Комуністычнай вул., № 24, в) бібліотэку на Барысаўскім шляху, № 6 ды г) 5 хат-чытальняў і д) агітпункт. Перасовачных пунктаў у горадзе і акрузе — 87. Мэта акруговае бібліотэкі — абслугоўваць усё працоўнае насельніцтва гор. Менску і акругі. Бібліотэка налічвае 15.000 організаваных чытачоў. Кнігі ў бібліотэцы выдаюцца па заставе ў 1—2 рублі. Пры бібліотэцы вядзе працу гурток прыхільнікаў бібліотэкі. Выдаецца дзіцячая насьценгазэта. Бібліотэка адчынена штодзённа ад 14 да 20 гадзін, апрача панядзелкаў.

## ГАРАДЗКІ ТЭАТР

*(Рог вул. Энгельса і Карла Маркса)*

Тэатр пабудаваны ў 1890 г. Тэатр мае 745 месц; партэр — 397, 1-ы паверх — 128, 2-гі паверх — 220 месц.

## КІНО

**Белдзяржкіно**, Рэволюцыйная вул., № 4.

1. **Гукавое кіно "Чырвоная Зорка"**, Савецкая вул.
2. **Кіно-тэатр "Культура"**, вул. Валадарскага, № 7.
3. **Кіно-тэатр "Спартак"**, рог Савецкай і Комсомольской.
4. **Кіно-тэатр "Пролетары"**, Савецкая вул., № 83.
5. **Кіно-тэатр "Інтэрнацыянал"**, Савецкая вул., № 83.

## ДРУК

### ВЫДАВЕЦТВЫ

1. Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, Савецкая вул., № 63.
2. Выдавецтва ЦК ЛКСМБ "Чырвоная Зьмена", Комсамольская вул., № 25.

### РЭДАКЦЫІ ГАЗЭТ

1. **"Зьвязда"**, Савецкая вул., 63.
2. **"Рабочий"**, Савецкая вул., 47.
3. **"Савецкая Беларусь"**, Ленінская вул., 2, Дом саветаў.
4. **"Orka"**, Савецкая вул., 47.
5. **"Піонэр Беларусі"**, Комсомольская вул., 25.
6. **"Раўдонасіс артояс"**, Карла Маркса, 14.
7. **"Юнгэр арбэтэр"** і **"Юнгер ленінец"** і **"Іскры Ільліча"**, Комсомольская, 25.
8. **"Чырвоная зьмена"**, Карла Маркса, 38.
9. **"Акцябр"**, Ленінская, 22.
10. **"Беларуская вёска"**, Савецкая, 63.
11. **"Беларускі батрак"**, Пляц Волі, Дом Працы.
12. **"Беларускі гандлёвы бюлетэнь"** БелКТА, Савецкая, 57.
13. **Радыёгазэта беларускага радыёцэнтру**, Унівэрсытэцкая, 16.

### РЭДАКЦЫІ ЧАСОПІСАЎ

1. **"Паляўнічы Беларусі"**, Савецкая, 63.
2. **"Беларуская работніца і сялянка"**, Карла Маркса, 14.
3. **"Соцыялістычнае будаўніцтва"**, Пляц Волі, 5.
4. **"Чырвоная Беларусь"**, Савецкая, 79.
5. **"Полымя"**, Савецкая, 63.
6. **"Маладняк"**, Савецкая, 68.
7. **"Узвышша"**, Савецкая, 68.
8. **"Бальшавік Беларусі"**, ЦК КП(б)Б.
9. **"Комуністычнае выхаваньне"** НКАБ

## СУВЯЗЬ І ТРАНСПАРТ

### ПОШТА, ТЭЛЕГРАФ, ТЭЛЕФОН, РАДЫЁ

1. **МЕНСКАЯ РАДЫЁ-ВЯШЧАЛЬНАЯ СТАНЦЫЯ ІМЯ СНК БССР**

*(Унівэрсытэцкая вул., № 6)*

Станцыя пабудавана ў 1922 годзе магутнасьцю 1,2 квт. У 1927 годзе перабудавана з павялічэньнем магутнасьці да 4 квт. Станцыя працуе на хвалі 700 мэтраў па радыусу звыш 3000 кілёмэтраў. Станцыя вядзе шырокую масавую

культурна-асьветную, навуковую і палітвыхаваўчую працу. Яна зьвязана з мястэчкамі і самымі глухімі вёскамі. Ёсьць трансляцыйны пункт, які прымае па радыё ўсё, што перадаецца шырока-вяшчальнымі станцыямі СССР, а таксама замежных краін, і перадае па радыё ў клюбы, чырвоныя куткі і на кватэры. У 1927—28 годзе было 2626 радыёўстановак: дзяржаўных — 716, самаробных — 1918, гучнагаворачных — 475. Пры радыёстанцыі ёсьць свая студыя, з якой перадаюцца праз мікрофон усе перадачы ў эфір. Галоўныя перадачы з радыёстанцыі: "Белрадыёгазэта", "Сялянская газэта", "Чырвоная Зьмена па радыё", "Беларускі Батрак", "Беларуская работніца і сялянка", "Унівэрсытэт па радыё" і інш. Праз радыёстанцыю праходзяць шматлікія экскурсіі.

2. **МЕНСКАЯ ПАШТОВА-ТЭЛЕГРАФНАЯ КОНТОРА**
*(Ленінская вул., № 34)*

Увосень 1899 г. пошта заняла гэты будынак. Цяперака пошта мае аддзелы: а) агульную канцэлярыю, б) просты, дзе адбываецца прыём і выдача звычайнае, заказное і тэрміновае корэспондэнцыі, в) страхавы, дзе адбываецца прыём і выдача пераводаў, пасылак і д.т.п., г) тэлеграфны — прыём і дастаўка тэлеграм, д) тэлефонны — эксплёатацыя тэлефону і перагаворачная міжнародная тэлефонная станцыя, дз) газэтнае бюро ведае прыёмамі падпіскі на пэрыодычны друк і экспэдыцыяй. Разьмер опэрацый: пошта атрымоўваецца 6 разоў і 9 адсылаецца штодзённа. 1-IV 1930 г. адпраўлена 606.580 корэспондэнцый, а атрымана 307.602 корэспондэнцыі. Пэрыодычных выданьняў за месяц адпраўлена 1.263.092, а атрымана — 1.304.843. (красав. месяц). Тэлеграм адпраўлена за месяц 15.830, а атрымана 15.712. Пераходных тэлеграм — 35.452. Перагавораў на міжнароднай станцыі адбылося 9.584, а па горадзе — 1.834.000. Контора яднае 2.038 абонэнтаў. Радыёпрыёмнікаў па горадзе 2617, а па акрузе — 756. Паштова-тэлеграфная контора абслугоўвае 3.322 насельных пунктаў, насельніцтва — 778.950 чал., 17 райвыканкомаў, 229 сельсаветаў, аддзяленьняў сувязі на акрузе 21, агэнцтваў штатных — 23, т/т і 19 нештатных. Лістаносцаў па горадзе — 42, газэтных — 60; па акрузе — пешых 177, конных — 74. Міжнародная станцыя перагаворачная — Масква-Менск-Варшава-Бэрлін. Абслугоўваюцца 78 саўгасаў, 5 сельска-гасп. таварыстваў, 19 комун, 278 с.-г. арцеляй, 32 фабрыкі і 44 заводы.

3. **АДДЗЯЛЕНЬНІ ПАШТОВА-ТЭЛЕГРАФНЫХ КОНТОР**
№ 1. Маскоўская, 38.
№ 2. Пляц парыскай комуны і Чычэрынскай, № 1.
№ 3. Пляц Волі (Палац Працы).
№ 4. Пляц 25-га кастрычніка, Ракаўская, 55.
№ 5. Камароўка (Савецкая, 180).
№ 6. Ігуменскі тракт, 19 (за разьніцай).
№ 7. Ляхаўка (рог Беларускай і Кажэвен., 2).
№ 8. Савецкая, 9 — пры пабудове дому ўраду.
№ 9. На выстаўцы.

4. **ТЭЛЕФОННЫЯ АЎТАМАТЫ**
Аўтомат у паштова-тэлеграфнай конторы — Ленінская, 34.
Пасажырскі вогзал МББ ж.д. (заля 1-й клясы).
Аўтомат пры паштовым аддзяленьні на вогзале МББ ж. д.

5. **ТЭЛЕФОННЫЯ ПЕРАМОВЫ З ІНШЫМІ ГАРАДАМІ І РАЁНАМІ БССР І СССР**
Менск—Масква
Перамовы — круглыя суткі.
Звычайныя перамовы адна хвіліна — 1 р. 85 кап., тэрміновыя — 1 хвіліна — 2 руб. 60 кап.
Менск—Ленінград
Перамовы круглыя суткі. Звыч. перамовы — 1 хв. — 1 р. 65 кап., тэрміновыя — 1 хв. — 5 руб.
Менск—Харкаў
Перамовы круглыя суткі. Звыч. перамовы — 1 хв. — 1 р. 50 кап., тэрміновыя — 1 хв. — 5 руб.
Менск—Кіеў
Перамовы круглыя суткі. Звычайн. перамовы — 1 хв. — 1 р. 25 кап., тэрміновыя — 1 хв. — 5 руб. 80 кап.
Менск—Адэса
Перамовы круглыя суткі. Звычайн. перамовы — 1 хв. — 2 руб., тэрміновыя — 1 хв. — 6 руб. 10 кап.
Менск—Смаленск
Перамовы круглыя суткі. Звычайн. перамовы — 1 хв. — 45 кап., тэрмін. — 1 хв. — 1 р. 40 кап.
Менск—Бабруйск
Перамовы круглыя суткі. Звыч. — 1 хв. — 25 кап., тэрмін. — 1 хв. — 80 кап.
Менск—Полацак
Перамовы круглыя суткі. Звыч. — 1 хв. — 50 кап., тэрм. — 1 хв. — 1 р. 50 кап.
Менск—Віцебск
Перамовы круглыя суткі. Звыч. — 1 хв. — 40 кап., тэрм. — 1 хв. — 1 руб. 25 кап.
Менск—Ворша
Перамовы круглыя суткі. Звыч. — 1 хв. — 30 кап., тэрм. — 1 хв — 95 кап.
Менск—Гомель
Перамовы круглыя суткі. Звыч. — 1 хв. — 40 кап., тэрм. — 1 хв. — 1 руб. 25 кап.

Менск—Мозыр
Перамовы круглыя суткі. Звыч. — 1 хв. — 40 кап., тэрм. — 1 хв. — 1 руб. 25 кап.
Менск—Магілёў
Перамовы круглыя суткі. Звыч. — 1 хв. — 40 кап., тэрм. — 1 хв. — 1 руб. 25 кап.
Менск—Варшава
Перамовы круглыя суткі. Звыч. — 1 хв. — 68 кап., тэрм. — 1 хв. — 2 руб. 4 кап.
Менск—Беласток
Перамовы круглыя суткі. Звыч. — 1 хв. — 56 кап., тэрм. — 1 хв. — 1 руб. 68 кап.
Перамовы з раённымі цэнтрамі
Менск— Слуцак — перамовы круглыя суткі. 1 хв. — 20 кап., тэрм. — 1 хв. — 65 кап.
Менск—Асіпавічы — перамовы круглыя суткі. 1 хв. — 20 кап., тэрм. — 1 хв. — 65 кап.
Менск—Копыль — перамовы ад 9 да 16 гадзін. — 1 хв. — 20 кап., тэрм. — 1 хв. — 65 кап.
Менск—Бягомль — перамовы ад 9 да 15 гадзін. 1 хв. — 20 кап., тэрм. — 1 хв. — 65 кап.
Менск—Негарелае — перамовы ад 9 да 24 гадзін. 1 хв. — 08 кап., тэрм. — 1 хв. — 25 кап.
Менск—Койданава — перамовы ад 9 да 24 гадзін. 1 хв. — 08 кап., тэрм. — 1 хв. — 25 кап.
Менск—Рагачэў — перамовы круглыя суткі. 1 хв. — 35 кап., тэрм. — 1 хв. — 1 руб. 10 кап.
Менск—Шклоў — перамовы круглыя суткі. 1 хв. — 35 кап., тэрм. — 1 хв. — 1 руб. 10 кап.
Менск—Горы-Горкі — перамовы круглыя суткі. 1 хв. — 35 кап., тэрм. — 1 хв. — 1 руб. 10 кап.
Менск—Рэчыца — перамовы круглыя суткі. 1 хв. — 45 кап., тэрм. — 1 хв. — 1 руб. 40 кап.
Менск—Лепель — перамовы круглыя суткі. 1 хв. — 45 кап., тэрм. — 1 хв. — 1 руб. 40 кап.
Менск—Сураж — перамовы круглыя суткі. 1 хв. — 45 кап., тэрм. — 1 хв. — 1 руб. 40 кап.
Менск—Добруш — перамовы круглыя суткі. 1 хв. — 45 кап., тэрм. — 1 хв. — 1 руб. 40 кап.
Менск—Чэрвень — перамовы з 8 да 23 гадз. Звыч. — 1 хв. — 8 кап., тэрм. — 25 кап.
Менск—Барысаў — перамовы круглыя суткі. 1 хв. — 15 кап., тэрм. — 1 хв. — 50 кап.
Менск—Нова-Барысаў — перамовы круглыя суткі. 1 хв. з — 15 к., тэрм. — 1 хв. — 50 кап.
Менск—Мар'іна Горка — перамовы з 8 да 24 гадз. 1 хв. — 8 кап., тэрм. — 1 хв. — 25 кап.
Менск—Бярэзіна — перамовы з 9 да 21 гадз. Звыч. — 1 хв. — 13 кап., тэрм. — 40 кап.
Менск—Самахвалавічы — перамовы з 9 да 24 гадз., 1 хв. — 3 кап., тэрм. — 10 кап.
Менск—Ратамка — з 8 да 15 гадз. 1 хв. — 3 кап., тэрм. — 10 кап.
Менск—Смалявічы — ад 9 да 15 гадз. 1 хв. — 5 кап., тэрм. — 1 хв. — 15 кап.
Менск—Сьмілавічы — ад 9 да 17 гадз. — 1 хв. — 5 кап., тэрм. — 1 хв. — 15 кап.
Менск—Рудзенск — ад 9 да 17 гадз. — 1 хв. — 5 кап., тэрм. — 1 хв. — 15 кап.
Менск—Лагойск — перамовы ад 9 да 17 гадз. 1 хв. — 5 кап., тэрм. — 1 хв. — 15 кап.
Менск—Астрашыцкі Гарадок — перамовы з 9 да 16 гадз. 1 хв. — 5 кап., тэрм. — 15 кап.
**Звыштэрміновыя перамовы аплачваюцца ў 9 раз даражэй, чымся звычайныя перамовы.**

**ТРАМВАЙНЫЯ МАРШРУТЫ**

**Першы:** Таварная станцыя — Камароўка.

Трамвай № 1 робіць астаноўкі каля наступных вуліц: Дзяржынскага, Мясгандлю, Нова-Маскоўскай, Земляробскага завулку, Сьвярдлоўскай вуліцы, Урыцкага, Ленінскай, Энгельса, Садовай, Шпітальнай, Доўтабродзкай і Камароўкі.

**Другі:** Пасажырскі вогзал — Старажоўка.

Трамвай № 2 робіць такія астаноўкі: Вогзал, Нова-Маскоўская, Земляробскі завулак, Сьвярдлоўская, Урыцкага, Ленінская, Энгельса, Плошча волі, Ніжні рынак, Плошча парыскай комуны, Мопру, Старажоўская, Стара-Віленская.

**"САЮЗТРАНС"**

**Усесаюзнае аб'яднаньне складзкое і транспартна-экспэдыцыйнае справы**
Беларуская краявая кантора — Рэвалюцыйная, № 11.

**Функцыі:** 1) Вытворчасьць транспартна-экспэдыцыйных і складзкіх апэрацый і іх рэгуляваньне.

2) Арганізацыя і эксплёатацыя аўтомабільнага і гужавога транспарту, а таксама аўтагужавых міжгародніх зносін.

**Філіалы:** у Менску (па таварных апэрацыях: былая гарадзкая станцыя, Маскоўская вул., дом. МББ чыгункі, літ. "Б", блізка ад чыгуначнага маста; па пасажырскіх апэрацыях: Рэвалюцыйная, дом № 7), у Віцебску, Полацку, Воршы, Магілёве, Бабруйску, Барысаве, Горках, Гомлі, Мазыры, Слуцку.

**МЫТНЫЯ АГЭНЦТВЫ**

**Станцыі:** Негарэлае, Бігосава, Фарынава, Жыткавічы, Сябеж, Радашковічы.

**Пункты:**Нова-Беліца, Рэчыца, Крычаў, Мсьціслаў, Жлобін, Уза, Буда-Кашалеўская, Хойнікі, Камунары, Клімавічы, Быхаў, Лепель, Капцэвічы, Пціч, Завішын, Ясень, Рудабельская ветка.

**РАСЬПІСАНЬНЕ ЦЯГНІКОЎ**

**Цягнік на Маскву**
Кур'ерскі 20 гадз. 55 хв.
Хуткі 8 гадз. 55 хв.

Хуткі 22 гадз. 33 хв.
Паштовы 17 гадз. 05 хв.
Да Смаленску пасажыр.-тав. 17 гадз. 45 хв.

**З Масквы**

Кур'ерскі 10 гадз. 05 хв.
Хуткі 9 гадз. 25 хв.
Хуткі 21 гадз. 20 хв.
Паштовы 18 гадз. 55 хв.
Да Смаленску тавара-пасаж. 7 гадз. 50 хв.

**На Негарэлае**

Кур'ерскі 10 гадз. 17 хв.
Хуткі 21 гадз. 30 хв.
Пасажырскі 5 гадз. 10 хв.
Пасажырскі 17 гадз 10 хв.
Тавара-пасажырскі 11 гадз —
Тавара-пасажырскі 22 гадз.

**З Негарэлага**

Кур'ерскі 20 гадз. 42 хв.
Хуткі 8 гадз. 39 зв.
Пасажырскі 17 гадз. 02 хв.
Пасажырскі 4 гадз. 12 хв.
Тавара-Пасажырскі 0 гадз. 15 хв.
Тавара-пасажырскі 13 гадз. 10 хв.

**На Радашковічы**

Тавара-пасажырскі 3 гадз. 35 хв.
Тавара-пасажырскі 6 гадз. 10 хв.
Тавара-пасажырскі 9 гадз. 50 хв.
Тавара-пасажырскі 17 гадз. 40 хв.
Тавара-пасажырскі 19 гадз. 30 хв.

**З Радашковіч**

Тавара-пасажырскі 5 гадз. 50 хв.
Тавара-пасажырскі 8 гадз. 30 хв.
Тавара-пасажырскі 13 гадз. —
Тавара-пасажырскі 21 гадз. 58 хв.

**На Гомель**

Пасажырскі 1 гадз. 15 хв.
Паштовы 7 гадз. —
Пасажырскі 9 гадз. 45 хв.
Тавара-пасажырскі 16 гадз. 40 хв.

**З Гомелю**

Паштовы 0 гадз. 50 хв.
Тавара-пасажырскі 6 гадз. 45 хв.
Пасажырскі 8 гадз. 03 хв.
Пасажырскі 21 гадз. 45 хв.

Цягнік Менск — Харкаў — штодзённа — 9 гадз. 45 хв. У цягніку вагоны простых зносін: Менск — Севастопаль, Менск — Еўпаторыя і Менск — Мінэральныя воды.

## ЭКСКУРСІІ ПА МЕНСКУ

**МАРШРУТЫ ТЭМАТЫЧНЫХ ЭКСКУРСІЙ**

**Першы маршрут для ўсебаковага азнаямленьня з прамысловасьцю Менску**

Лямцавая фабрыка Менскага акруговага аб'яднаньня працколектываў (вул. Лекерта, № 9), першы дзяржаўны дражджова-патачны завод "Чырвоны Золак" (2 вул. Лекерта), сьпірытусова-гэралачны завод (2 вул. Лекерта, № 15), чыгуна-ліцейны і машына-будаўнічы завод "Энергія" (2 вул. Лекерта, № 36), гарбарня "Бальшавік" (2 вул. Лекерта), мэталяапрацовачны завод "Комунар" (Акольная вул., № 3), вяровачная майстэрня (Сьвярдлоўская вул., № 67), Беларускае аддзяленьне "Устаноўка" (Нова-Серпухоўская вул., № 29).

**Другі маршрут для ўсебаковага азнаямленьня з прамысловасьцю Менску**

Хлебны завод Менскага цэнтральнага рабочага коопэратыву імя 10 гадавіны Кастрычніка (Ракаўская вул., № 19/17), шпалерная фабрыка імя Вароўскага (зав. Вызваленьня, № 26), абутковая фабрыка (Нямігская вул., № 6), фабрыка "Чырвоны Тэкстыльшчык" ткацкае аддзяленьне (вул. Вызваленьня, № 1), нітачнае і фарбавальнае аддзяленьне (Ракаўская вул., № 14), панчошнае і трыкотажнае аддзяленьні (Кацярынінская вул., № 2).

**Трэці маршрут для ўсебаковага азнаямленьня з прамысловасьцю Менску**

Цукерачная фабрыка "Прогрэс" (вул. Мопра, № 101), другі дзяржаўны дражджавы завод "Пролетары" (Стара-Віленская вул., № 13), піваварня "Беларусь" (Старажоўская вул., № 44).

**Чацьверты маршрут для ўсебаковага азнаямленьня з прамысловасьцю Менску**

Гута “Пролетар” (Рыгораўская вул., № 8), шчотачна-скурана-галянтарэйная фабрыка імя Крупскай (вул. Розы Люксэмбург, № 26), цацачная фабрыка “Адраджэньне” (Вяземская вул., № 5), Меншвей (Ленінская вул., № 12).

**Хто і як вывучае Беларусь і яе культуру**

Беларуская акадэмія навук (рог Унівэрсытэцкай і Леніна), Навукова-дасьледчы інстытут сельскай і лясной гаспадаркі імя Ў. І. Леніна (Шырокая вул., № 28).

**Як робіцца кніга**

Беларускае дзяржаўнае выдавецтва (Савецкая вул., № 63), друкарня выдавецтва (Пляц Волі, Палац Працы).

**Як робіцца газэта**

Рэдакцыя і друкарня газэты “Зьвязда” (Савецкая вул., 78).

**Гісторыя зброі і падрыхтоўка чырвоных байцоў**

Беларускі дзяржаўны музэй (Чырвонаармейская, № 3), Беларуская аб'яднаная вайсковая школа імя ЦВК (Пляц Парыскае Комуны).

**ВАКОЛІЦЫ МЕНСКУ**

1. **КАМАРОЎСКАЕ БАЛОТА**

Па дарозе з гораду, ідучы ад аўтобуснай станцыі, на пляцу Парыскай Комуны, па Комунальнай вул., варта азнаёміцца з піваварaным заводам “Беларусь” (Старажоўская, № 44) у складзе 12 аддзяленьняў, або па роўналеглай ёй Стара-Віленскай вул. з станцыяй расьлінагадоўлі Навукова-дасьледчага інстытуту сельскай і лясной гаспадаркі імя Леніна (№ 73) і з другім дражджавым заводам “Пролетар” (№ 13) у складзе 10 аддзяленьняў. На балоце вялізную цікавасьць прадстаўляе Балотная дасьледчая станцыя са сваімі палямі і сенажацямі на былым балоце.

2. **ЛОШЫЦА**

Па дарозе ў Лошыцу, сайшоўшы з трамваю каля Белмясгандлю на Нова-Маскоўскай вул., варта аглядзець гуту “Пролетары” на роўналеглай ёй Рыгораўскай вул. (№ 8), куды вядзе аднайменны завулак міма пабудаванай у 1928 годзе Цэнтральнай малочнай. Гута адчынена ў 1920 годзе ў складзе 6 аддзяленьняў. Далей па Рыгораўскай, на рагу вул. Дзяржынскага, — пабудаваны ў 1928 годзе хэмічна-фармацэўтычны завод Белмэдгандлю. Зьвярнуўшы тутака налева, экскурсант зноў выходзіць на Нова-Маскоўскую вул. і па ёй праз чыгуначны мост за горад, дзе зварачвае налева і вузкай дарожкай паміж палёў пападае ў Лошыцу, дзе асабліва цікавым зьяўляецца Беларускае аддзяленьне ўсесаюзнага інстытуту батанікі і прыкладных культур. Назад можна вярнуцца па вялікім шляху, які канчаецца на Каломенскай вуліцы.

3. **ВЕСЯЛОЎКА**

Па дарозе на Нямігскай вул. (№ 36) варта азнаёміцца з абутковаю фабрыкаю, якая адчынена ў 1924 годзе ў складзе 5 аддзяленьняў і абслугоўвае БССР, а таксама рынкі саюзных рэспублік. Адсюль па Рэспубліканскай вул., цераз пляц 25 Кастрычніка, экскурсант выходзіць на Людаманскі завулак, дзе пачынаюцца вуліцы, заселеныя абеларушанымі татарамі; на рагу — мячэць; можна наглядаць цікавыя бытавыя малюнкі. Адсюль па Людаманскай вул., пакідаючы ззаду Менск, з левага боку — найпрыгажэйшыя выкручастыя берагі Сьвіслачы і з правага — прадмесьце, экскурсант прыбывае ў дачную мясцовасьць Весялоўку, на беразе Сьвіслачы. Рознастайнасьць мясцовага краявіду пакідае надзвычайна моцнае ўражаньне.

4. **ДАСЬЛЕДЧАЯ СЬВІНАВОДНАЯ СТАНЦЫЯ**

У Малай Сьляпянцы, на поўнач, у 2 клм. ад гор. Менску.

Станцыя мае мэтаю вывучэньне сьвінагадоўлі Беларусі і вывучэньне розных сьвіных парод ва ўмовах Беларусі. У сваёй працы станцыя зьвяртае галоўную ўвагу на вывучэньне сьвінагадоўлі з мэтаю экспорту (бэкону). Станцыя абсталявана замежнымі машынамі для запаркі кармоў і вагамі для ўзьвешваньня розных узростаў сьвіней, а таксама пабудаваны новыя сьвінарнікі па эўропейскаму ўзору, і закладзены штучныя, пастаянныя выпасы. На станцыі знаходзіцца каля 500 сьвіней розных парод, як беларускіх, так і эўропейскіх. Існуе станцыя з 1927 году.

5. **ЦЭНТРАЛЬНАЯ БУЛЬБЯНАЯ СТАНЦЫЯ**

У саўгасе імя Будзёнага, б. Вялікая Сьляпянка, па Стара-Барысаўскім шляху, у 2 $^1/_2$ клм. ад Менску. Станцыя зьяўляецца навукова-дасьледчай установай і мае сваёю мэтаю: а) вывучэньне і сыстэматызацыю гатунку бульбы, б) сэлекцыю і вывядзеньне гатункаў бульбы для патрэб нашае сельскае гаспадаркі і прамысловасьці, найбольш адпавядаючых нашым эконамічным і прыродным умовам, в) распрацоўку пытаньняў культуры бульбы, г) вывучэньне хвароб бульбы і барацьба з імі, д) хэмічна-тэхнолёгічную распрацоўку пытаньняў, зьвязаных з індустрыялізацыяй краіны, е) насеньняводзтва бульбы па сетцы БССР. Пры станцыі ёсьць ляборaторыі: анатомічная, фізопатолёгічная, фізыолёгічная, цытолёгічная і тэхнолёгічная. На станцыі экскурсант можа бачыць надзвычайна цікавыя гатункі бульбы (звыш 600 розных гатункаў), дзікія яе формы, мэтоды пасадкі, вывядзеньня, сэлекцыі, хворасьць і г.д.

6. **САЎГАС ІМЯ ЛЕКЕРТА**

Гаспадарка цікава разьвядзеньнем парнікаводзтва, агародніцтва, ягадных культур і вялікім пладовым пітомнікам; акрамя гэтага, у гаспадарцы існуе малочная фэрма. Адлегласьць ад Менску 2 клм.

7. **САЎГАС “ВОЛЬНАЯ ПРАЦА”**

Гаспадарка знаходзіцца на захадзе ад Менску (выхад па Грушаўскай вул.). Па свайму тыпу гаспадарка зьяўляецца малочнай. Разводзяцца таксама і збожжавыя культуры. Што асабліва цікава, дык гэта пароды жывёл (сэменталь і галяндкі), а таксама і гадаваньне маладняку. Адлегласьць ад Менску 3 $^1/_2$ клм.

8. **САЎГАС АНЦАЛОВІЧЫ**

На Чэрвеньскім шляху, за Козыравым. Саўгас налічвае каля 400 дз. зямлі і зьяўляецца аднэй з лепшых гаспадарак Навукова-дасьледчага інстытуту імя Леніна. У гаспадарцы досыць узорна пастаўлены садова-агародныя, палявыя і травяныя культуры, побач з гэтым у гаспадарцы вырашчваюцца розныя травы і насеньне. Адлегласьць ад Менску 4 клм.

9. **САЎГАС ІМЯ БУДЗЁНАГА**

Саўгас імя Будзёнага, па Барысаўскаму шляху, б. Сьляпянка, належыць Навукова-дасьледчаму інстытуту і налічвае каля 500 дз. зямлі. Адна з лепшых гаспадарак па бульбяных культурах і сьвінаводзтву. У гаспадарцы знаходзіцца экспэрымэнтальная бульбяная станцыя, адзіная ў БССР; апроч гэтага, у гаспадарцы ўзорна пастаўлена парнікаводзтва, садаводзтва і агародніцтва. Адлегласьць ад Менску 3 $^1/_2$ кілёмэтры.

10. **САЎГАС "ЧЫРВОНЫ ТРАНСПАРТНІК"**

Саўгас "Чырвоны транспартнік", на Койданаўскім шляху, налічвае 158 дзесяцін зямлі. У гаспадарцы знаходзіцца адзін з лепшых у Менскай акрузе пладова-ягадны завод, для якога гаспадарка разводзіць шмат розных гатункаў ягад. Узорна ў гаспадарцы пастаўлена садаводзтва і агародніцтва, акрамя гэтага, гаспадарка мае беларускую чырвоную пароду кароў. Саўгас знаходзіцца ад цэнтру горада на адлегласьці 2 ? кілёмэтраў.

## ПРАМЫСЛОВАСЬЦЬ

### ФАБРЫКІ, ЗАВОДЫ І КОМУНАЛЬНЫЯ ПРАДПРЫЕМСТВЫ

1. **ЧЫГУНАЛІТОЎНЫ І МАШЫНАБУДАЎНІЧЫ ЗАВОД "ЭНЭРГІЯ"**

*(Вул. 2-ая Лекерта, № 36)*

У 1921—22 годзе завод быў нанова адбудаваны на месцы старых майстэрняў, заснаваных у 1912 годзе. З 1922 году завод працуе ў новых вялізных карпусох, абсталяваных новымі машынамі. Завод вырабляе вагі 10—800 кілёграмныя ды рамантуе машыны. Праца адбываецца ў наступных цэхах: а) мэханічным, дзе вырабляюцца розныя прылады і рамантуюцца старыя машыны, б) кавальскім, дзе вырабляюць часткі сельска-гаспадарчых машын, в) модэльна-літоўным, дзе выліваюць патрэбныя часткі машын ды г) машынным, дзе стаяць рухавікі на гарадзкім электратоку. Апрача таго, ёсьць склад для гатовых вырабаў. Пры заводзе ёсьць сталоўка, выдаецца насьценгазэта "Сверло". На заводзе працуюць 931 рабочы. Асабліва цікавай для агляду зьяўляецца праца па выліваньню частак машын. Гэты момант паказаны мастаком Гусевым на яго карціне ў Беларускім дзяржаўным музэі.

2. **МЭТАЛЯАПРАЦОЎЧЫ ЗАВОД "КОМУНАР"**

*(Акольная вул., № 3)*

Завод "Комунар" організаваўся ў 1928 годзе з сельска-гаспадарчых майстэрняў імя Вурбіса, заводу "Усход" і заводу "Мэталіст" і зараз зьяўляецца адным з буйнейшых заводаў Менску. На ім працуе звыш 729 чал. Завод "Комунар" вырабляе сельска-гаспадарчыя прылады: веялкі, плугі і д.т.п. у гэтакіх цэхах: а) мэханічным, дзе вырабляюць розныя прылады і рамантуюць старыя машыны і часткі да іх, б) кавальскім, дзе дарабляюцца часткі да сельска-гаспадарчых машын, в) сьлясарным, дзе рамантуюцца і дарабляюцца другія часткі памянёных машын, г) зборным, дзе зьбіраюцца з гатовых частак плугі, веялкі, сячкарні і д.т.п., д) чыгуна-літоўным, у якім выліваюцца новыя часткі машын, е) модэльным, дзе вырабляюцца формы для адліўкі машын у папярэднім цэху, з) дрэваапрацоўвачным, дзе вырабляюцца драўняныя часткі сельска-гаспадарчых машын. Сыравіну завод атрымоўвае з Уралу і БСР і абслугоўвае Беларусь. Пры заводзе ёсьць ленінскі куток. Выдаецца насьценгазэта "Вперед".

3. **ГУТА "ПРОЛЕТАР"**

*(Рыгораўская вул., № 8)*

Гута пабудавана ў 1906 годзе. У 1922 годзе гута працавала на сродкі МББ чыгункі. У 1923 годзе перайшла да працколектыву, а з 1925 году існуе пад загадам Белшклотрэсту. Процэс вытворчасьці складаецца з наступных этапаў: а) мяшаньня сыравіны (пяску, крэйды, сулефату, соды, бітага посуду, вапны, вугальля), б) гатаваньня мешаніны пры тэмпэратуры 1800–2000 градусаў у спэцыяльных печах, в) выдуваньня рознага шкляного начыньня, г) загартоўваньня апошняга ў спэцыяльных апецках, д) сартаваньня вырабаў і е) запакоўваньня іх. Гута абслугоўвае пераважна Беларусь, але вырабы яе пасылаліся і за межы СССР (Пэрсія). Вырабляе гута бутэлькі рознага формату. Пры гуце ёсьць летні сад, ленінскі куток; выдаюцца насьценгазэты "Чырвоны гутнік" і "Піонэр". Працуе на гуце 314 чал.

4. **ДРЭВААПРАЦОВАЧНЫ ЗАВОД**

*(Барысаўскі шлях, № 36)*

Завод пабудаваны ў 1921 годзе на месцы былога кахлянога заводу, зьнішчанага пажарам у часе сусьветнай вайны. Завод тады працаваў як лесапільны пры дзьвёх рамах і стругальным варштаце. На працягу часу да 1923 году быў дабудаваны каменны корпус мэханічна-сталярнага цэху, дзе ўсталявалі 15 мэханічных варштатаў для мэблева-сталярнай працы. Апрача таго, была пабудавана сьлясарная майстэрня з 2 такарнымі варштатамі для працы па мэталю, кузьня на 2 гораны, памяшканьні для лесазагатовачных і тэхнічных матар'ялаў. У 1928 годзе быў пабудаваны яшчэ адзін корпус, пашырана плошча заводу, праведзена электрычнае асьвятленьне са сваёй электроэнэргіяй, пабудавана пажарнае дэпо і г.д. Такім чынам к 1929 году завод быў цалкам рэорганізаваны і вырас у буйнае прадпрыемства з наступнымі цэхамі: а) лесапільным, б) мэханічна-сталярным, в) зьбіральна-сталярным, г) апрацоўчым, д) лякерна-політурным і е) упаковачным. У гэтых цэхах вырабляюцца сталы, крэслы, шафы, палічкі, ложкі, канапы і д.т.п. выключна з беларускай сыравіны. Вырабы прадаюцца

ў Беларусі і на Ўкраіне. Рабочых 287 чалавек. Ёсьць ленкуток. Выдаецца насьценгазэта "Красный деревообделочник".

5. **ГАРБАРНЯ "БАЛЬШАВІК"**

*(Вул. 2-ая Лекерта)*

Гарбарня аб'яднана з былых 4 заводаў: першага імя Весялоўскага, другога імя Ўбарэвіча, трэцяга імя Багуцкага і чацьвёртага — фабрычна-заводзкай школы імя Сосіна. Зараз яна мае наступныя аддзяленьні ў вялізных гмахах: а) зольнае, дзе скура 7 дзён мокне, б) барабаннае, дзе скура дадубліваецца экстрактам; для вырабу падэшвы ёсьць асобнае аддзяленьне, дзе скура дадубліваецца сернай кіслатой, в) дубільнае, дзе скура дубіцца ў яловай і інш. кары, г) перасыпнае, дзе скура перасыпаецца пілавіньнем, д) фальцэрнае, дзе на працягу 8 гадзін зразаецца мяса са скуры, е) патаровачнае, дзе выціскаецца вада са скур, э) сушыльня, дзе скура сушыцца на спэцыяльна зьбітых для гэтага дошках, ё) выцягвальнае, дзе скура выцягваецца і робіцца мяккай, ж) набівачнае, дзе скура набіваецца на рамы і канчаткова ў такім выглядзе высыхае, з) абрэзачнае, дзе скура абрэзваецца, дж) глянцовачнае і дз) лашчыльнае, дзе скура атрымоўвае бляск. Рабочых на заводзе больш 687 чалавек. Сыравіну завод атрымлівае з Беларусі і інш. рэспублік СССР.

6. **ДРУГІ ДРАЖДЖАВЫ ЗАВОД "ПРОЛЕТАР"**

*(Стара-Віленская вул., № 13)*

Завод "Пролетар" рэарганізаваны з невялічкага заводу, пабудаванага ў 1913 годзе. Зараз завод абсталяваны найноўшымі машынамі і лічыцца адным з лепшых заводаў гэтага роду ў СССР. У старыя часы завод вырабляў 8 фунтаў драждж эй з пуда збожжа, а цяпер вырабляе 24 фунты з пуда. Падвышэньню вытворчасьці дапамагалі адпаведныя досьледы апошняй, якія робяцца на заводзе. Завод складаецца з наступных аддзяленьняў: а) машыннага (рухавікі), б) мачыльна-саладзільнага (збожжа мочыцца і росьціцца), в) вальцовачнага (прарослае збожжа мелюць вальцамі), г) заторнага (зьмеленае збожжа ў вялізных чанох варыцца параю), д) фільтрацыйнага (дрожджы ачышчаюцца ад шулупін), е) квасільнага (дрожджы квасяцца), э) сэпаратарнага (пяцітысячным зваротам у хвіліну дрожджы ачышчаюцца ад брагі), ё) прасовачнага (дрожджы прэсам абязводжваюцца), ж) упаковачнага (да драждж эй прымешваецца крухмал, усё дзеляць на часткі і ўпакоўваюць). Апрача таго, ёсьць лябораторыя, дзе вядзецца дасьледчая праца.

Сыравіну завод атрымлівае з СССР, які і абслугоўвае сваімі вырабамі.

7. **БРАВАРНЯ "БЕЛАРУСЬ"**

*(Рог Комунальнай і Старажоўскай)*

Браварня пабудавана ў 1893 годзе. Зараз браварня мае наступныя аддзяленьні: а) машыннае (рухавікі), б) саладзільнае (збожжа мочыцца і прарошчваецца), в) сушыльнае (збожжа сушыцца пры + 50 град.), г) драбільнае (збожжа вальцамі драбніцца), д) заторнае звальцованае (збожжа варыцца ў чопе), е) халадзільнае (зваранае астуджваецца пры –4 град.), ж) мыцельнае (мыюцца бочкі і бутэлькі). Апрача таго, ёсьць кузьня, сталярня і бандарня. Сыравіну завод атрымлівае з СССР, а вырабамі абслугоўвае пераважна Беларусь. На браварні працуе 88 чалавек.

8. **АБУТКОВАЯ ФАБРЫКА**

*(Нямігская вул., № 36)*

Фабрыка ў 1924 годзе арганізавана з былой шпалернай фабрыкі. Вырабляе мужчынскі і жаночы абутак розных гатункаў. Працэс вытворчасьці складаецца з наступнага: а) у раскройным аддзяленьні крояць абцасы, падэшвы, перадкі, халяўкі і д. т. п. па адпаведнай форме, б) у зацяжным аддзяленьні, таксама машынамі, перадок нацягваецца і да яго прымацоўваецца падэшва, в) у пашывачным аддзяленьні прышываюцца падэшвы дратваю і цьвікамі, г) у абробачным аддзяленьні прымацоўваюцца абцасы, робяцца ранты і г.д., пакуль абутак не гатовы. Сыравіну фабрыка атрымлівае з БССР, а вырабамі абслугоўвае СССР. Выдаецца насьценгазэта. Ёсьць клюб. Рабочых на ф-цы 624.

9. **ШПАЛЕРНАЯ ФАБРЫКА ІМЯ ВАРОЎСКАГА**

*(Зав. вызваленьня, № 26)*

Фабрыка абсталявана ў 1923 годзе ВСНГБ на месцы разбуранай прыватнай фабрыкі. Праца фабрыкі адбываецца ў наступных аддзяленьнях: а) машынамі з рухавіком на 45 конскіх сіл, б) лябораторным, дзе ўкладаюцца ўзоры, в) друкарскім, дзе машынамі адціскаюцца розныя ўзоры, г) кашальным, дзе адрэзваюцца належнай даўжыні шпалеры, д) лашчыльным, дзе запакоўваюцца гатовыя шпалеры. Рабочых 99. Фабрыка вырабамі абслугоўвае СССР. На фабрыцы выдаецца насьценгазэта.

10. **ШВЕЙНАЯ ФАБРЫКА "КАСТРЫЧНІК"**

*(Рог Нова-Маскоўскага зав. і Вяземскай вул.)*

Прадпрыемства арганізавана ВСНГБ у 1921 годзе. Зараз яно значна вырасла і на Вяземскай вул., № 12, мае спэцыяльнае памяшканьне, абсталяванае па апошняму слову тэхнікі. Старое памяшканьне, якое знаходзіцца на Ленінскай вул., № 11, пераабсталявана ў фабрыку-школу. Сыравіну атрымлівае ад тэкстыльсындыкату. Вырабамі абслугоўвае саюзны рынак. На прадпрыемстве занята 1416 чал.

11. **ХЭМІЧНА-ФАРМАЦЭЎТЫЧНЫ ЗАВОД**

*(Рог вул. Рыгораўскай і Дзяржынскага)*

Завод у гэтым новым прыгожым памяшканьні пачаў працаваць у 1929 годзе. З 1924 года ён працаваў у невялічкім памяшканьні па Унівэрсытэцкай вул., № 41. Завод выпрабляе розныя мазі, экстракты, настойкі, парашкі, одэколён, вазэлін, ампулы, мыла, глаубэравую соль, нафталін, крэолін і г.д. Завод абсталяваны

найноўшымі машынамі. Сыравіну завод атрымлівае з СССР і з-за межаў; вырабамі абслугоўваецца Беларусь і часткова СССР.

12. **МАЛОЧНАЯ**

*(Рог Маскоўскай і Малочнага зав.)*

13. **ДРУКАРНЯ ІМЯ СТАЛІНА**

*(Пляц Волі, Палац Працы)*

Друкарня арганізавана ў 1920 годзе на месцы былой губэрскай друкарні. Можна прасачыць, як выдаюцца кніга і газэта, прайшоўшы праз наборнае, стэрэотыпнае, лінатыпнае, машыннае, пераплётнае і іншыя аддзяленьні. У друкарні працуе 495 чал.

14. **ДРАЖДЖАВЫ ЗАВОД "ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА"**

*(Вул. 2-я Лекерта)*

Завод пабудаваны ў 1881 годзе. Зараз ён складаецца з наступных аддзяленьняў: а) машыннага, б) мачыльна-саладоўнага, в) вальцовачнага, г) заторнага, д) фільтрацыйнага, е) квасільнага, ж) прасовачнага і з) упаковачнага. Працуе на заводзе 176 чал.

15. **ГАРЭЛАЧНЫ ЗАВОД**

*(Вул. 2-я Лекерта, № 15)*

Завод пабудаваны ў 1922 годзе на месцы ранейшага, які спалілі белапалякі. Зараз на ім працуе 47 рабочых у такіх аддзяленьнях: а) сьпіртовым склепе, б) купатным, в) мытніку, г) разьлівачным, д) гарэлачным склепе, е) прыёмачным, з) рамонтнай майстэрні. Завод штодзённа вырабляе звыш 600 вёдраў сьпірытусу.

16. **ЦУКЕРНАЯ ФАБРЫКА "ПРОГРЭС"**

*(Мопраўская вул., № 101)*

Вытворчасьць на фабрыцы была адноўлена ў 1918 г. менскім ЦРК, а з 1923 году вядзецца працколектывам у наступных аддзяленьнях: а) варыльні, дзе варыцца бурачны мед, какава, цукар і т.п. сыравіна, б) карамельным, дзе вырабляецца гушча на цукеркі; тут жа гушча праходзіць праз прэс, з якой атрымліваецца па форме прэсу цукеркі — ляндрынкі, в) сушыльні, дзе сушацца мяккага гатунку цукеркі, г) упаковачным, д) склепе. Штодзённа вырабляецца каля 480 кг. цукерак. Зараз фабрыка знаходзіцца на месцы былога заводу "Варшавянка". Рабочых — 255 чал.

17. **ЛЯМЦАВАЯ ФАБРЫКА**

*(Вул. Лекерта, № 9)*

Фабрыка заснавана ў 1924 годзе. Зараз на ёй занята больш 140 чал. у наступных аддзяленьнях: а) воўнабітным, дзе чэшацца воўна лепшай якасьці, з якой робіцца рымарскі лямец, б) воўначосным, в) насьцілачным, дзе насьцілаецца пласт воўны і качаецца, пакуль ня зваліцца, г) сьцірачным, дзе гатовы лямец абліваюць вадою з жытняю мукою, каб умацаваць яго, д) прасовачным, дзе лямец прасуецца і ўпакоўваецца. На фабрыцы вырабляецца рымарскі лямец, лёгка-будаўнічы і цяжка-будаўнічы.

18. **ФАБРЫКА ЦАЦАК "АДРАДЖЭНЬНЕ"**

*(Вяземская вул., № 5)*

Фабрыка існуе з 1927 году і мае наступныя цэхі: а) бляшаны, дзе вырабляюцца бляшаныя цацкі, б) мастычны, дзе выраблюцца лялькі, в) лазовы, дзе вырабляюцца з лазы розныя рэчы для дзяцей, г) сьлясарны, дзе вырабляюцца дзіцячыя каляскі, вэлёсыпэды і інш., д) ложкавы, дзе вырабляюцца нікеляваныя ложкі ў гісэрным і кавальскім аддзеле, е) сталярны, які абслугоўвае іншыя цэхі і з) скульптурны, дзе вырабляюцца статуэткі і бюсты.

19. **ШЧОТОЧНА-СКУРАНА-ГАЛЯНТАРЭЙНАЯ ФАБРЫКА ІМЯ КРУПСКАЙ**

*(Вул. Розы Люксэмбург, № 26)*

Фабрыка арганізавана Наркомпрацы ў 1923 годзе. У 1928 годзе фабрыка перайшла ў гэтае спэцыяльна пабудаванае памяшканьне. Зараз фабрыка мае 3 наступных аддзяленьні: а) шчотачнае і пэндзлевае, б) партманэтнае і портфэльнае і в) чамаданнае. Рабочых 700 чалавек.

20. **ШАВЕЦКАЯ МАЙСТЭРНЯ**

*(Няміга, № 6)*

Арганізавана майстэрня ў 1920 годзе Наркомпрацы. Зараз мае наступныя цэхі: а) загатовачны, б) пашывачны, в) апрацоўчы і г) упаковачны. Занята ў майстэрні 106 чал.

21. **ПРАЦКОЛЕКТЫЎ "ТЭКСТЫЛЬШЧЫК"**

*(Контора, вул. Вызваленьня, № 2)*

Працколектыў складаецца з наступных аддзяленьняў: а) тэкстыльнага (вул. Вызваленьня, № 1), дзе саматужным спосабам вырабляецца шотляндка, хусткі, б) нітачнага і фарбавальнага (Ракаўская вул., № 14), дзе фарбуюцца ніткі, панчохі і в) панчошнага і трыкотажнага аддзяленьня (Кацярынінская вул., № 2). Апрача таго, ёсьць лябараторыя. Усе майстэрні арганізаваны ў 1924 годзе Наркомпрацы. Працуе на прадпрыемстве 351 рабочы.

22. **БЕЛАРУСКАЕ АДДЗЯЛЕНЬНЕ "УСТАНОЎКІ"**

*(Нова-Сярпухоўская, № 27)*

Беларускае аддзяленьне акцыянэрнага таварыства "Ўстаноўкі" (Цэнтральны інстытут працы) мае на мэце падрыхтаваць кваліфікаваныя кадры рабочых. Аддзяленьне існуе ў складзе наступных цэхаў: а) такарнага па мэталю, б) сьлясарнага, в) кавальскага, г) тынкавальнага, д) мулярскага.

23. **ЭЛЕКТРЫЧНАЯ І ВАДАПРАВОДНАЯ СТАНЦЫЯ**
*(Савецкая вул., № 110)*

Электрычная станцыя існуе з 1904 году. Цяпер яна дае звыш 3.000 кілёўат і абслугоўвае сьвятлом увесь горад і токам шмат фабрык і заводаў. Станцыя мае такія цэхі: а) вадаправодны, які рамантуе вадаправодную сетку, б) электрычны цэх, які рамантуе нізкавольтавую і высокавольтавую сетку, в) машынны цэх, які выпрацоўвае электроэнэргію і г) рамонтны цэх, які абслугоўвае тры першыя. Аглядаць станцыю можна толькі ў нядзелю ад 13 да 15 гадзін дня.

24. **ХАЛАДЗІЛЬНІК ІМЯ 10-ГОДЗЬДЗЯ БССР**
*(Чэрвеньскі шлях, № 3)*

Халадзільнік пабудаваны ў 1928 годзе і зьмяшчае 650 тон. Халадзільнік мае 16 камор, у якіх зьмешчаны продукты, 2 аміячныя компрэсары па 120 тысяч колёрый кожны ў гадзіну. Кожная камора абсталявана паветранымі халадзільнікамі. Халадзільнік мае чыгуначныя пад'езды.

25. **ХЛЕБНЫ ЗАВОД**
*(Ракаўская вул., № 19-17)*

Завод пабудаваны менскім ЦРК і працуе з 11 лютага 1928 году. Ён выпякае белы і чорны хлеб і абаранкі. Праца адбываецца ў хлебным, булачным і абаранкачным аддзяленьнях. Завод за месяц выпякае 7500 цэнтнэраў чорнага хлеба, 34 тысячы цэнтнэраў белага хлеба, 360 цэнтнэраў булак і 480 цэнтнэраў абаранкаў. На заводзе працуе лябораторыя хлебнае інспэкцыі, дзе правяраецца якасьць хлеба. Лябораторыя обслугоўвае ўсе пякарні Менску. Рабочых на заводзе занята 149 чал.

26. **ПАЖАРНАЕ ДЭПО**
*(Бакунінская, 8-21)*

Цэнтральнае пажарнае дэпо падпарадкавана аддзелу комунальнай гаспадаркі і мае на мэце барацьбу з пажарамі і іншымі навеламі. Дэпо мае 2 гаражы — аўтомобільны і конны.

**КААПЭРАЦЫЯ**
**МЕНСКІ ЦЭНТРАЛЬНЫ РАБОЧЫ КААПЭРАТЫЎ**
Праўленьне — Менск, Савецкая 43, 3-і паверх

# ЛІТАРАТУРА І АРХІЎНЫЯ КРЫНІЦЫ, ВЫКАРЫСТАНЫЯ ДЛЯ НАПІСАННЯ ПРАДМОВЫ


*АРХІЎНЫЯ ДАКУМЕНТЫ*

**Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь**

Фонд 4п, воп. 3, спр. 426, арк. 21, 180, 188, 204; тамсама, спр. 882, арк. 275—277; воп. 21, спр. 2146, арк. 32.

Фонд 6, воп. 1, спр. 376, арк. 168.

Фонд 7, воп. 1, спр. 111, арк. 73, 96; тамсама, спр. 252, арк. 364—370; тамсама, спр. 404, арк. 91, 98; тамсама, спр. 600, арк. 10, 23.

*КНІГІ*

1. *Денисов В.Н.* Площадь Свободы в Минске. Мн., 1985. 79 с.
2. *Крапіва К.* Збор твораў : У 6 т. Мн., 1997. Т.1.462 с.
3. *Крапивин С., Курков И.* Минский ГУМ: История и современность. Мн., 2001. 142 с.
4. Минск. Краткая хроника (ноябрь 1917 — 1966). Мн., 1967. 450 с.
5. Мінск учора і сёння/ Аўтар-складальнік В.І.Каляда. Мн., 1989. 320 с.
6. Минск: Энциклопедический справочник. 2-е изд. Мн., 1983. 467 с.
7. Справочник милиционера. Мн., 1939. 114 с.
8. *Шибеко З.В., Шибеко С.Ф.* Минск: Страницы жизни дореволюционного города. Мн., 1990. 352 с.

*АРТЫКУЛЫ*

1. *Бугаенко В.* Многоликая Сторожевка // Вечерний Минск. 1997. 7 февраля.
2. *Бугаенко В.* Ляховка // Вечерний Минск. 1997. 12 мая.
3. *Баравой Р.* Ціхія мінскія ўскраіны // Добры вечар. 1992. 28 студзеня.
4. *Гнеўка В.Г.* Да гісторыі развіцця народнай гаспадаркі і культуры Мінска ў гады першай пяцігодкі (1928/29 — 1932/33 гг.) // Весці Акадэміі навук Беларускай СССР. Серыя грамадскіх навук. 1956. № 4. С. 33—42.
5. *Крапивин С.* По рельсам социализма // Советская Белоруссия. 1999. 9 октября.
6. *Курков И.* Ирма Яунзем: Возвращение «перелетной птицы» // Советская Белоруссия. 2001. 10 февраля.
7. *Лапин Н.* Стихи для минской газеты // Вечерний Минск. 1983. 7 июля.
8. *Леановіч І.А.* Жыллё рабочых г. Мінска ў даваенны перыяд (1917—1941 гг.) // Весці Акадэміі навук Беларускай СССР. Серыя грамадскіх навук. 1974. № 1. С. 104—112.
9. *Садовский Е.* Полеты С.Уточкина в Минске // Советская Белоруссия. 1941. 11 января.
10. *Сает М.* Провиантская, улица детства // Вираж. 1993. № 4. С. 28.
11. Трехвагонный трамвай // Рабочий. 1937. 16 апреля.
12. Тры карчмы // Мінская праўда. 1977. 24 снежня.

## ФОТАЗДЫМКІ ЗАПАЗЫЧАНЫ З НАСТУПНЫХ СХОВІШЧАЎ І ЗБОРАЎ

**Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь**
№№ 5, 17, 19, 21, 28, 53, 58, 61, 62, 64, 82, 83, 86, 88, 92, 95, 98, 102, 110, 111, 112, 113, 116, 144, 148, 152, 159, 161, 162, 163, 164, 165, 172, 180, 181, 182, 183, 184, 185, 190, 191, 192, 197, 202, 204, 206, 207, 213, 215, 216, 217, 218, 219, 221, 225, 227, 229, 230, 231, 232, 233, 234, 235, 236, 237, 241.

**Беларускі дзяржаўны архіў кінафотафонадакументаў**
1. Фотаздымкі — №№ 7, 9, 13, 24, 30, 31, 34, 37, 39, 43, 52, 60, 63, 69, 72, 74, 75, 76, 77, 80, 90, 107, 114, 119, 120, 121, 125, 128, 130, 131, 132, 133, 134, 143, 146, 149, 156, 157, 166, 188, 198, 201, 203, 223.
2. З кінахронікі Мінска 1920—1930-х гг. — №№ 2, 18, 20, 29, 44, 45, 46, 47, 48, 50, 51, 54, 73, 85, 87, 124, 126, 140, 171, 173, 175, 177, 179, 205, 208, 211, 214, 228, 239.

**Беларускі дзяржаўны архіў навукова-тэхнічнай дакументацыі**
№№ 1, 10, 14, 15, 16, 22, 26, 32, 35, 40, 41, 65, 78, 79, 93, 106, 108, 123, 127, 137, 147, 151, 158, 160, 167, 238.

**Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва**
№№ 84, 122, 135, 136, 170, 174, 194, 199, 200.

**Нацыянальны музей гісторыі і культуры Беларусі**
№№ 3, 6, 11, 12, 36, 38, 42, 55, 57, 59, 67, 71, 91, 94, 96, 97, 99, 100, 104, 115, 118, 129, 138, 145, 153, 155, 176, 178, 186, 187, 189, 192, 195, 196, 212, 220, 222, 224, 226, 240, 242, 246.

**Фотаздымкі з прыватных збораў**
1. Збор В.І.Каляды.
№№ 4, 8, 23, 25, 27, 49, 56, 68, 70, 81, 109, 117, 139, 141, 142, 150, 154, 168, 169, 209, 210.
2. Збор Т.Л.Хадынскай.
№ 243.

**Часопіс «Чырвоная Беларусь»**
№№ 33, 66, 89, 101, 103, 105, 244, 245.

# ЗМЕСТ

УСТУП

5

ВАЕННА-ТАПАГРАФІЧНАЯ КАРТА (ФРАГМЕНТЫ) ГОРАДА МІНСКА І НАВАКОЛЛЯ

21

МІНСК НА ФОТАЗДЫМКАХ 1920—1940 ГАДОЎ

29

СПАДАРОЖНІК ПА МЕНСКУ

209

ЛІТАРАТУРА

237

**Мінск незнаёмы**
**1920–1940**

Аўтар-укладальнік *Куркоў Ільля Мікалаевіч*

Мінск, выдавецтва "Ураджай"
На беларускай і англійскай мовах

Рэдактар *Ю. А. Паўлюкевіч*
Пераклад на англійскую мову *В. А. Сардаравай*
Рэдактар замежнага тэксту *С.В.Трафімук*
Мастак *Ю. А. Тарэеў*
Мастацкі рэдактар *А. М. Хількевіч*
Макет і камп'ютэрная вёрстка *Л. С. Шафрановіч*
Тэхнічны рэдактар *В. А. Віценка*
Карэктар *Ю. А. Паўлюкевіч*
Камп'ютэрны набор *А. У. Гурыновіч*

Здадзена ў набор 15.03.2002. Падпісана да друку 06.06.2002. Фармат 84 x108 $^1/_{16}$. Папера афсетная. Гарнітура Грамонд. Афсетны друк. Ум.друк.арк.25,2. Ул.-выд.арк. 20,23. Тыраж 2000 экз. Заказ 441.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Выдавецтва "Ураджай"» Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 8 ад 16.08.2000 г.
220048, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства «Мінская фабрыка каляровага друку». 220024, Мінск, Каржанеўскага, 20.

# МІНСК
## НЕЗНАЁМЫ

Не аднойчы мянялася аблічча Мінска за яго амаль тысячагадовую гісторыю. Хто сёння ведае, якім тут было жыццё ў часы бітвы на Нямізе ці ў сярэднявеччы? Але ёсць таямніца і зусім побач – горад 1920–1930-х гадоў. Усяго за два дзесяцігоддзі, паміж Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнамі, у старыя "губернскія мехі" да краёў уліліі новае "сталічнае віно". Мінск стаў іншым.

На жаль, сталіца не паспела распасцерці крылы. У чэрвені 1941 года бомбавы шквал змёў унікальны ў сваёй самабытнасці горад. Большасць з сённяшніх мінчан ніколі яго не бачылі. Шмат дзесяцігоддзяў не ступала нага чалавека на тыя вуліцы.
Час надышоў. Рушым, калі ласка, у падарожжа.



Мінск "Ураджай" 2002